Толькі перамога войскаў хана Ядыгея пры Ворсклі і параза Вітаўта вярнулі Смаленску князя Юр'я. Але ня годзіцца з гэтым слаўны Вітаўт і колькі разоў спрабуе зноў здабыць Смаленск. Урэшце, скарыстаўшы ад'езд Юр'я ў Маскву, Вітаўт аблажыў горад і той змушаны быў здацца.

Гэтак старадаўны крывіцкі Смаленск ад 24 чэрвеня 1404 г. стаўся складовай часткаю непадзельнага цэлага — Вялікага Беларускага княства.

Разам з вывадам маскоўскіх элементаў беларускія валадары пачалі даваць жыхарам Смаленску вялікія палёгкі, асабліва ў гандлі. Нездарма за беларускі часоў Смаленск надта вырас як горад. Было збудавана шмат новых цэркваў, будынкаў, паўстала шмат новых школаў. Рэлігійная лёяльнасьць і талерантнасьць у Беларускай Дзяржаве спрыяла развою асьветы. Гэты пэрыяд асабліва прычыніўся да эканамічнага ўздыму гораду. Гэта быў век росьцвіту смаленскага гандлю. Гандляваць, апрача княжнага места, пачаў сам горад. Цэлыя шэраг палёгкаў гандляром прывабіў багата купцоў з Полацку, Віцебску, Рагабужу, з-за мяжы, з Ноўгараду, Разані, Цьверы, Масквы і г.д.

З нястрыманаю хутчынёю расьлі гандлёвыя шэрагі. На месцы пустоў паўставалі новыя гандлёвыя пункты, рынкі, крамы, склады. Вакол ася

розны люд і забудоўваў горад. На Дняпры пры Траецкім манастыры паўстаў адмысловы гандлёвы «Літоўскі гасьцінны двор», дзе складваліся вялізарныя скарбы тавараў. Ува ўсходняй частцы гораду, каля новазбудаванага Духавага манастыра, паўстаў яшчэ адзін гандлёвы асяродак.

Расло і багацела жыхарства Смаленшчыны і разам з гэтым давала шмат дзяржаўных дзеячоў з свайго асяродзьдзя. Гэткім слаўным дзяржаўным мужам, выдатным беларускім дзеячом XVI ст. — ваеннікам, юрыстым, дыпламатам, літаратарам і філёзафам з вылучна светлай галавой, быў рэдактар і выдавец ведамага Беларускага г.зв. Літоўскага Статуту — Лявон Сапега, які паходзіць з Смаленскіх баяраў.

VI. Паход Масквы на Смаленшчыну

Красаваньне Смаленску ў Беларускім гаспадарсьцве было бяльмом на воку Масквы. Ніколі ня спыняла яна сваіх інтрыгаў супраць беларускага Смаленску. Пры Жыгімонтавым намесьніку, князю Андрэю Саковічу, Масква дамаглася бунту, які быў скіраваны супраць князя. Намесьнік змушаны быў уцячы, а на пасад узыйшоў мсьціслаўскі князь Юры. Гэты адразу пачаў далучаць да сябе Віцебск, Полацак. Але варта было наблізіцца беларускаму войску, як ён адразу-ж даў ходу ў Маскву. У Смаленску ўзнавілася беларуская ўлада.

Але Масква ўмацоўваецца і ўсё больш ды больш заяўляе свае ўяўныя правы на Смаленск, як быццам бы «вотчину» прашчураў маскоўскіх князёў ад Валадзімера Сьвятога з часоў Кіеўшчыны. Фальсыфікуючы гісторыю Беларусі, разглядаючы яе як калішнюю «Русь», Масква пачынае лятуцець аб «адзінсьцтве Русі» пад маскоўскаю ўладою. Асабліва ўзмацніліся гэтыя прэтэнзіі на Смаленшчыну за князем Васілем III.

Таму беларусы змушаныя былі ўмацоўваць Смаленск. У даўны земляны горад пераводзяць рэзыдэнцыю намесьніка, пакінуўшы старое «княжае места». Прымітыўныя з сяньняшняга гледзішча земляныя і драўляныя ўмацаваньні з вежамі зрабіліся для гэных часоў досыць моцнымі перашкодамі для ворага. Васіль III колькі разоў штурмаваў Смаленск. У снежні 1512 г. і ў верасьні 1513 г. маскоўцы ня здолелі здабыць гораду. Беларусы разбуралі ўсе іхныя ночныя падрыхтовы. Толькі ў 1514 г., калі маскоўцы падвезлі 300 гарматаў і пачалі бязупынна абстрэльваць горад, які пачаў гарэць, Смаленск быў змушаны 1 жніўня скарыцца. Войска Васіля III пайшло далей на Беларусь, але было спаткана каля Оршы, і тут маскоўцаў ушчэнт разбіла харобрае беларускае войска гэтмана Канстантына Астроскага. Маскоўскае войска мела 80.000, а беларускае 35.000.

Памяць аб гэтай славутай перамозе захавалася на даўгія вякі ў нашым народзе, які ў сваёй песні гэтак апявае бой пад Воршай:

«Ой, у нядзельку параненька,
Узыйшло сонца хмарненька,
Узыйшло сонца над борам,
Па-над Сялецкім таборам.
А ў таборы трубы йграюць,
Да ваяцкае парады зазываюць,

Сталі рады адбываці,
Адкуль Воршу здабываці:
А ці з поля, а ці з лесу,
А ці з рэчкі невялічкі?
А ні з поля, а ні з лесу,
Толькі з рэчкі невялічкі.
А ў нядзельку параненьку
Сталі хлопцы-пяцігорцы,
Каля рэчкі на прыгорцы:
Гучаць разам з самапалаў,
З сяміпалых ад запалаў,
Б'юць паўсоткаю з гарматаў.
Масква стала наракаці,
Места Воршу пакідаці;
А як з Воршы уцякалі,
Рэчку невялічку пракліналі:
«Бадай ты, рэчка, сто лет высыхала,
Як нашая слава тутака прапала;
Бадай высыхала да сканчэньня сьвету
Што нашай славанькі ўжо нету.
Слава Воршы ўжо ня горша.
Слаўся, пан Астроскі».

У адзнаку гэтае перамогі гэтман Астроскі пабудаваў у Вільні Мікалаеўскую і Свята-Траецкую царкву і в апошняй умураваў мармаравую пліту з надпісам:

«В лето 1514 церковь сю созда князь Константин Острожскій, гетман в. кн. Литовского, в память победы под Оршею над врагом и супостатом веры христіянское, православное, царем Московским».

Замілаванне беларускага жыхарства да сваіх павадыроў і радасць пазбаўленьня ад маскоўскае небяспекі выявілася ў песьні віленчанаў, якія ў часе звароту в. кн. Жыгімонта Казімеравіча і князя Астроскага спатыкалі іх краскамі і песняю:

Великославному гаспадару королю
Жигимонту Казимировичу
Буди чэсть и слава на веки —
Победившему недруга своего великого
Князя Василия Московского.
А гетману его вдатному князю
Константину Ивановичу Острожскому
Дай, Боже, здорове и щасте вперед лепшое:
Як ныне побил силу великую московскую
Абы побивал стлиную рать татарскую,
Проливаючы кровь их бессурманскую».

Супрасльскі і Кароткі Кіеўскі летапіс

Праўда, хоць і харобра змагалася войска Канстантына Астроскага, але здабыць Смаленск тады не ўдалося. Маскоўскі намесьнік, князь Шуйскі папера-

вешваў усіх змоўшчыкаў супроць Масквы і ўтрымаў Смаленск. Пасьля гэтага ўсе непажаданыя Маскве беларускія дзеячы былі высланыя з Смаленску, а заміж іх панасылаўся маскоўскі элемент.

VII. Беларусь адваёўвае Смаленшчыну

Беларусь не гадзілася з адыходам Смаленску да чужое дзяржавы. Беларускія князі неаднокраць рабілі спробы адваяваць горад (у 1535, 1564, 1579 г.г.). Таму маскоўцы пачалі як мага ўмацоўваць Смаленск, мабыць, няпэўна адчуваючы сябе ў гэтым беларускім горадзе. Гандлёвы цэнтар яны перанеслі ў прыгарад перад замкам за Дняпром, што пазней называўся «Гарадзенскаю сотняю». Задуманая яшчэ за царом Фёдарам Іванавічам каменная сьцяна вакол гораду была збудаваная за Барысам Гадуновым пад наглядам гарадзкога майстра Хведара Коня.

Але дарма, што Смаленск разбудаваўся ў моцную няпрыступную цвярдыню, аднак і ён ня вытрымаў доўгае аблогі ў 1610–1611 г. 31 верасьня 1610 г. смаленскія сцены пабачылі перад сабою вялікае войска Жыгімонта III, які прывёў яго з намерам выкарыстаць маскоўскую «смуту» і звярнуць Смаленск Літве. Адбыліся жорсткія баі. Горад бязупынна абстрэльваўся з гарматаў, пачаліся пажары, аднак, крывавыя баі трывалі далей, бо войска ў Смаленску давала хоць і безнадзейны, але адчайны супраціў. Толькі праз 10 месяцаў пры цяжкай упорыстай аблозе Смаленск быў здабыты. Гэта было 3-га ліпеня 1611 г.

Гэтак, бадай, праз стагодзьдзе Смаленск быў вызвалены з-пад маскоўскага паняволеньня. Заміж маскоўскіх парадкаў у Смаленску пачалі тэрмінова ўводзіцца новыя заходня-эўрапейскія парадкі. Горад адразу атрымаў магдэбурскае права і пачаў змяняцца на эўрапейскі лад. Гэтым самым Смаленск зноў далучыўся да Эўропы.

Але, на вялікі жаль, на гэты раз Літва ўжо пераставала быць незалежным задзіночаным Беларускім гаспадарствам. Вунія ліквідавала адзнакі незалежнасьці, пачаўся наступ польшчызны, апалячваньне праз каталіцызм і вуніяцтва беларускага магнацтва, гвалтоўнае ператварэньне праваслаўных беларусаў на католікаў і уніятаў, а праз гэта далей і на палякаў. Адвечна-праваслаўны беларускі Смаленск пачаў, наўсуперак волі жыхарства, забудоўвацца каталіцкімі касьцёламі, езуіцкімі кляштарамі, дамініканскімі і базыліянскамі школамі, а праваслаўныя цэрквы ператвараліся гвалтоўна на вуніяцкія. На Саборнай гары збудавалі катэдральны касьцёл і рэзыдэнцыю біскупа Смаленскай епархіі.

Ад былое свабоды веравызнаньняў і роўнасьці ў правох ў Смаленску за часамі незалежнага Беларускага Княства, цяпер засталіся адны толькі ўспаміны. Але ж паўставала шмат праваслаўных брацтваў, якія змагаліся за захаваньне беларускіх народных прынцыпаў, адчынялі беларускія школы, баранілі праваслаўныя цэрквы ад наступу каталіцтва і езуіцтва.

Няправільная, палёнафільская палітыка кіраўнічых колаў рабіла тое, што смаленскае жыхарства, ня бачачы ратунку, пачало схіляць свае надзеі да праваслаўнае Масквы. А тэй толькі гэтага трэ' было, бо гэта стварыла юрыдычнае

апраўданьне для ейнай агрэсіі на Захад, давала «падставы» матываваць яе канечнасьцяй далучыць да сябе «единокровных, единоверных братоў».

Усё гэта паслабляла сілы супраціву маскоўскай экспансіі. Аднак, ня лёгка ўдалося Маскве адарваць Смаленск ад Беларусі.

У 1612 г. цар Міхал Раманаў паслаў з гэтаю мэтаю войска на чале з князем Чаркаскім. Той здабыў колькі беларускіх гарадоў, але Смаленску заваяваць ня здолеў. Ды Масква на гэтым ня спынілася. За колькі часу яна пачала вялікія вайсковыя падрыхтовы, купляла зброю ў Швэдыі, вырабляла гарматы, рыхтавала дапаможнае войска пад кіраўніцтвам замежных афіцэраў.

За 9 гадоў пасьля пачатку гэтае падрыхтовы, у 1632 г., скарыстаўшы бескаралеўе ў Польшчы, маскоўскае войска пад кіраўніцтвам ужо ведамага ў Смаленску маскоўскага стаўленьніка Шэіна аблажыла Смаленск і пачало яго абстрэльваць з 158 гарматаў. Але на дапамогу літоўскаму войску прыйшоў гэтман Радзівіл з Вільні з войскам і адбіў наступ маскоўцаў. Апошнія змушаныя былі ад наступу перайсці да абароны ў вакопах, а пасля зусім адыйсьці назад паводля зробленае ўмовы. Так гэтым разам ганебна для Масквы скончыліся ейныя намаганьні адарваць Смаленск ад Беларусь.

І толькі за царом Аляксеем Міхайлавічам, ужо ў часе Лівонскае вайны, колькімі штурмамі маскоўцы здабылі Смаленск (23. VI. 1654 г.).

VIII. Смаленшчына ў маскоўскіх аковах

Пасля заняцця Смаленску маскоўцы зараз-жа ўзяліся за ліквідацыю ў горадзе магдэбургскага права, заходня-эўрапейскіх парадкаў і пачалі ўводзіць «россійскйе уложения». Адно толькі засталося на радасьць народу — гэта зварот праваслаўным беларусам усіх цэркваў, што былі раней ператвораныя на уніяцкія і каталіцкія. Але і тут царква неўзабаве пачала служыць русыфікатарскім тэндэнцыям маскоўскае палітыкі.

Гандаль і прамысловасць зноў перайшлі ў прыгарад, куды былі высланыя і ўсе гандлёвыя людзі, бо горад-цвярдыня зноў пачаў інтэнсыўна ўмацоўвацца. Тут размяшчаліся вялікія аддзелы маскоўскага войска.

У часе Лівонскае вайны, як і ўсе беларускія гарады, Смаленск асабліва пацярпеў, шмат гістарычных і культурных помнікаў згінула ў полымі, або пад руінамі.

Паводля Андрусаўскае ўмовы 1667 году Смаленск ужо надоўга быў далучаны да Масквы і каля трох стагодзьдзяў церпіць маскоўскую нядолю.

Ад часу далучэння да Расеі Смаленск згубіў сваё стратэгічнае значэньне. Толькі за часоў Петры Вялікага Смаленск зноў умацоўваецца. Рыхтуючыся да вайны з швэдамі, Петра будуе ў 1706 г. на правым беразе Дняпра Кронвэрк, каб засланіць ім мост, збудаваны пад вежамі, і парахоўніцы. Але швэдзкі кароль Караль XII абыйшоў Смаленск, і бойкі адбыліся каля Палтавы на Украіне.

Вялізарныя разбурэнні зрабіла Смаленску Напалеонаўская армія ў 1812 г. 6 жніўня Наполеон падыйшоў з сваёй арміяй да гораду і, спаткаўшыся з надта моцным супрацівам расейцаў, пачаў абстрэльваць яго з гаўбіцаў выбуховымі гарматнымі набоямі ды запаліў горад з колькіх бакоў. Згарэла шмат выдатных гістарычных будынкаў і помнікаў.

2-га лістапада, пакідаючы горад, Напалеон спаліў ладную частку яго і ўзарваў 9 вежаў славутае смаленскай сьцяны. Згарэла 45 каменных і 7568 драўляных будынкаў; 69 каменных і 248 драўляных крамаў. Страты дасягнулі 600.000 рублёў — сума для гэных часоў надта вялікая. Нездарма 1812 г. увайшоў у гісторыю Смаленску як год разбурэнняў. Пасля гэтага Смаленск яшчэ больш згубіў сваё былое стратэгічнае і гандлёвае значэньне.

Шмат гадоў пасля гэтага па ўсім Смаленску былі відаць папялішчы і руіны. Пад таўстымі, нанесенымі ў вякох, напластаваньнямі застыла багатая мінуўшчына гэтага гістарычнага беларускага гораду.

Варта адхіліць заслону часу, зазірнуць у глыб стагодзьдзяў, як зроку паўстане абраз таго, што жыў тут беларускі народ, тварыў сваю самастойнасьць, крывёю бараніў сваю дзяржаўнасць, ствараў багатыя матар'яльныя вартасці і культурныя помнікі свайго існаваньня і дзейнасьці. Пад гэтымі пластамі глыбака ляжаць сляды былое славы і магутнасці.

Шмат гавораць беларускаму сэрцу гэтыя помнікі былое велічы, а таму, як кажа Ластоўскі, яны павінны быць для нас сьвятымі, і мы павінны бачыць у іх сьветчаннье «забітай волі крывічоў», а дату далучэння Смаленску да Масквы — каля трох стагодздзяў таму падпісаную Андрусаўскую згоду — павінны разглядаць як вялікшае злачынства, роўнае Вэрсальскаму трактату і ганебнай Рыскай умове, што пазьней разадрала цела нашае Бацькаўшчыны на дзве палавіны і аддала іх нашым ворагам.

Смаленскіх сьцен масыў патужны
ў бязсільлі распластаўся,
Забітай волі Крывічоў
мне ён нагробкам здаўся!...
Андрусаўскі злачын яго ўчыніў
сатрапіяй Маскоўскай:
і дзьвесьці зь лішнім год, цягаючы ярмо,
яго раджайны гоні
кармілі чужакоў і ворагаў пладзілі
Крывіцкае Пагоні.
Аж дзьвесьці цяжкіх год каханьня
сьлязьмі і потам абліваўся...
Смаленск!
Праз мукі, горасьці свае,
у рэшце-рэшт,
Сьвятым для нас ты стаўся!

В. Ластоўскі «На Смаленскіх сьценах»

IX. Выдатныя смаленцы — сыны беларускага народнага гэнія

Дарма, што былая веліч народнага духу пахаваная ў гісторыі Смаленску, але народ выяўляў сваю сілу і творчы дух у тым, што час ад часу даваў выдатных людзей, якія множылі дасягненьні навукаў і мастацтваў.

Смаленскія беларусы далі нямала выдатных вучоных, музыкаў, пісьменнікаў, мастакоў. Назавём тут выдатнага беларуса, ураджэнца Смаленшчыны,

прафесара Васіля Дакучаева (1846–1903) — заснавальніка навейшага кірунку навукі глебаведы, якую пасля сыстэматызаваў ягоны вучань прафесар Сібірцаў.

Нельга абмінуць і другога выдатнага беларуса (навет з сьведамасці, бо гэтак і называў ён сябе), сусьветна-ведамага дасьледніка Цэнтральнай Азіі, гэнерала Міколу Пржэвальскага (1839–1888), які паходзіць з Парыцкага павету і ўзгадаваўся ў Смаленску, а таксама ўдзельніка экспэдыцыяў Пржэвальскага, Пятра Казлова (1863–1935), вучонага-геаграфа, археялёга і этнографа з гораду Духаўшчына Смаленскай губерні.

Урэшце, з смаленскіх беларусаў паходзіць і сусветна-ведамы кампазытар Міхал Глінка (1804–1857), творца опэраў «Іван Сусанін» і «Руслан і Людміла». Кампазытар Глінка нарадзіўся у беларускай вёсцы Новапаская, Ельніцкага павету. Там ён узгадаваўся, а пазней доўга жыў наездамі. Ад маленства ён чуў там беларускую народную песню і на ёй гадаваў сваё вуха. Першую музычную асьвету Глінка атрымаў пад уплывам канцэртаў аркестры свайго дзядзькі, які прыяжджаў да ягонага бацькі ў госьці разам са сваімі прыгоннымі музыкамі з суседняга двара. Гэтыя музыкі-беларусы ахварбоўвалі ўсімі асаблівасьцямі беларускае народнае музыкі выкананьне якога-хаця музычнага нумару і, апрача гэтага, самі спявалі шмат беларускіх песняў і гралі на розных народных музычных інструмэнтах.

Усё гэта ўразіла маладога Глінку і глыбока запала ў ягоную музычную душу, адклаўшы назаўсёды ў ёй сьлед замілаванасьці да мэлёдычнасьці беларускае народнае песьні. Пасьля, творачы выдатныя музычныя творы, Глінка поўнымі жменямі чэрпаў з гэтае скарбніцы. Музыка опэры «Іван Сусанін» цалком прасякнутая беларускімі народнымі матывамі, якія сусветнай музычнай крытыкаю памылкова прымаліся за злітак польскіх і расейскіх музычных народных матываў.

Толькі тое, што на карце Эўропы не было беларускае палітычнай адзінкі, прычыпілася да гэткага рабунку беларускае культуры, як адабраньне ад беларускага народу ягоных лепшых сыноў.

Скрозь распаўсюджванае і афіцыйна падтрымліванае ўрадавымі расейскімі коламі атоесамліванне праваслаўнага веравызнання з належнасьцю да «расейскага народу», пераслед усяго беларускага, паўсюднае панаваньне расейскае мовы ва ўсіх асветна-культурных і адміністрацыйных установах, культываваньне расейскага нацыяналізму і палітыка расейскае асыміляцыі беларусаў зрабілі тое, што Глінка гэтак сама, як пазней і беларус, паводле продкаў, Тодар Дастаеўскі, стварылі шмат славы расейскаму народу. Таксама, як блытаніна паміж каталіцтвам і польскаю народнасьцю, ды нястача агульнага вызнаньня беларускае мовы як літаратурнае, штурхнулі другога выдатнага сына беларускага народу — Адама Міцкевіча, сына наваградзкага беларускага шляхціча, у абдымкі польскае мовы, у якой ён стварыў свае паэтычныя пэрлы.

Але, як правільна гаворыцца ў артыкуле Вацлава Ластоўскага «Тодар Дастаеўскі і Адам Міцкевіч, сыны крывіцкага народнага генія» (у часапісе «Крывіч» № 10 за 1926 г.), усе яны былі «цела ад цела і кроў ад крыві» беларускага народу і павінны, хай і ўскосна, складаць славу беларускаму нацыянальнаму генію. Калі б гэтыя людзі жылі ў вадроджанай беларускай дзяржаве з пана-

ваньнем беларускае культуры і дзяржаўнай беларускай мовай, бяз сумлеву яны тварылі-б у роднай мове і музыцы і здабылі-б незраўнанай у вякох славы беспасярэдня свайму народу. І тады-б увесь свет зусім заслужана ўважаў бы Глінку за заснавальніка не расейскае, а беларускае нацыянальнае клясычнае музыкі і опэры, і ён быў-бы беспасярэдня нашым гонарам.

Але і без таго Смаленск з поўным правам мае ўсе падставы ганарыцца сваім слаўным сынам — кампазытарам Глінкам, якому ўдзячны горад яшчэ ў мінулым стагодздзі паставіў помнік. Ён уяўляе сабою постаць кампазітара з дырыгэнцкай палачкай у руцэ. На п'едэстале надпіс і дата (1885 г.), а па бакох у вянку — назовы галоўных твораў. Вакол — агарожа ў выглядзе нотаў. Помнік павінен нам нагадваць пра вялікія творчыя чыны беларускіх сыноў і натхняць на новую творчасьць, і духовую і матар'яльную. Да гэтага ж кліча і ўся багатая чынамі мінуўшчына беларускага Смаленску.

X. Ні змус, ні гвалт ня вынішчылі беларускасьці Смаленшчыны

Усе вучоныя, нават расейскай арыентацыі, заўсёды ў навуковых працах сцвярджалі належнасьць Смаленшчыны да Беларуси Варта прыгадаць працы ведамых вучоных Адама Кіркора, Сяргея Максімава і Пятра Сямёнава, Мітрафана Даўнар-Запольскага, Уладзіміра Дабравольскага, Еўдакіма Раманава, этнаграфічныя мапы Ахматава, Яўхіма Карскага, Мікалая Азбукіна, Аркадзя Смоліча і А. Пікуліка, працы шмат якіх нямецкіх вучоных, каб пераканацца ў гэтым.

Паводля ўсіх этнаграфічных адзнакаў, як мова, культура, характар, заняткі жыхарства, фізычны тып, вопратка і г.д. смаляне зьяуляюцца карэннымі беларусамі.

Дый не магло быць інакш, бо сама прырода як-бы вылучыла ўсю Беларусь разам з Смаленшчынай у адну геаграфічна-эканамічную і этнаграфічную асобнасць.

Вялікі эўрапейскі вададзел, што праходзіць праз усю ўсходнюю Смаленшчыну, ды вялікія лясы на поўначы і ўсходзе гэтае краіны (Вокаўскі, Бранскі) уяўляюць сабою як-бы натуральныя межы. Усходняя мяжа Беларусі на Волскім вададзеле супадае з кліматычнаю мяжою Вокаўскага лесу і выразна аддзяляе Беларусь з ейным памяркоўным вогкім пад уплывам мора кліматам ад больш кантынэнтальнага і рэзкага клімату Маскоўшчыны.

Гэтыя натуральныя межы супадаюць і з гістарычнымі межамі калішняй Беларускай Дзяржавы, Вялікага Княства Літоўскага, паводля, скажам, Дэўлінскага замірэння ў 1618 г. дый ранейшых умоваў.

На паўдня і ўсход ад гэтых межаў жывуць беларусы, якія, паводля расавага і этнаграфічнага адзінства, стварылі тую народную асобнасьць, неаддганай часткаю якое зьяўляюцца і беларусы смаленскія. Як усім беларусам, ім свомыя перш-на-перш тыя-ж самыя асаблівасьці мовы, як пераход «в» і «л» у «ў»; дзеканьне (не здарма і пра смаленцаў кажуць: «Хіба ліха возьме ліцьвіна, каб ён ня дзекнуў»), цеканьне і аканьне, прыдыхное расейскага гуказлучэньня «жж»

беларускім «ждж», зьмякчэньне зычных перад мягкімі гукамі ды навет цьвярдое «р».

Дарма, што Смаленшчына знаходзілася пад Расеяй больш, чымся якая іншая мясціна Беларусі (агулам бяручы 350 гадоў!) і страшэнна русыфікуецца яшчэ больш сяньня, аднак народ і тут захаваў галоўныя асаблівасці свае мовы. Тут варта прыгадаць і надрукаваныя ў часе вайны ў беларускай прэсе зацемкі, што да беларускіх усходніх прастораў («Раніца» № 43 /107/, за 15 лістапада 1942 г.).

Для высвятленьня стану беларушчыны ў Браншчыне і Смаленшчыне там знойдзем каштоўныя факты, якія падаў беларускі дзеяч, якому давялося ў 1941 г. колькі часу працаваць ва ўсходняй Беларусі. Паводля ягоных сцверджаньняў, найбольш зрусыфікаваныя гарады, але на сяле добра выявілася жывучасць беларускае мовы з усімі ейнымі асаблівасьцямі, прычым, лепш на паўдні як на поўначы:

> «Браншчына ўся аж пад Арол захавала вельмі добра беларускую мову. Тут спатыкаюцца ўсе ейныя асаблівасьці... У Смаленшчыне — беларушчына так жа добра захавалася, хоць і не ўва ўсіх паветах (ува ўсходніх горш, як у заходніх). Цікава, што і самы Смаленск з моўнага гледзішча ня выглядае надта страшна. Людзі гавораць тут з паважна захаванымі асаблівасцямі беларускае мовы. Асабліва востра ўтрымалася аканьне і дзеканьне. Далей на поўнач беларушчына захавалася адносна добра аж да г. Белага. Гэта падцвердзіў нават адзін прафесар-смаленец, які добра ведае гэныя абшары».

Цікава, што і ў самай найноўшай літаратуры аб Смаленшчыне ёсьць багата фактаў, што сьцвярджаюць належнасьць яе да беларускага этнаграфічнага абшару.

Гэтак, прыкладам, прафэсар П. Чэрных да свае працы «Историческая грамматика русского языка» (изд. 2-е, Учпедгиз, Москва, 1954 г.) дадаў Дыялектычную Мапу ўсходняславянскіх моваў. Паводля гэтае мапы, уся Смаленшчына і Браншчына аднесеныя да тэрыторыяў беларускае мовы.

Вельмі вымоўнае сьведчаньне беларускасьці Смаленшчыны мы маем і ў найноўшай працы ведамага нястомнага навукоўца ў галіне гістарычнай дыялекталёгіі ўсходня-славянскіх моваў, вучня і паслядоўніка акадэміка А. Шахматава — прафесара Паўла Растаргуева (1881–1959). Яшчэ ў 1927 г. П. Растаргуеў выдаў каштоўную для навукі працу «Северско-белорусский говор», за якую ён тады атрымаў годнасць доктара філёлягічных навукаў.

У 1960 г. Акадэмія Навук СССР у Маскве пасмяротна выдала працу П. Растаргуева «Говоры на территории Смоленщины». Дэталёвае вывучэньне гаворак заходняй Смаленшчыны Растаргуеў асабіста праводзіў у 1929, 1930 і 1931 гг. Тады ён зрабіў багата запісаў і беспасярэдніх нагляданьняў. Асабістыя нагляданьні Растаргуеў падмацаваў адказамі на адмысловую «Анкету па гаворкам Смаленшчыны», якая была надрукаваная Навукова-дасьледчым інстытутам моваў у Маскве і разасланая аўтарам па школах Смаленшчыны ў ліку 510 паасобнікаў.

У дадатак Растаргуеў дэталёва прааналізаваў багатыя дыялектычныя матар'ялы і супаставіў іх з дадзенымі археялёгіі, гісторыі, гісторыі матар'яльнай

культуры, этнаграфіі. Выкарыстаў ён і «Смаленскі этнаграфічны зборнік» Ул. Дабравольскага, рукапісныя матар'ялы Акадэміі Навук СССР і Рускае геаграфічнае грамады, як і іншыя матар'ялы. Гістарычна-дыялекталагічнае даследванне прафесар Растаргуеў правёў навукова-лінгвістычным мэтадам. Ён з усяго вялізарнага матар'ялу выбраў адно тыя факты, якія былі дасканала задакументаваныя і мелі дакладны адрас асобы і мясцовасьці, дзе рабіліся запісы.

У гістарычнай частцы П. Растаргуеў азначыў Смаленшчыну як тэрыторыю, якую займалі смаленскія крывічы, і дыялектная мяжа якое праходзіць па моўнаму разьдзелу паміж беларускімі гаворкамі і сярэдня-вялікарускімі і паўднёва-вялікарускімі гаворкамі. Тут, на Смаленшчыне, пачынаўся гістарычны стык беларускае мовы з расейскай. Старыя гаворкі смаленскіх крывічоў зьявіліся падставаю для беларускае мовы Смаленшчыны. Заходняя Смаленшчьша і да сяння захоўвае беларускі характар свае мовы, хаця-ж шматгадовы ўплыў расейскае школы, адміністраванне ў расейскай мове, адсутнасць беларускай кнігі і вылучнае карыстаньне расейскай літаратурай, радыё і тэатр робяць сваю справу ў сэнсе паступовай страты самабытных моўных рысаў.

Прафесар Растаргуеў паказвае, як у выніку перасяленьняў і мяшаньня насельніцтва на тэрыторыі Смаленшчыны, удзелу ў грамадзкім і палітычным сучасным жыцці на вёсцы і працы шматлікіх смаленцаў на фабрыках у Ярцаве, — русыфікацыя здабывае сабе ўсё больш смаленцаў. Некаторыя выснавы Растаргуева наводзяць на пэсымістычныя думкі. Падкрэсліваючы працэс моўных зменаў, дасьледчык піша аб тэндэнцыях моўнага руху ў бок расейскае мовы:

> «Стан гэтых рысаў у гаворках Смаленшчыны гэткі, што можна гаварыць аб развіцці гаворак па шляху страты іхных карэнных беларускіх рысаў і замены іх расейскімі» (стар. 181).

Але сам аўтар пры гэтым адзначае адно тэндэнцыі працэса змены гаворак, але ён зусім не запярэчвае беларускую аснову іх, асабліва ў моўна-гістарычным плане. Гэтаму сведчаньнем зьяўляецца вялізарны і каштоўнейшы матар'ял, прыведзены Растаргуевым на старонках гэтае кнігі, што да фанэтыкі, марфалёгіі, лексікі і сынтаксіса мовы смаленцаў. Цэлы шэраг цікавых фактаў моўных назіраньняў і запісаў гэтак і пераліваюцца і зіхацяць жывою беларушчынай, прыкладам ілюстрацыі да разьдзелу аб вакалізьме, дыссымілятыўнага аканьня, вымовы галосных у першым складзе перад націскам, кансанантызма, асабліва наяўнасьць беларускага г, пераход білябіяльнага «w» у «ў» або «у», пераважаньне формаў мінулага часу дзеясловаў з канчаткам на «ў» заместа «л», дзеканьне і цэканьне.

Багата цікавых арыгінальных беларускіх словаў Растаргуеў прывёў у альфабэтным парадку нязьменных словаў і скланяльных і спрагальных формаў. У разьдзеле словаўтварэньня нельга абыйсці міма тыпова беларускіх суфіксаў ёнак — Іванёнак, Пятронак, прозвішчы ад уласных імёнаў — Сцяпанчыкаў, Сілаенкаў, Марыянкоў.

Стары смаленец М. Палашонкаў з вёскі Надва Катынскага павету на Смаленшчыне расказаў Растаргуеву, як у пачатку 40-х гадоў мінулага стагодзьдзя ён «прыстаў у прымні» і ажаніўся на гаспадаровай дачцы Ганне, прыняўшы прозвішча жонкі «Палашанька» ад імя Палаха — «Палаша». Вось жа мова гэ-

тага смаленца нагэтулькі чыста беларуская, што можа больш вымоўнага прыкладу беларускасьці мовы смаленцаў і не патрабуецца. Наўсуперак некаторым выснавам, увесь фактычны матар'ял кнігі прафесара Растаргуева «Говоры на территории Смоленщины» цалкам падцвярджае нашыя думкі і навукова-лінгвістычна падмуроўвае іх, стварае нашым выснавам неабвержаны фундамант.

Гэтак моцна народ трымаецца свае мовы нават там, дзе на зліквідаваньне яе было ўжыта безліч моцных сродкаў, як вылучна расейская школа, друк, тэатар, літаратура, прызнаньне за ўрадавую толькі расейскае мовы, гвалтоўная забарона ўсяго беларускага і пераслед тэрорам усялякае праявы беларушчыны.

Аднак-жа ні змус, ні гвалт канчальна ня вынішчылі беларускае душы смаленца, бо ейныя асаблівасьці маюць моцныя традыцыі ў мінуўшчыне.

Паходзячы ад асноўнага беларускага плямяні крывічоў і жывучы праз стагодзьдзі ў ваднэй дзяржаве з усімі беларусамі, смаленцы не маглі ня мець аднае з імі мовы. Смаленскі беларус, пераважна селянін, гэткі, як і ўсе беларусы. Падставай ягонага быцця зьяўляецца здаровая земляробская праца. І хоць прырода не дала смаленцу багатае глебы, аднак стараннасць і ўпорыстасць ягонае працы на малаўраджайных глебах можа зьдзівіць.

Смаленскі селянін шмат перапрабаваў за жыцьцё заняткаў, часам адыходзіў ад зямлі на заработкі, але далей за сваю смаленскую краіну, далей за Парэчча, за дняпроўскія ды дзвінскія прыстані ён не вандруе і ня возіць. Урэшце ўсё-ж такі ён вяртаецца на сваю няўдзячную зямлю і ўкладае ў яе ўсю сваю сталую любасць да працы, цярплівасьць, упорыстасць, усе высілкі, і пад ягонымі працавітымі рукамі камяністыя і пяшчаныя глебы ператвараюцца ў шырокія нівы.

Не заўсёды зямля бывае ўдзячнай гаспадару за гэтую працу, і тады міжвольна складае ён сумную песьню:

Няма хлеба, солі,
няма шчасьця, долі!
Поле пусьцеець,
І нечым сеяць.
Ня будзем жыці,
Пойдзем блудзіці.

Але гэта толькі выява ягонага мягкага пяшчотнага беларускага характару з ягоным нахілам да лятуценнасьці, багатага ўяўленьня і фантазіі. Не пойдзе ён у свет блудзіць, бо ведае, што не ласкаю стрэне яго чужынец.

Чужая старана
Тугою араная,
Сьлязьмі паліваная.

Смаленскі селянін мае на запас і прыказкі: «Паміраць зьбіраешся, а жыта сей». Вось жа і ня ідзе ён з свае зямлі, якая бачыла ў вякох тут ходанне шмат якіх сілаў. Сядзіць на ёй смаленец ужо шмат вякоў і ўратоўвае сябе ад асыміляцыі. З чыста беларускай асаблівасьцю даматурства трымаецца свайго палетку, свае мовы, і гэтым бароніцца ад страты свае нацыянальнасьці.

А пра свайго ўсходняга суседа мае добрае дазнаньне, што выпрацавалася ў вякох зяцятага ходаньня Беларусі з Масквою і выеўленае ў дасьціпных прыказках.

«Калі маскаль кажа суха, то падымайся да вуха: бо ён брэша».

«Ад чорта адхрысьцішся, а ад маскаля не адмолішся: ад маскаля полы падрэж ды ўцякай».

Гэтак выразна ўсьведамляе сваю адрознасць ад расейца смаленскі беларус і замацоўвас гэтае ўсьведамленьне ў вуснай народнай творчасьці. Ды ўжо гэтае адрозненьне найлепш робіць і сама мова смаленца, багатая агульна-беларускімі словамі, як андарак («і ў людзі і ў кабак — усё адзін андарак»), бажніца, бохан, бульба, кавалак, калдуны, калыска, камізэлька (замест расейскага «жилет»), катух, клёцкі, кравец, крупнік, крыніца, кубел, ладкі, магерка, намітка, панцак, пол (замест расейскага «полати»), страва, страха, сьвітка, хадакі ці чаравікі, хата, хустка, шавец, шкода (зам. рас. «беда»), шмалец і г.д.

Усе гэтыя словы, як не трэба лепш, сьведчаць пра лучнасьць смаленскага слоўнікавага складу з агульнабеларускім. Апрача таго, кажнае з іх зьяўляецца добрым паказьнікам беларускасьці ўсіх жыцьцёвых абставінаў смаленскага селяніна. Яны, нераўнуючы, ёсць тыя сымбалі, што хаваюць за сабой беларускі нацыянальны характар, усяго гэтага багацьця, у якім гэтымі словамі называюцца асобныя рэчы ці зьявы і комплекс якіх дае шырокі абраз іхнага нацыянальнага твару. Смаленскі акруговы слоўнік Дабравольскага дае дзеля гэтых выснаваў багаты матар'ял.

Аб беларускім складзе народнае мовы Смаленшчыны могуць добра сведчыць, прыкладам, гэткія, пададзеныя Максімавым, сказы вазьніцаў перад карчмою да шынкара:

— «Рандар, рандар!
Адчыні вароты: дай гарэлкі!
Ахці якая мяцеліца: саўсім перазяблі,
і коні чуць цягнуць,
і ноч цёмная, нічога ня відна,
і дарогу так замяло, што і найці ня можна.
Рандар, рандар,
адчыні вароты, налівай гарэлкі!»

Трэба вызнаць і немалы уклад Смаленшчыны ў найноўшае беларускае адраджэньне. Ведама, што смаленскія дэлегаты, удзельнікі Першага Ўсебеларускага Кангрэсу ў Менску ў сьнежні 1917 году найбольш пасьлядоўна абаранялі пагляды незалежнікаў, ня ў прыклад магілеўскім «абласьнікам». Смаленскія дэлегаты ўсьвядомлівалі сябе дзецьмі маці-Беларусі і найбольш адкрыта і рашуча дамагаліся дзяржаўнага самавызначэньня Беларусі на ўсіх ейных этнаграфічных абшарах.

Смаленшчына дала беларускай літаратуры такога выдатнага пісьменьніка, як Максім Гарэцкі (1893–1938), які ўзбагаціў беларускую літаратурную мову багацьцем моўнае адмены нашае ўсходняе поўначы.

У смаленскай вёсцы Калеснікі, Хіславіцкай воласці, нарадзіўся беларускі паэт Зьмітрок Астапенка (1910–1944), які таксама, як і Гарэцкі, унёс багата сма-

ленскіх арыгінальных словаў у беларускую паэзію. Уцякаючы ад саветаў праз Славаччыну, ахопленую паўстаннем у 1944 годзе, Астапенка загінуў з словамі звароту да любай Беларусі, словамі бязьмежнай любові да бацькаўшчыны, якой ён аддаў сваё кароткае, але творча плённае жыццё. Ягоная паэма «Эдэм» і шматлікія вершы цалкам спраўдзілі прадбачаньне Якуба Коласа, які ў 1928 годзе, будучы ў Мсціслаўлі ў Пэдагагічным Тэхнікуме, падараваў Змітраку Астапенку сваю кнігу з надпісам, у якім прадракаў будучыню вядомага паэты і тым акрыліў малады талент.

Вывучэньне моўных асаблівасьцяў Смаленшчыны можа быць асабліва плённым для збагачэньня беларускае мовы. Прыкладам, колькі прыгожасьці і самабытнае адмены хаваецца ў словах, запісаных на Смаленшчыне і прывезеных А. Адамовічам на адной з дыскусійных зборак у Нью-Ёрку («Конадні», 1955, № 3, бал. 94-95). Вось некаторыя з іх:

Утравець (зарасьці травою), асянець, абасянець (рабіцца надвор'ю, як увосень), раўніць (дзяліць на роўныя часткі), ірміцца, зайрміцца ў сэньсе загарэцца нейкім пачуцьцём, глыбіць (дамагацца), дымна (цяжкі настрой), работашна (шмат работы), вуздыхна, зямельна, улюбі (у каханьі), уцьверазі (у цьвярозасьці), час улягу, угадзіне (позьні час), удаліна (чужына).

Або гэткія сынонімы і антонімы:

Абкіраваць (арганізаваць справу), адкосак (водбліск), басавік (басяк), безум, бязумлівы, вомяга (атрута), вухарэз (галаварэз), выйма (міма), гарывы (гарысты), гулявы (гуляшчы), гульляваць, на гулянках (вольным часам), загада, закор (дакор), заняважыць (зьбянтэжыць), заўвеціць, заўвета (ветлая заўвага), касьнік (прамень), лёгкаабычны (лёгкадумны), мазны, мазьненькі (мізэрны), маладзьга (аб моладзі грэбліва), маравы (морскі), маранік (марак), накупіць (падкупіць), налажыць імя (даць імя), намахнуцца, наплавадзіць (навадніць), народліва, нізовы, нямінучая (нямінучасьць), падаваць (быць падобным), падаўтараць (паўтараць яшчэ раз), паднебесь (гарызонт), паклад (умова), пакласьці (умовіцца), пасылаваць (камандыраваць), паязда (экспэдыцыя), пераказваць (паўтараць у гаворцы), праказацца (праявіцца), працяглівы, прынародна, прыродак (прырода), пульга (завея), разумлівы, собства (уласнасьць), сплавадзіць (збыць), судлівіць (крытыкаваць), судлівы (крытычны), цанаваць (цаніць),), ціхім маньнем («ціхай сапай»), , чырк-у-чырк (акурат), шумархаваць, шумцець.

Спадар А. Адамовіч таксама прапанаваў колькі смаленскіх словаў на зьмену ўжываемым часта барбарызмам і жарганізмам (глядзіце там жа). Яны вартыя ўвагі ўсіх беларускіх моваведаў. Варта прывесці і іх:

намінаць, намінка (намякаць, намёк), перагосткі (абмен візытамі), адгосткі (паўторнае адведаньне), хаджане (праходжыя), увед (іспыт), спытка («пробка»), мульлё (пролежні), машурга (мішура), праграчыць (празяваць), брыжыковыя дзяўчаты («кисейные барышни»), здобіль («изобилие»), дасьпяшны (пасьпяховы), дасьпех (посьпех), посуд (судно), шугавы (ветраны чалавек), весьці за (уважаць за).

Агромністую колькасць самабытных словаў заключае ў сабе ведамы «Толковый словарь живого великорусского языка» Уладзімера Даля, у 4-х томах. Багата іх у вядомым слоўніку беларускае мовы Івана Насовіча. Значная частка гэтых словаў ўжываецца і ў іншых мясцовасьцях Беларусі і ўвайшла ў агульна літаратурную сучасную беларускую мову.

Уклад смаленцаў тут асабліва вялікі і заслугоўвае свайго вызнаньня і належнае ацэны, а таксама навуковага вывучэньня. На вялікі жаль, гэтае вывучэньне ў БССР вельмі запынілася дзеля ўлучэньня Смаленшчыны ў склад РСФСР. Таму беларускія мованаведы пры Інстытуце мовазнаўства Акадэміі Навук БССР у Менску змушаныя абмяжоўваць абсяг сваіх дасьледваньняў межамі сучаснае БССР. Праўда, у 20-х гадох Смаленшчьша вывучалася беларускімі навукоўцамі, і тады шмат было зроблена для яе вывучэння ў Інстытуце беларускае культуры, а на пачатку і ў Беларускай Акадэміі Навук у Менску.

А паслухайце народныя песьні Смаленшчыны. Гэта тыпова беларускія народныя песьні з тою ж самаю моўнаю і музычнаю асновою. Для прыкладу, вазьмеце жартоўную (у зборніку Дабравольскага, ч. IV):

Да сею-ж я (2)
У гародзе чарнушачку,
Пад гародам пятрушачку,
Да сею-ж я.
Да палю-жа я
У гародзе чарнушачку,
Пад гародам пятрушачку,
Да палю-жа я (2)
Да бяру-жа я (2)
У гародзе чарнушачку,
Пад гародам пятрушачку
Да бяру-жа я
Навару-жа я (2)
Да старому качана з бураком,
Маладому кісяля з малаком,
Навару-жа я. (2)
Пасьцялю-жа я (2)
Да старому на ўзапечкі,
Маладому да на покуце,
Пасьцялю-жа я (2)
Падлажу-жа я (2)
Што старому да дзяружачку,
Маладому да падушачку,
Падлажу-жа я. (2)
Прабуджу-жа я (2)
Што старога ды піхаючы,
Маладога абдымаючы,
Прабуджу-жа я. (2)
Праваджу-жа я (2)
Як старога із сабакамі,

Маладога із музыкамі,
Праваджу-жа я (2).

Цікава адзначыць той факт, што ў выданьне Беларускай Акадэміі Навук — «Песьні беларускага народу» том I, Менск, 1940 г., увайшло шмат беларускіх песьняў, запісаных на Смоленшчыне ведамымі этнографамі, як Дабравольскі з ягоным «Смоленским этнографическим сборником» ч. I (1891 г.), ч. II (1893 г.), ч. IV (1903 г.), як І. Насовіч, Е. Раманаў і іншыя.

У кнізе «Песьні беларускага народу», часта ўзорам песьні і прыводзіцца толькі песня Смаленшчыны. У тым жа выпадку, калі за ўзор даецца песьня з цэнтральнае Беларусі, дык у камэнтарах вельмі часта паказваецца на запісы тых самых песьняў або іхных варыянтаў у Смаленшчыне з паказаньнем літаратуры і бібліяграфічных дадзеных. Гэта гаворыць аб адзінсьцве беларускае народнае песні ад беларускае Горадзеншчыны да самых усходніх і паўночных абшараў Смаленшчыны. Адзін народ — адны і тыя ж у яго і песьні.

Смаленскі і бранскі селянін на кірмашы ды ў людзі, як і ўсе беларусы, выяжджалі ў белай магерцы і шэрай сьвітцы, а за клясычны народны інструмэнт у іх таксама — беларуская дуда — скураны круглы мяшок і прыткнутая да дзіркі дудка з пераборам для пальцаў, якая грае і тады, калі ў яе пакідаюць дзьмуць.

Смаленскі беларус, як і ўсе беларускія сяляне, на працягу гісторыі застаўся абыякавым да розных рэлігійныгх змаганьняў і не даваў із свайго асяродзьдзя духовых фанатыкаў, палоненых якой-небудзь рэлігійнаю догмаю.

Беларус заўсёды адзначаўся рэлігійным індыфэрэнтызмам і таму не паддаўся ўплывам розных рэлігійныіх сектаў, якіх так багата было ў ягонага ўсходняга суседа. Жыццё на воддалі ад гарадоў спрыяла захоўванню свае нацыянальнае самабытнасці ўва ўсім жыцьці.

Гэтую нацыянальную беларускую самабытнасць, як пераканальна сведчаць усе пададзеныя намі вышэй факты, нават смаленскі беларус захаваў аж дагэтуль, наўсуперак усім нягодам і перагасам лёсу, што найцяжэй з усіх беларускіх краёў выпалі на долю Смаленшчыны. І дарма, што цяпер Смаленшчына перажывае чужое панаванне. Ніякая пякельная сіла — мы ў гэта моцна верым — ня звярне яе з адвечнага радзімага беларускага шляху і, ступаючы ім, і гэтая нашая дарагая пакутніца раней ці пазней прыйдзе да таго поўнага задзіночаньня з усёй Вялікай Беларускай Бацькаўшчынай, да якога імкнецца вякамі.

І аб ёй таксама можа сказаць кажны з сьведамых сыноў гэтае Бацькаўшчыны словамі таго паэта, які калісьці з такім замілаваннем прапушчаў вачыма «прысады а блоні» яе:

Люблю я цябе, дарагая,
І веру: ня спынішся раптам,
Праз пушчы, бярэзьнікі, гаі
Да Менску заўсёды патрапіш!

БЕЛАРУСКІ ЎСХОД: НАША СМАЛЕНШЧЫНА

Юры Карэтнікаў

Асабіста для мяне пытаньне беларускай Смаленшчыны шчыльна зьвязана з маім родам па бацькоўскай лініі, родам Карэтнікавых. Мой дзед, Уладзімір Карэтнікаў, быў карэнным «смаляком», як сабе сам называў, і нарадзіўся ў вёсцы Дзянісаўка рослаўскага раёну смаленскае вобласьці.

Таму, гісторыя, культура, традыцыі й самавызначэньне беларускае Смаленшчыны, раней аднаго з чысьцейшых крывіцкіх рэгіёнаў, уласна для мяне й сёньня не губляе цікавасьці, а ў гістарычнай перспектыве й актуальнасьці.

Дарагія сябры аднадумцы й шаноўныя наведвальнікі нашага рэсурсу, гэтым артыкулам я буду рады адкрыць вам малавядомую старонку беларушчыны й пазнаёміць вас з гісторыяй і лёсам адной з прыгажэйшых частак нашае Бацькаўшчыны — Смаленшчынай. Бо каб быць паўнавартасным беларусам, кожны з нас мусіць ведаць і шанаваць багатую культуру й гісторыю нашага спрадвечна беларускага, смаленскага краю.

Гісторыя Смаленшчыны

А што там на беларускім Усходзе, чым гэтае места было для Беларусі й чым яно ёсьць для нас цяпер? Ці закрытае смаленскае пытаньне? І ўвогуле — ці дастаткова ўвагі мы надаем Смаленску, аглядаючыся на сваю гісторыю? У беларускае Сярэднявечча там жылі Клімент Смаляціч і Аўраамі Смаленскі. Менавіта ў тэксьце гандлёвай дамовы смаленскіх купцоў з Рыгай ад 1229 году навукоўцы ўпершыню фіксуюць лексычныя асаблівасьці беларускай мовы. Менавіта там у канцы XIV стагодзьдзя жыў Лука Смаленец, аўтар вядомага беларускага літаратурнага помніку «Смаленскі псалтыр». Менавіта ў Смаленску была складзеная славутая «Пахвала Вітаўту» і так званы Беларуска-Літоўскі Летапіс 1446 году. Менавіта з-за гэтага места нашая дзяржава вяла бясконцыя войны з Масквой, менавіта за Смаленск і Смаленшчыну паклалі галовы тысячы й тысячы беларусаў, і менавіта смаленскае суперніцтва з Маскоўшчынай у значнай ступені перадвызначыла гістарычны лёс цэлай старой Беларусі.

Беларускі характар гэтай зямлі не выклікае сумненьняў. Гэта сёньня расейцы, у патрэбе часу, называюць тамтэйшыя гаворкі паўднёва-заходнімі рускімі. А вось калі пагрозы ў выглядзе беларускай дзяржавы не існавала, напрыклад у 1868 годзе, яны падавалі аб Смаленску іншую інфармацыю. Паводле дадзеных Смаленскага статыстычнага камітэту, тады 68% насельніцтва Смаленскай губэрні былі беларусамі. А ў цэнтральных і заходніх паветах губэрні гэтыя лічбы набліжаліся да 100%. У Красьненскім павеце беларусаў было 95%, у Рослаўскім — 94%, у Смаленскім — каля 91%, у Парэцкім — 90%, у Ельнінскім — 90%, у Духаўшчынскім — 87% і ў Дарагабускім — каля 81% насельніцтва. 30% небеларускага насельніцтва ў губэрні даваў сам Смаленск, зрусы-

фікаваны за 300 год палону. (гл. «Смаленская губэрня» Статыстычныя дадзеныя. 1868 г.)

Смаленскія крывічы трошку адрозніваліся тым, што яны прыйшлі на памежныя землі. Але на тэрыторыі Смаленшчыны да XII стагодзьдзя існавала ўсходнебалцкае племя Голядзь, і смаленцы яго асымілявалі даволі позна, балты існавалі яшчэ ў XII стагодзьдзі, ня кажучы ўжо пра VIII-IX-X стагодзьдзі. Іншая справа, што на Смаленшчыне крывічы сутыкнуліся і зь фіна-вугорскімі плямёнамі, бо гэта была мяжа паміж балтамі й фіна-вуграмі. І гэты элемэнт фіна-вугоршчыны ў смаленцаў мае месца. Дарэчы, пскоўскія крывічы ўжо напалову зьвязаныя зь фіна-вуграмі, г. зн. нашмат больш, чым смаленцы. Таму дасьледаваньні нашых археолягаў па Полаччыне ў карціну засяленьня балцкіх абшараў крывічамі нічога новага не даюць. Нашая Смаленшчына зноў падняла галаву ў канцы XIX — пачатку XX стагодзьдзя. Напрыклад, калі на Ўсебеларускім Кангрэсе ў сьнежні 1917 году, дэлегаты Віцебшчыны й Магілеўшчыны выступалі за аўтаномію Беларусі, дык смаленцы разам зь віленчукамі выступалі за поўную незалежнасьць. Потым Смаленск адыграў велізарную ролю праз пару год, калі ў Смаленску была абвешчаная БССР. І вось гэтыя моманты паказваюць, што пытаньне Смаленшчыны — тое самае, што й пытаньне Страсбуру, Эльзасу й Лятарынгіі, ў французска-нямецкіх дачыненьнях. Смаленшчына для Беларусі — гэта своеасаблівая адмета, своеасаблівы сымбаль як беларускага адраджэньня, гэтак і заняпаду. Як толькі пытаньне Смаленшчыны ўзьнікае — заўжды Беларусь становіцца на ногі й адраджаецца. Гэтаксама й як толькі яно зьнікае з гістарычнае карты, дык і Беларусь у заняпадзе.

Вось канкрэтныя прыклады. Пасьля бітвы пад Воршай Смаленск застаўся ў складзе расейскае дзяржавы. І гэта прывяло да таго, што троху пазьней прыйшоў у Беларусь Іван Жахлівы, захапіў і вынішчыў Полацак і зьнішчыў, фактычна, Полаччыну як этнакультурны рэгіён. І мог ён гэта зрабіць толькі маючы ў руках Смаленск. Аднак калі Расея сама трапіла ў цяжкае становішча — так званы Смутны час — і калі польскі кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт у 1609 годзе штурмам узяў Смаленск, сытуацыя рэзка зьмянілася, і Вялікае Княства Літоўскае ў першае палове XVII стагодзьдзя дасягнула апошняга ўзьлёту. Гэта быў апошні ўсплёск ягонага росквіту, росквіту матэрыяльнае культуры й дойлідзтва.

У 1860 годзе беларусаў у Смаленскай губэрні налічвалася 1.122.000, а вялікаросаў (расейцаў) — 520.000, у адсотках — 68 % і 32 %. Атрымалася так, як ні дзіўна, што Смаленская губэрня была адной з самых беларускіх. Чаму? Таму, што колькасьць жыдоў была тут мінімальная. Мяжа аселасьці адрэзала гарадзкое жыдоўскае насельніцтва ад Смаленшчыны. І невыпадкова, што яна была такой беларуска-сьведамай. У гарадах Смаленшчыны, за выключэньнем тых, што трапілі ў склад Магілеўскае губэрні, жыдоў было значна меньш альбо зусім ня было. Ёсьць тут пэўныя паралелі з Беласточчынай. Бо Віленшчына й Вільня — гэта ўсё ж сэрца Вялікага Княства Літоўскага, сэрца й сталіца Беларусі. Смаленск ніколі, за выключэньнем аднаго дня — 1 студзеня 1919 году — не прэтэндаваў на сталіцу Беларусі ці БССР. Ён адзін толькі дзень быў сталіцай. Але ён для нас мае такое самае значэньне, як на захадзе Горадня.

У 1990 годзе група дэпутатаў апазыцыі Дэмклюбу, у якую ўваходзілі Пётра Садоўскі, Дзьмітры Булахаў і Зянон Пазьняк, ездзілі у Вярхоўны Савет РСФСР у Маскву. Па розных пытаньнях. У тым ліку сустракаліся й з прадстаўнікамі Смаленшчыны, дэпутатамі ВС РСФСР ад Смаленска. Ну й краналі пытаньне пра магчымы рэфэрэндум — дзе быць Смаленшчыне, у Беларусі, БССР тагачаснай, ці ў Расеі? Як на гэта глядзіць мясцовая эліта? Бо тыя дэпутаты й былі прадстаўнікамі мясцовае эліты — прадстаўнікі райкомаў, абкомаў Смаленскае вобласьці й г.д. На дзіва, усе яны выказаліся «за». Яны сказалі, што каб толькі гэты рэфэрэндум адбыўся, каб нам не перашкаджалі, мы б усе перайшлі ў Беларусь. Таму што ў той час Беларусь жыла нашмат лепш, чым Смаленшчына, і яны заўсёды глядзелі на Беларусь, як, напрыклад, палякі глядзелі на Нямеччыну, ці ўсходнія немцы на заходніх.

Што зьдзівіла, дык гэта тое, што гэтыя людзі (а большасьць зь іх былі прыехаўшы на Смаленшчыну пасьля вайны, бо ў вайну гэты край быў цалкам зьнішчаны) былі патрыётамі Смаленшчыны па духу. Многія зь іх выпісвалі газэту «Зьвязда», а усе яны слухалі Беларускае Радыё, нават, некаторыя «ЛіМ» чыталі… І гэта далёка не інтэлігенцыя, гэта партыйная намэнклятура. І яны выказалі сваё меркаваньне — каб такі рэфэрэндум адбыўся ў 1990 годзе, дык Смаленшчына безумоўна далучылася б да БССР.

А ўвогуле, цікавая гэта рэч — узбуйненьні тэрыторыі БССР. Аказваецца, яшчэ ў 30-х гадох газэта «Зьвязда» друкавала мапы Савецкае Беларусі са Смаленшчынай уключна. Гэта гаворыць аб тым, што айцы БССР троху думалі пра сваю вотчыну… Напрыклад ў 1945 годзе, адразу пасьля вайны, Вярхоўны Савет БССР вынес пастанову пра ўключэньне Ўсходняй Прусіі разам з горадам Кёнігсбэргам-Калінінградам у склад БССР, матывуючы гэта патрэбай Беларусі выйсьці да мора. Мы ж тады мелі й Беласточчыну. Але Масква мела іншыя пляны. Пастанову ў Крамлі скасавалі, а хутка й Беласточчыну падаравалі палякам. З тэрыторыяй нам у тым стагодзьдзі моцна не шанцавала.

Дарэчы, апошні кавалачак Смаленшчыны далучыўся да Беларусі ў 1964 годзе — гэта былі 8 вёсак калгасу «Путь Коммунизма», які ўвайшоў у склад Беларусі падчас хрушчоўскае адлігі.

Так сталася, што лёс беларускай дзяржаўнасьці й барацьбы беларусаў за нацыянальнае самавызначэньне — дастаткова трагічны. У пач. XVI-XVII ст. беларускі народ, асабліва рэшткі былой эліты-шляхты, падвергліся апалячваньню. У пазьнейшы час, у царскае Расеі, само існаваньне беларусаў ставілася пад сумнеў — размова калі й ішла, то аб выключна «русском» насельніцтве заходніх губерній.

Пад час грамадзянскае вайны ў пач. XXст. беларуская дзяржаўнасьць пачала адраджацца ў двух узаемавыключаючых формах — нацыянальна-дэмакратычнай і савецкай.

Пасьля першай сусьветнай вайны й ганебных замірэньняў падзел стаў яшчэ й геаграфічным — Заходняя Беларусь засталася за Польшчай. Так бальшавікі расплаціліся за авантурны паход на Варшаву.

Беларуская Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка (БССР) была прагалошана 1 студзеня 1919 года ў адным з буйнейшых беларускіх гарадоў Смаленску. 5 студзеня новы ўрад пераехаў у Менск, 31 студзеня усерасейскі цэнт-

ральны выканаўчы камітэт (ВЦИК) прызнаў незалежнасьць новае рэспублікі. Але ў жніўні ўся тэрыторыя БССР была захоплена Польшчай і толькі праз год часткова занята савецкімі войскамі. 31 ліпеня 1920 года сход камуністычных і прафсаюзных арганізацый паўторна прагалосілі незалежнасьць. Але ж 70% этнічных тэрыторый Беларусі-апынулася па за яе межамі. У 1924 годзе да БССР былі далучаны Віцебская, частка Гомельскай і два паветы Смаленскае губерніі.

Але палітыка РСФСР па ўтрыманьню этнічных беларускіх земляў у сваім складзе была трывалай і фактычна акупацыйнай, таму й ня мела падтрымкі беларусаў. Згодна меркаваньняў тагачасных беларускіх камуністаў: «такая недальнабачная палітыка узмацняе й актывізуе ўсё правае антысавецкае крыло беларускіх арганізацыяў у Польшчы, Латвіі, Чэхаславаччыне й Летуве. Далей за эміграцыяй і ў БССР пачынаюць мелькаць антысавецкія настроі частцы беларускай нацыянал-дэмакратычнай інтэлегенцыі».

Нават камуністычнае кіраўніцтва БССР, якое па паходжаньню ў сваёй большасьці было не беларускім — лічыла, што: «беларускі «нацыяналізм» сілкуецца непасьлядоўнасьцю ў нацыянальнай палітыцы ў СССР, яе адставаньнем ад прынятых рашэньняў і няскончаным адмежаваньнем тэрыторыі БССР. Усю Гомельшчыну, частку Пскоўскай і Смаленскай губерній і рускія, і беларускія гісторыкі адносяць да Беларусі, а далучэньне частак Смаленшчны і Гомельшчны да БССР (1924) мела надзвычай станоўчае палітычнае значэньне для беларусаў і іх эміграцыі, узмацніла сярод заходніх беларусаў аўтарытэт БССР. Але рэзка адмоўныя настроі выклікакла жаданьне Савецкай Расеі пакінуць у сваіх межах беларускую Смаленшчыну».

Але палітыка русіфікацыі імкліва разгортвалася на ўтрымліваемых абшарах. Вось што напрыклад пісала адна з савецкіх газэтаў пра савецкую нацыянальную палітыку на Смаленшчыне ў 1926 г: «Ад уласнага смаленскага карэспандэнта. Усе, хто ведае гісторыю, хто знаёмы з нацыянальным складам Савецкага Саюзу, ведае, што ў Смаленскай губерніі жыве дастаткова вялікая колькасьць беларускага насельніцтва. Я не буду казаць аб тых лічбах, якія даў перапіс 1921–1923 гадоў (па гэтым лічбам у гор. Смаленске налічваецца каля 6000 белорусаў, а па губерніі — каля 81 тысячы).

Я вазьму тое, што піша акадэмік Карскі, той Карскі, якога абвінаваціць у беларускім шавінізме ніяк нельга. У сваёй кнізе «Белорусы», Варшава, 1903 г., ст. 187, ён піша: «…Количество белорусского населения Смоленской губернии довольно точно определяется в обзоре Смоленской губернии за 1901 год, Смоленск, 1902 г. (всеподданнейший доклад губернатора). Здесь в белорусских уездах, за исключением городского населения, показано 920.042 чел. Если прибавить сюда за 2 года прирост населения (1,5 %) — 27.784, то получим белорусов в Смоленской губернии 947.826 человек. Это число довольно близко к действительности, так как и в городе есть белорусы, но, с другой стороны, и великорусы имеются по селам в белорусском районе, особенно около железных дорог. Эта цифра недалека будет от той, которою определялось число белорусов в Смоленской губернии в 1860 году (1.122.000). // Ср. «Живописная Россия». Том III, с. 442, статья С. Максимова».

Вядома, што лічбы зьменшыліся, бо частка беларускага насельніцтва русіфікавалася, частка губерні ў сувязі з раянаваньнем далучана да Беларусі, але яшчэ беларускае насельніцтва Смаленска варта лічыць сотнямі тысяч. Смаленскі жа гарсавет надумаў, што беларусаў у Смаленску няма, аб іх ня варта казаць і на сваім паседжаньні ў кастрычніку пастанавіў, каб сродкі, якія былі прадугледжаны па бюджэту Смаленскага губернскага аддзелу народнай адукацыі на культурна-асьветніцкую працу сярод беларускага насельніцтва гораду на 27/28 навучальны год, перадаць ны жыльлёвае будаўніцтва.

Ёсьць сьведчаньні аб паваеннай беларускай антыбальшавіцкай партызанцы на Смаленшчыне. Выходзіла нават беларуская пранезалежніцкая газэта «Пад абцасам маскалёў», якую падпольшчыкі распаўсюджвалі па вёсках і хутарох, на скрыжаваньнях гасьцінцаў краю.

Нават у сучаснай Расейскай Федэрацыі засталіся прабеларускія настроі ў частцы мясцовай смаленскай эліты. У кастрычніку 1998 года на прэс-канферэнцыі ў МЗЭС РБ губернатар смаленскай вобласьці Прохараў паведаміў: «Смоленщина была седьмой областью при создании Белоруссии, к сожалению, нас тогда отделили». Спадар Прохараў нават плянаваў адзначыць у сваёй губерніі 80-ю гадавіну заснаваньня БССР.

І сёньня наш беларускі ўсход, ільняная Смаленшчына — застаецца этнічнай зямлёй крывічоў-беларусаў, нашай духоўнай і культурнай спадчанай, якая патрабуе захаваньня й вывучэньня. І не так важна, што гэтая тэрыторыя знаходзіцца ў складзе іншай дзяржавы. Гістарычна так склалася, што яна месьціцца на памежжы й ў розныя часы пераходзіла з пад аднаго ўладараньня да другога.

Галоўнае, што мы самі ведаем і памятаем пра нашае радство й еднасьць. І калі мы, беларусы, будзем мець нацыянальную дзяржаву, лепшы ўзровень жыцьця й нацыянальныя памкненьні, то гісторыя нам шчэ паспрыяе, бо як вядома разьвіваецца па сьпіралі.

ГЕНЭЗА БЕЛАРУСКАГА РУХУ НА СМАЛЕНШЧЫНЕ

Фёдар Паднікольскі

На працягу XV–XVII стст. гісторыя Смаленска і Смаленскай зямлі была шчыльна звязаная з Вялікім княствам Літоўскім, у межах якога з 1405 да 1514 году гэтыя тэрыторыі знаходзіліся. Амаль праз сто год, у 1611 годзе, пасля 21 месяцы аблогі каралём Жыгімонтам III Вазай, Смаленск быў далучаны да федэрацыі Каралеўства Польскага і Літвы — Рэчы Паспалітай.

У межах гэтага дзяржаўнага ўтварэння Смаленшчына знаходзілася да 1654 году, калі ў выніку самай кровапралітнай вайны, вядомай у польскай гістарыяграфіі як «Крывавы патоп», канчаткова не апынулася ў складзе Расіі.

У перыяд доўгага знаходжання ў складзе ВКЛ Смаленск займеў надзвычайную ролю абарончай крэпасці на ўсходзе дзяржавы. Менавіта Смаленск дзяржаўныя дзеячы Вялікага княства называлі «Ключом Літвы», калі дзяржаўная мяжа пралягала ўсяго толькі ў 350 км. ад Масквы[1].

У палітычнай думцы ВКЛ і РП XVI–XVII стст. Смаленск і Смаленскае ваяводства лічыліся спрадвечна сваёй зямлёй, захопленай гвалтам Маскоўскім царствам. На мяжы XIX–XX стст. «смаленскі міф» часоў *Liberum veto* быў мадэрнізаваны беларускімі інтэлектуаламі за кошт яго сінтэзу з элементамі «заходнерускага» наратыву, накіраванага супраць польскай дамінацыі ў Паўночна-Заходнім краі. Гэты факт стаў вызначальным для выспявання беларускай нацыянай героікі, смаленскага эпасу і, зрэшты, генэзы беларускага руху на Смаленшчыне.

Тыповы для сярэднявечча «літоўскі» погляд на Смаленск характэрна адлюстроўвае першы польскамоўны энкомій, напісаны ў 1628 годзе беларускім шляхціцам Янам Куноўскім. У паэме «Smoleńska zacność» зусім не звяртаецца ўвага на далітоўскі перыяд існавання Смаленскага княства, але, у той жа час, спектакулярна апісваецца мужнасць жыхароў Смаленска ў агульнай для Літвы і Кароны Польскай бітвы пад Грунвальдам.

Далучэнне горада да Маскоўскай дзяржавы ў 1514 годзе, на думку аўтара, адбылося з-за здрады князя Міхася Глінскага, а грандыёзныя будаўнічыя працы па ўзмацненні крэпасці, якія праводзіліся па загадзе Барыса Гадунова, былі інтэрпрэтаваны як жаданне ўтрымаць чужое.

У сваю чаргу, аблогу Смаленска Жыгімонтам III паэт разумеў як гістарычную справядлівасць — рэалізацыю палітыкі вяртання згубленых земляў[2].

Погляд шляхты на Смаленск і яго ролю для краіны выдатна адлюстроўвае і такі вядомы літаратурны помнік як «Ліст да Абуховіча», напісаны Цыпрыянам Камунякам у 1655 годзе. Складзены ў форме сяброўскага ліста, твор ганьбіць Піліпа Абуховіча, смаленскага ваяводу, які ў гэтым творы больш думае пра нажыву і маскоўскіх собаляў — стылізаваныя трыццаць срэбранікаў — чым пра свае абавязкі як патрыёта і урадніка. Абураны стратай Смаленска, аўтар шле праклёны па адрасе Абуховіча, «якому пры ўцёках са Смаленска

спатрэбілася 300 падвод для перавозкі адной толькі пасцелі», і ўсяляк крытыкуе вінаватых ў здачы горада.

Відавочна, Смаленшчына ўспрымалася сучаснікамі Цыпрыяна Камунякі як нешта спрадвечна літоўскае, а смаленцы лічыліся такімі ж прадстаўнікамі палітычнага «літоўскага народу», як і шляхта іншых земляў усходняй часткі Вялікага княства Літоўскага.

Пасля страты Смаленска ў 1654 годзе былы ваявода смаленскі Піліп Абуховіч падвяргаецца ганенням, а ў 1658 годзе Сойм прыняў адпаведны дэкрэт па абвінавачванні яго ў здачы Смаленска маскоўскім войскам[3].

У «Прамове Мялешкі, каштэляна Смаленскага, на сойме у Варшаве у 1589 годзе», іншым ананімным творы, які датуецца не пазней за 1632 год[4], прадстаўнік смаленскага набілітэту выяўляе літоўскі патрыятызм, смуткуючы, што «...од их милостей панов-ляхов гинуть старие наши поклоны смоленские...», і жорстка выкрывае засілле палякаў і польскай культуры ў сябе на радзіме. Для яго палітычным ідэалам ёсць Жыгімонт I Стары, які «немцев, як собак, не любил и ляхов з их хитростю велми не любил, а Литву и Русь нашу любително миловал».

***

Пасля далучэння Смаленска і ваяводства да Расіі, маскоўскі прастол вымушаны быў улічваць выключную важнасць гэтых тэрыторый для заходняга суседа, а таксама этнакультурныя асаблівасці захопленых земляў.

На тэрыторыі былога Смаленскага ваяводства надзялялася шмат увагі захаванню саслоўных прывілеяў мясцовай шляхце, якую ў расійскай гістарыяграфіі называюць «польскай». Менавіта шляхта выступала ў Рэчы Паспалітай у якасці палітычнага народа, а ў мясцовых умовах яна вызначала палітыку афіцыйнага урада да забраных тэрыторый. З'яўляючыся закрытай саслоўнай карпарацыяй, смаленская шляхта была тым элементам, які адасабляў Смаленшчыну ад іншых рэгіёнаў еўрапейскай Расіі. Памяць пра «залатыя каралеўскія вольнасці», прыхільнасць да польскай мовы, мясцовай русінска-польскай культуры і рыма-каталіцтва захоўвалася ў мясцовага насельніцтва некалькі стагоддзяў.

Гэта прывяло да таго, што расійскія ўлады, а таксама цэлая плеяда аўтараў яшчэ у сярэдзіне XIX стагоддзя разглядалі Смаленшчыну з пазіцыі «свайго-чужога», як «польскі», «невялікарускі» ці нават «захоплены» край.

У складзе саслоўя мясцовых шляхціцаў безумоўна пераважалі рыма-каталікі, але нацыянальны склад дадзенай службовая праслойкі меў даволі стракатае паходжанне. Асноўную масу мясцовай шляхты складалі прадстаўнікі мясцовых «рускіх» родаў, каталіцкага або праваслаўнага веравызнання. Апынуўшыся ў складзе Маскоўскай дзяржавы, у 90 % выпадках мясцовыя шляхціцы не маглі даказаць сваю праналежнасць да польскіх родаў[5].

Новая ўлада адразу зрабіла захады, каб перацягнуць замкнёную і варожа настроеную шляхецкую карпарацыю на свой бок. Лаяльным прадстаўнікам мясцовай шляхты гарантаваліся эканамічныя выгоды і пэўныя маёмасныя гарантыі.

У 1654 годзе цар Аляксей Міхайлавіч выдаў указ, паводле якога бяздзетным удовам мясцовай шляхты, калі яны выйдуць замуж за рускіх службовых люд-

зей, пакідаліся пажалаваныя ім раней маёнткі. Дзецям загінулых шляхцічаў надавалася права атрымаць надзелы за кошт маёнткаў іх бацькоў.

У дадатак, паводле адпаведнага імяннога ўказа, беззямельныя смаленскія шляхціцы, бацькі якіх у 1654 годзе былі ў аблозе і пасля капітуляцыі паступілі на службу ў Маскоўскае царства, мелі права, пры адшуканні прыналежных памерламу маёнткаў, прасіць перапісаць маёнткі на іх. Тым жа безмаёнткавым шляхціцам, бацькі якіх збеглі ў Літву, было абвешчана, што вылучэнне ім надзелаў на перанаселеннай Смаленшчыне не падаецца магчымым.

У 1682 годзе, пасля смерці маскоўскага цара Фёдара Аляксеевіча, на пасад уступілі два манарха Іван і Пётр Аляксеевіч, якія зноў пайшлі на саступкі смаленцам. У першы год свайго кіравання дуумвірат пацвердзіў усе прывілеі раней дадзеныя як польскімі каралямі, так і рускімі царамі. У прыватнасці, атрыманыя маёнткі паступалі ў поўную ўласнасць службовым людзям з магчымасцю іх перадачы, закладу і продажу.

Пазней урад ідзе на далейшыя саступкі на карысць смаленскай шляхты: быў выдадзены закон, згодна якому права на атрыманне «поместий» ў Рослаўскім, Смаленскім, Дарагабужскім, Бельскім паветах мелі толькі асобы, прыпісаныя да смаленскага шляхецтва і рэйтары смаленскага шляхецкага палка. Людзям «московских чинов» шлях да набыцця зямель у згаданых паветах фактычна перакрываўся.

У чэрвені 1688 году быў выдадзены яшчэ адзін імянны ўказ паводле якога смаленскім шляхціцам, падчас знаходжання іх на службе, выдавалася з казны грашовае ўтрыманне. У тым жа ўказе пацвярджаліся права на валоданне імі маёнткамі і вотчынамі.

Пасля смерці Пятра I, імператрыца Кацярына Аляксееўна, помнячы пра спецыфічную памежную палітыку, дапоўніла прывілеі шляхецтву, дазволіўшы ім прадаваць вырабы рамёстваў у гарадах Расіі ці прадаваць іх рускім купцам. Другім указам, адрасаваным дзецям мясцовай шляхты, апошнім надавалася права служыць як у войску, так і ў смаленскім палку, які не меў статусу рэгулярнай арміі.

Усяго грамат, якія замацоўвалі за смаленскай шляхтай прывілеі, у перыяд з 1654 па 1694 год было выдадзена шэсць. Галоўны інструмент палітыкі на захопленых землях — эканамічны — быў выкарастаны напоўніцу: за мясцовай шляхтай замацоўваліся іх спадчынныя «маетности», а, згодна залатому правілу divide et empera, землі верных каралю Рэчы Паспалітай феадалаў перадаваліся прысягнуўшай шляхце ў якасці «поместий».

Указам ад 30 снежня 1701 году смаленская шляхта на 13 гадоў раней за рускае дваранства атрымала беспрэцэндэнтныя для Маскоўскай дзяржавы маёмасныя правы. Як старыя «каралеўскія» маёнткі, так і «дачы» з маскоўскага прыказа («поместья») замацоўваліся за шляхтай на правах поўнай прыватнай уласнасці — вотчын.

Смаленская шляхта фактыча два стагоддзі ўспрымалася цэнтральнымі ўладамі як адасобленая сацыяльная і нацыянальная група. У 1762 годзе менавіта смаленская шляхта асобна згадваецца ў «Манифесте о вольности дворянства», а Пецярбург працягвае выкарыстоўваць у адносінах да палякаў палітыку бізуна і перніка.

Не зважаючы на шматлікія эканамічныя меры і пашырэнне на шляхту маёмасных правоў, маскоўкі ўрад добра разумеў, што «польскі элімент» па-ранейшаму глядзіць з надзеяй на захад. Пагроза «літоўскага сепаратызму» не была такой надуманай, бо існаванне даволі шматколькаснай Рослаўскай, Бельскай і Смаленскай шляхты, вызнаваўшай каталіцтва і працягваючай падтрымліваць кантакты з Рэччу Паспалітай праз недалёкую граніцу, магло сур'ёзна дэстабілізаваць сітуацыю ў выніку ўзнаўлення вайсковых дзеянняў.

Шляхта успрымала эканамічныя захады расійскага трону як паўмеры, бо маскоўскі эканамічны ўклад быў нашмат менш прывабным у параўнанні з вольніцай, якая давалася прывілеямі Вялікага князя Літоўскага. Таму ў славутай чалабітнай, прадстаўленай Кацярыне II ў 1762 годзе дэпутацыяй ад смаленскай шляхты, вымольвалася адмена непапулярных казённых збораў і павіннасцяў, якія, маўляў, прывялі мясцовую шляхту «... в крайнюю бедность и несостояние». Атрымаўшы рашучую адмову ад імператрыцы, смаленская шляхта паспрабавала дамагчыся дазволу будаваць корчмы і не плаціць падаткі, акрамя падымнага, у час працы камісіі па падрыхтоўцы праекта новага «Уложения», але зноў безвынікова[6].

***

Ідучы на пэўныя саступкі ў эканамічнай сферы, якія выконвалі ролю перніка, Пецярбург добра памятаў урок 1632–1634 гг., таму выкарыстоўваў рэлігійнае жыццё ў ролі бізуна.

У 1728 годзе, праз 74 гады пасля далучэння Смаленска да Расіі, усе смаленскія шляхціцы, прынамсі фармальна, лічыліся праваслаўнымі. Да таго часу на Смаленшчыне ўжо не засталося касцёлаў. Аднак, як паказваюць наступныя падзеі, барацьбу за розумы аднаверцаў Рэч Паспалітая не спыняла. Прыняцце большасцю шляхты праваслаўя насіла хутчэй практычны і вымушаны характар, бо практыка накіравання дзяцей на вучобу ў ордэнскія школы Рэчы Паспалітай фактычна азначала вяртанне членаў шляхецкіх сем'яў у каталіцтва.

У 1728 г. у Сенаце разглядалася гучная справа аб навяртанні 30 смаленскіх шляхціцаў у «лацінскую» веру. Гэты працэс добра адлюстроўвае тую этна-рэлігійную сітуацыю, якая існавала ў Смаленску і губерніі ў XVIII стагоддзі. Абвінавачаныя, якія паходзілі з найзаможнейшых смаленскіх радоў Пацёмкіных, Друцкіх-Сакалінскіх, Ванлярлярскіх і іншых, сведчылі, што ахрысціліся ў каталіцтва яшчэ ў дзяцінстве, у час іх навучання ў езуіцкіх калегіюмах у Мсціславе, Оршы ды Віцебску. Шляхцянкі, якія таксама абвінавачваліся ў адыходзе ад дзяржаўнага праваслаўя, прызналіся, што каталічкамі сталі ў самым раннім узросце, трапіўшчы на выхаванне да родных, арыстакратаў з Літвы.

Вярнуўшыся пасля навучання на радзіму, смаленцы працягвалі вызнаваць каталіцтва і адначасова наведваць праваслаўныя храмы, матывуючы тое дазволам братоў-езуітаў. Некаторыя з іх, нават не хаваючы сваёй варожасці да праваслаўных іерархаў, ніколі не хадзілі да царкоўнай споведзі, задавальняючыся падпольнымі таемствамі па рыма-каталіцкім абрадзе.

Апошнія, па пастанове Вярхоўнага Таемнага Савета, былі асуджаны на пажыццёвае пасяленне ў Сібіры з канфіскацыяй нерухомай маёмасці. Тыя ж шляхціцы, што працягвалі выконваць праваслаўныя абрады пасля вяртання

з-за мяжы, караліся значным грашовым штрафам і аддаваліся пад асабісты нагляд смаленскага архірэя.

Адразу пасля судовага разбіральніцтва, Вярхоўны Таемны Савет загадваў смаленскаму архірэю сачыць за тым, каб «…смоленская шляхта веру греческого вероисповедания в благочестии и исправно содержали и ни мало б соблазна в том не происходило»[7].

Зносіны смаленскай шляхты з памежнымі землямі Рэчы Паспалітай ўскладняліся, бо жадаючым паехаць у Літву па справах трэба было прысягнуць на крыжы ў вернасці праваслаўнай веры, і, да таго ж, знайсці некалькі даручальнікаў. Таксама шляхце забаранялася навучаць сваіх дзяцей за кардонам, матывуючы гэты указ дастатковай колькасцю адпаведных устаноў у Кіеве і Маскве. Імкненне поўнасць ізаляваць «сепаратыстаў» ад польскіх уплываў прывяло і да забароны наймаць у якасці хатніх настаўнікаў людзей каталіцкага веравызнання, выдаваць дачок замуж за каталікоў ці уніятаў, браць у жонкі каталічак з Літвы ці Украіны.

Асаблівая ўвага надавалася дзейнасці ксяндзоў, каталіцкага і ўніяцкага кліра як патэнцыйных агітатараў і падбухторшчыкаў хваляванняў. На мяжы афіцэры пільна адсочвалі спробы каталіцкіх святараў нелегальна пракрасціся на тэрыторыю Расіі. Больш за тое, калі каталіцкія святары прыбывалі ў Смаленск па прыватных справах, памежная варта абавязкова паведамляла аб замежніку губернатару і архірэю, абавязваючы сужаземца вырашыць свае справы і пакінуць краіну ў адведзены тэрмін. Са святароў бралася адпаведная падпіска, якая загадвала ім пад пагрозай пакарання не выконваць святарскіх функцый, не параапранацца ў свецкае ўбранне і не схіляць да каталіцтва мясцовых жыхароў.

У сваю чаргу, урад загадваў адміністрацыі «… у всех смоленских шляхтичей взять сказки под жестоким истязанием», каб яны не мелі аніякіх кантактаў з каталіцкімі ксяндзамі і «в домы к себе их не пускали, для исповеди к ним не ходили и никаких наговоров от них не слушали»[8].

***

Меры расійскага ўрада па нейтралізацыі літоўска-польскіх уплываў мелі канкрэтныя мэты. Справа заключаецца не толькі ў абароне праваслаўя як адзінай дзяржаўнай рэлігіі, але і ў імкненні засцерагчы ад бунтаў нова прыбаныя тэрыторыі з Расіяй. Гэтае імкненне ўлічвала тое, што у Смаленскай губерніі балем правіла «польская партыя» як фактычна адзіны носьбіт феадальнага землеўладання. Таму Масква ідзе на шматлікія саступкі мясцовай шляхце аж да адмены абавязковай вайсковай службы ў сярэдзіне XVIII стагоддзя.

Такая палітыка адлюстроўваецца ў стварэнні асобных органаў для кіраўніцтва шляхецтвам і ўсёй Смаленскай вобласцю: Прыказа княства Смаленскага ў Маскве, падначалена спачатку Стралецкаму, а потым Пасольскаму прыказам.

У XVIII стагоддзі вышэйшае кіраўніцтва смаленскай шляхтай перадаецца Сенату, а з 1740-х гг. і Смаленскай губернскай канцылярыі, як мясцовай судовай і распарадчай інстанцыі ў дачыненні да шляхты. Тым не менш, смаленская шляхта па-ранейшаму разглядаецца як асобная нацыянальная і саслоўная група.

Нягледзячы на рэпрэсіі і на тое, што апошняе польскае валадарства працягвалася на Смаленшчыне ледзь больш за 40 гадоў, смаленскае дваранства, на працягу ўсяго XVIII стагоддзя не адмаўлялася ад сваіх звычаяў і «літоўскага» патрятызму.

Паводле успамінаў Льва Энгельгардта, смаленскія шляхціцы на працягу стагоддзя пасля захопу Смаленска, аддавалі перавагу польскім кнігам, хоць пры Ганне Іяанаўне польскія кнігі на Смаленшчыне былі забаронены, а за валоданне імі білі пугай і высылалі ў Сібір. Не зважаючы на забарону шлюбаў з каталічкамі, тубыльцы жонак з «презераемой России» па-ранейшаму не бралі, аддаючы перавагу шлюбам у сваім асяроддзі. У 1700 годзе смаленскія шляхціцы, якія ад'язджалі на «государеву службу» ў Вялікі Ноўгарад, прытрымліваліся польскіх і каталіцкіх імёнаў, хоць і спавядалі «веру грэчаскую»[9].

У 1724 годзе Смаленская губернская канцылярыя ў адказ на запыт камеркалегіі даносіла, што смаленская шляхта разам з яе дзецьмі і падданымі насіла «платье польского манера», фарсячы им нават на сталічным аглядзе 1721 году.

Нават у канцы XVIII стагоддзя у быце шляхты шырока выкарыстоўваецца мясцовая гаворка: «... говорят с сильным польским акцентом,..., пишут по большей части латинским шрифтом и носят национальный польский костюм, в котором и являются в военную службу»[10].

Маючы ненадзейны тыл, расійская адміністрацыя непакоілася і з тае прычыны, што Рэч Паспалітая пасля заключэння Андросаўскага перамір'я 1667 году да канца так і не прызнала адыход Смаленскага ваяводства да Масквы.

Адпаведна, у Рэчы Паспалітай працягвалі фармальна існаваць смаленскія павятовыя пасады, а смаленскія шляхціцы-выгнанцы збіраліся на павятовыя соймікі ў Вільні. Частка смаленскіх эмігрантаў-выгнанцаў, якім не наканавана было стаць «прысяжной-шляхтай», перасялялілася ў свае маёнткі на незанятай ворагам тэрыторыі, а іншыя дамагаліся зямель з дзяржаўнага фонду ці наймаліся ў войска. Да канца XVIII ст. ў Рэчы Паспалітай існавала сістэма дзяржаўнай падтрымкі смаленскіх уцекачоў, у тым ліку і за кошт сродкаў, атрыманых у якасці кампенсацыі за страчаныя землі. Пасля вяртання ў канцы XVII стагоддзя Веліжскай, Себежскай і Невельскай воласцяў ў склад Рэчы Паспалітай, туды актыўна перасяліліся эгзулянты, не атрымаўшчыя ў свой час дапамогі.

У Вялікім княстве Літоўскім да канца XVIII стагоддзя працягваюць прызначацца смаленскія уніяцкія епіскапы, існуючай сімвалічна Смаленскай грэка-каталіцкай епархіі. Рыма-каталіцкі клір адабранага ў вайне Смаленскага ваяводства, таксама да 1783 году аб'ядноўваўся ў непаўнавартасную адміністратыўна-тэрытарыяльную адзінку — Смаленскую рымска-каталіцкую епархію — якая ахоплівала толькі Невельскую, Себежскую і Веліжскую парафіі. Смаленскія біскупы жылі ў Вільні, атрымліваючы, згодна рашэнню Сойма 1776 году, 20 тысяч злотых у год, а епархіяльныя кадры рыхтаваліся семінарыяй краслаўскай Інфлянцкай епархіі.

Каралеўскі двор і вышэйшыя іерархі Літвы і Польшчы пільна сачылі за палітыкай расійскай адміністрацыі на згубленых усходніх землях. Красамоўна сведчыць пра гэта дыпламатычны крызіс, які ўзнік між Крамлём і Вавелем ў

1693 годзе. Рэагуючы на паслядоўны наступ на праваслаўную абшчыну ВКЛ, расійскі рэзідэнт запатрабаваў ад польскага ўрада, каб па ўсіх «рускіх» паветах пасланы былі ўніверсалы са строгай забаронай звяртаць праваслаўных ва ўнію. На гэта быў адказ:

> «Ни королю в государство Московское, ни царям в государство Польское заглядывать и в тамошние распоряжения вступать не следует; смоленская шляхта вся приневолена и стала Русью: и мы об этом не говорим, потому что в обоих государствах вера христианская одна и всякий государь в своем государстве волен»[11].

* * *

Такім чынам, у дачыненні да прывілеяванага насельніцтва былога Смаленскага ваяводства яшчэ працяглы час дзейнічалі асобныя маёмасныя і юрыдычныя правы, тым самым кансервуючыя этнічны і сацыяльны status quo на расійска-беларускім памежжы.

Зліццё смаленскай шляхты з расійскім дваранствам паскорылася пасля ліквідацыі смаленскага шляхецкага палка ў 1764 годзе. Перастаўшы існаваць як асобная вайсковая карпарацыя, і атрымаўшы права на службу ў арміі ці гвардыі на агульных падставах, смаленская шляхта падверглася асіміляцыі.

Аднак нават у пачатку XX стпгоддзя у смаленскай вёсцы фіксуецца значная колькасць шляхты, якая, згубіўшы сваю саслоўную адметнасць пасля ліквідацыі палка і наступнага наступа на аднадворцаў у 1783 годзе , усё адно не раствараецца сярод навакольнага сялянства.

Па дадзеных Першага ўсеагульнага перапісу насельніцтва 1897 году, у Смаленскай губерніі фіксуецца даволі высокая колькасць «палякаў» сярод нашчадкавых дваран: 2251 з агульнай колькасці у 16898 чалавек[12].

«Польскі» характар краю: наяўнасць у Смаленскай губерні значнай і устойлівай праслойкі шляхты, захаванне рысаў былога ваяводства Рэчы Паспалітай і культуррэгерства мясцовых жыхароў, прывяло да таго, што ў XVIII-XIX стагоддзях нормай для расійскага эстэблішменту стала далучаць Смаленшчыну да Паўночна-Заходніх губерній, якія апынуліся ў складзе Расіі на 118 год пазней.

Як слушна заўважае Л. Гарызонтаў, Смаленск і губернія гралі адмысловую ролі ў польска-расійскім ідэалагічным супрацьстаянні, а перспектыва рэпаланізацыі мела пад сабой грунт[13].

* * *

З адзначаных прычын, Смаленшчына не фігурыруе ў расійскім науковым дыскурсе XVIII–XIX стагоддзяў як адназначная «Внутренняя Россия», таму, паводле Гарызонтава, цалкам магчыма лічыць яе першай лініяй геапалітычнага франціра Расія — Польшча, самай перыферыйнай зонай супрацьстаяння двух нацыянальна-дзяржаўных ядраў.

Мяжуючы з «другім эшалонам» геапалітычнага франціра — землямі, якія адышлі да Расіі ў 1772 годзе, — Смаленшчына стала палігонам характэрных палітычных стратэгій, насіўшых абарончы і наступальны характар, і выступаючых у форме палітычных праектаў і ідэалагічных канструкцый[14].

Смаленшчына — зямля, якая «..непрестанно испытывала на себе влияния Литвы и Польши, а через них влияние более далекого Запада».[15] Такі погляд на Смаленшчыну, якая відавочна адрознівалася ў этнаграфічным плане ад старых Вялікарускіх губерній, патрабаваў інтэрпрэтацый з пункту гледжання дзяржаўнай ідэалогіі.

Калі з палітычнай гісторыяй было ўсё зразумела — «Витовт обманом и изменой овладел Смоленском»[16] — то з этнічным абліччам дадзенай тэрыторыі было не ўсё адназначна. Адабраўшы Смаленск зброяй, трэба было замацаваць яго ў тагачаснай імперскай інтэлектуальнай прасторы. Ператварыць былую «польскую правінцыю», землі якой за некалькі стагоддзяў да гэтага прыватызавалі дзяржаўныя дзеячы і мысляры Літвы і Польшчы, ў «исконно-русский» край — такая задача стаяла перад Домам Раманавых.

Асабліва гэта стала актуальна пасля задушэння паўстання 1863 году, рэха якога дасягала Смаленска, адмыслова наводненага расійскімі войскамі ў папярэджанні магчымага прарыву паўстанцаў з Горак.

Вядомы рускі нацыяналіст і дзяржаўны дзяяч Ф.П. Еленеў, агучваючы рэзкі крэн ў польскай палітыцы, пісаў на гэты конт[17]:

> «Наше общество едва ли и вспоминало до нынешних событий, что за … Смоленском живут еще целые миллионы русских, но живут в нищете материальной и духовной, угнетенные и нравственно униженные враждебным элементом, покинутые без руководства и поддержки родными братьями».

У выніку, у працах даследчыкаў XIX стагоддзя з'яўляецца тэзіс аб прышлым «польскім элеменце», які ўяўляе сабой »асіміляваных рускіх» або асеўшых на Смаленшчыне з часоў заваяванняў Сігізмунда II літоўцаў і палякаў[18].

Супрацьпаставіўшы смаленскай шляхце, як «чужой», тутэйшае сялянства, расійскія інтэлектуалы фактычна прапаноўвалі рэгіянальную адаптацыю «заходнерускай» інтэлектуальнай традыцыі.

Этнаграфічныя і лінгвістычныя асаблівасці асноўнай большасці сельскага насельніцтва, якія раней разглядаліся як «польска-літоўска-руская» сумесь, пачынаюць трактавацца як беларускія.

Беларуская Смаленшчына — такую умоўную назву прапанавалі для вызначэння былой «польскай» часткі Смаленскай губерніі — ніякім чынам не супярэчыла «рускай справе», і, наадварот, тлумачыла мясцовыя асаблівасці ў адпаведнасці з тэорыяй трыадзінства рускага народа.

Калі раней, у XVIII стагоддзі, смаленцаў часта называлі «польскай косцю», а Смаленская губернія, дзе па-ранейшаму дамінуе шляхта, трактуецца як забраны ў Польшчы край, то цяпер руская эліта выбудоўвае своеасаблівы міф «беларускасці» былога польскага ваяводства.

Дапамагаюць ідэалагічнай вайне і канкрэтныя палітычныя захады, часам вельмі кур'ёзныя і сумніўныя. Імкненне паказаць інтэграванасць з Расіяй тэрыторый, атрыманых пасля першага падзела Рэчы Паспалітай (1772 г.), прыводзіць да стварэння Беларускага генерал-губернатарства. Тым самым улады ставілі знак роўнасці паміж новапрыдбанымі Віцебшчынай і Магілёўшчынай і «беларускай» Смаленскай губерняй, узнаўляючы ў межах імперыі сярэднявечны літоўска-маскоўскі кардон.

Расійская эліта надае пільную ўвагу вывучэнню традыцыйна-бытавой культуры, абрадаў, дыялектаў мясцовых сялян, а таксама смаленскіх старажытнасцяў. Гэта пацягнула за сабой стварэнне даволі шматлікай друкаванай і картаграфічнай спадчыны [19]. М. Доўнар-Запольскі на гэты конт адзначаў:

«Смоленскую губ. совершенно несправедливо многие относят к центральным губ., между тем она, по устройству поверхности, географическому положению, почве и экономическому состоянию, а в особенности, по своему населению, как одна из Белорусских губ., несомненно, принадлежит к группе губ. Северо-западного края. Это признают и такие маститые знатоки России, как Семёнов и др.».

У сярэдзіне — II-й палове XIX стагоддзя афіцыйная расійская статыстыка, не заўважаючы крамолы ў падзеле «русского племени» ў межах адной губерніі, падкрэслівае наяўнасць асобных вялікарускіх і беларускіх паветаў. Паводле «Девятой ревизии» (1851 г.), паветы Смаленскай губерні падзяляліся па этнічнай прыкмеце наступным чынам:

Великорусские:	*Белорусские:*
Вяземский	Смоленский
Юхновский	Рославльский
Ельнинский	Дорогобужский
Сычевский	Бельский
Гжатский	Духовщинский
	Поречьский
	Краснинский

Такія ж самыя дадзеныя падае Я. Салаўёў:

«Смоленская губерния в этнографическом отношении делится на две неровные части. К первой принадлежит северо-восточный угол губернии, то есть уезды: Вяземский, Юхновский, Гжатский, Сычевский и Бельский, с народонаселением великорусским. Все остальные уезды, стало быть, большая часть общего пространства губернии, населены жителями Белорусского племени»[20].

Аўтар нарысу «Беларуская Смаленшчына з суседзямі» С. Максімаў указваў на геаграфічную адмежаванасць абодвух славянскіх народаў па водападзельным ўзвышшы «...где берут начало реки в одном только направлении в Днепр при посредстве Десны и Сожа». Водападзел быў «сустрэчным пунктам» вялікарускіх палехаў і смаленскіх беларусаў Рослаўскага, Ельнінскага і Смаленскага паветаў.

Смаленск для С. Максімава выступаў у ролі «коренного белорусского города, главной столицы Кривичей, — Смоленска»[21].

Вялікарускаму насельніцтву Смаленшчыны супрацьпастаўляецца ўжо не толькі польская шляхта, то бок «остатки древних польских и литовских фамилий», але і аўтахтоны-беларусы, якія выразна маркіруюцца:

«...крестьянин Рославльского уезда резко отличается от крестьян восточной части губернии в образе жизни, домашней утвари, пище, одним словом во всем, что касается народного характера, домашнего быта и хозяйства»[22].

Паводле «Первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г.» агульная колькасць жыхароў Смаленскай губерні, якія паказалі сваёй роднай мовай беларускую, складала 110.757 чалавек, або 6.61 % ад усяго ліку насельніцтва[23].

Менавіта Перапісам 1897 г. улады збіраліся правесці тоўстую рысу пад спрэчкамі вакол этнічнага аблічча Смаленшчыны, якія не заціхалі ў навуковай літаратуры цэлае стагоддзе.

«Беларуская Смаленшчына» ва ўмовах хуткай моўнай асіміляцыі вяскоўцаў і адсутнасці ў іх нацыянальнай свядомасці выглядала у канцы XIX стагоддзя непатрэбным анахранізмам. На фоне развіцця нацыянальных рухаў у Расійскай імперыі, Міністэрства унутраных спраў вырашыла не ствараць лішніх перашкод для уніфікацыі сваёй еўрапейскай часткі.

Аднак і пасля публікацыі ў 1904 годзе матэрыялаў «Перапіса», у працах навукоўцаў паўднёва-заходняя Смаленшчына трактуецца як этнічна беларуская тэрыторыя[24].

***

Растыражаваныя тэксты і статыстычныя дадзеныя, апісваючыя беларусаў Смаленскай губерні, у рэшце рэшт, стваралі для нацыянальнага руху неабходны інтэлектуальны падмурак, які можна было выкарыстоўваць ва ўласных мэтах.

Узнікшы ў пачатку XX стагоддзя, беларускі мадэрны нацыяналізм развіваўся ў рэчышчы тыповага для Усходняй Еўропы «нацыянальнага будаўніцтва», дзе этнаграфічныя і лінгвістычныя маркеры гралі вызначальную ролю для прапаганды актывістаў-будзіцеляў.

Дамінуючы на кантыненце ірэдэнтызм, які азначаў перагляд склаўшыхся дзяржаўных і адміністрацыйных граніц імперый, і перакройку іх у адпаведнасці з этнічнымі межамі, быў характэрным і для беларускага нацыяналізму.

Канцэпцыя аб неабходнасці сумяшчэння тэрытарыяльна-палітычных межаў з межамі этнаса ляжыць у аснове любой этнакратычнай тэорыі і практыкі[25].

Таму амаль адначасова са з'яўленнем на авансцэне ідэй аб аўтаноміі «Беларускага краю» ў межах Расіі, беларускія інтэлектуалы акрэсліваюць жыццёвую прастору беларускага народу, у якую ўваходзіць і частка Смаленшчыны, чые культурныя, лінгвістычныя, сацыяльныя і гістарычныя асаблівасці з поспехам папулярызаваліся некалькі дзесяцігоддзяў.

Лінгвістычная мапа становіцца аргументам тэрытарыяльных памкненняў і прэтэнзій да суседзяў, а, галоўнае, інструментам легітымацыі часткі былых Паўночна-Заходніх губерній як асобнай краіны і дзяржавы з тытулатурай Беларусь[26].

Услед за Яўхімам Карскім, працы якога сталі адной з апошніх інстанцый ў тэрытарыяльным размежаванні, Антон Луцкевіч ў 1910 годзе вызначае колькасць пражываючых на Смаленшчыне беларусаў лічбай 947.826 чалавек[27]. У недалёкай будучыні, гэтыя дадзеныя 1903 году растыражуюцца Народным Сакратарыятам, фармальным урадам Беларусі[28].

Эпізоды смаленскай гісторыі таксама становяцца падмуркам для агульнабеларускай нацыянальнай ідэі: мова смаленскіх летапісаў, старабеларуская

лексіка дагавора між Рыгай і Смаленскам 1229 году, арэалы крывіцкіх курганоў, геральдычная барацьба ВКЛ за дняпроўскую цвярдыню і інш. — уваходзяць у нацыянальны эпас беларусаў[29].

«Беларуская Смаленшчына», якая калісьці вывучалася з «охранительных» пазіцый, каб прадухіліць «польскую інтрыгу»[30], стала часткай уласна новага беларускага праекта.

З гэтай прычыны, нізкагатунковае перайманне беларускай мовы — «Энеіда» смаленскага памешчыка В.П. Равінскага — становіцца помнікам беларускай літаратуры[31], а беларускай тэрыторыяй побач з Віцебскам і Магілёвам называецца Смаленск[32].

У 1919 годзе Яўсей Канчар (1882–1979) у артыкуле «Территория и население Белоруссии» сцвярджае, што «белорусское племя» займае Смаленскую губерню, нават перабольшыў сапраўдную колькасць беларускіх паветаў, уключаючы ў іх лік вялікарускія Гжацкі, Сычэўскі, Бельскі, Вяземскі, Юхнаўскі паветы.

Асацыюючы ВКЛ з Беларуссю, актывісты беларускага руху стварылі шэраг ідэалагем, якія мусілі даказаць спрадвечную беларускасць Смаленшчыны. У прынцыпе, яны зводзіліся да наступных тэзаў:

1) Смаленск — горад крывічоў; Смаленскае княства — адна з першых формаў беларускай дзяржаўнасці;

2) Смаленшчына — старадаўні асяродак беларускай культуры, радзіма беларускіх святых Клімента Смаляціча і Аўрамія Смаленскага;

3) найвышэйшы перыяд развіцця горада — «залаты век» — гэта часы знаходжання ў складзе ВКЛ;

4) Андрусаўскі мір 1667 г. ёсць злачынны акт гвалтоўнага адарвання Смаленска ад метраполіі;

5) насельніцтва большай часткі Смаленшчыны — этнічныя беларусы[33].

***

Нягледзячы на тое, што беларускі рух на Смаленшчыне развіваўся слабей за ўнутраныя беларускія губерні, праца беларускага актыву і ідэя беларускасці Смаленшчыны знайшла прыхільнікаў.

На I Усебеларускім кангрэсе ў снежні 1917 году разам з іншымі прысутнічалі дэлегаты выбранныя з'ездам Смаленскай губерні. Асноўная маса гэтых дэлегатаў, з'яўляючыся галоўным чынам членамі Беларускага Абласнога Камітэта, выступала за культурную аўтаномію і стварэнне асобнай беларускай вобласці ў рамках Расіі[34].

У канцы 1917 году, адначасова з Усебеларускім кангрэсам, вайскоўцы беларускага паходжання сабраліся ў Смаленску на з'езд ваеннай акругі. Удзельнікі з'езда перадалі ў прэзідыюм з'езда і Беларускі цэнтральны вайсковы камітэт дэкларацыю, у якой гаварылася аб падтрымцы аўтаноміі Беларусі ў саюзе з федэратыўнай Расійскай рэспублікай, а таксама выказваліся патрабаванні аб стварэнні беларускай арміі[35]. Акруговы з'езд беларусаў-вайскоўцаў прыняў рашэнне аб стварэнні ў гэтым «старадаўнім беларускім горадзе» 1-га Смаленскага беларускага палка шляхам папаўнення беларусамі 322-й Віцебскай дружыны.[36]

Праз некаторы час, у губернскім цэнтры адбыўся першы ўсегарадскі ўстаноўчы сход Беларускай партыі левых эсэраў, на які сабраліся каля 100 чалавек[37]. 1 студзеня 1919 году у Смаленску было абвешчана стварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, у склад якой увайшла большая часка Смаленшчыны.

Мы бачым, што беларускі рух на тэрыторыі Смаленшчыны з'яўляецца не выпадкова. Мясцовыя асаблівасці, папулярызаваныя ў выніку шматгадовага расійска-польскага ідэалагічнага і палітычнага супрацьстаяння, а таксама выкарыстанне іх «будзіцелямі» ў якасці мабілізацыйных механізмаў, сталі галоўным чыннікам фарміравання нацыянальнай свядомасці смаленскіх баларусаў і з'яўлення іх нацыянальных арганізацый.

Крыніцы

[1] D. Kupisz, Smoleńsk 1632-1634, Warszawa, 2001, s.13.

[2] Дариуш Хэмпэрэк. Польская поэма XVII века о великолепии Смоленска // Studi Slavistici VI (2009): 229-249. С. 233.

[3] Археографический сборник документов относящихся к истории Северо-Западной Руси. Том XIV, Вильна, 1904, с. 40.

[4] Гл.: «Известия АН БССР», 1955, № 5, с. 65–76.

[5] Смоленская шляхта. Т. I. М., 2006, с. 8.

[6, 7] Архив министерства юстиции. Дела Сената. Л. 291; наказ смоленского дворянства. Том XIV, с. 417.

[8] Русская старина, Том 136, 1908, с. 603.

[9] Гл.: Разборный список Смоленской шляхте и рейтарам и о высылке их Великого государя на службу. 1700 г.// Смоленская шляхта т. 2: Списки шляхты, хранящиеся в РГАДА. М. 2006.

[10] М. Богословский. Смоленское шляхетство в XVIII веке // ЖМНП. Ч. CCCXXII, 1899, март. СПб., 1899.

[11] С.М. Соловьев. История России с древнейших времен. Том 14. Глава 2, часть 36.

[12] Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. Издание центрального статистического комитета МВД. /Под ред. Н.А. Тройницкого/. XL. Смоленская губерния. 1904, с. XIV.

[13] Горизонтов Л.Е. Русско-польское противостояние 19 — начала 20 веков в геополитическом измерении // Japanese Slavic and East European Studies. Vol. 24, 2003, p. 111.

[14] Там сама. С. 113.

[15] Клетнова Е.Н. Символика народных украс Смоленского края // Труды смоленских государственных музеев. Вып. I. Смоленск, 1924, с. 111.

[16] Ф. Некифоров, В. Неверович. Историко-статистическое описание г. Дорогобужа и уезда его // Памятная книжка Смоленской губернии на 1860 г. Смоленск, 1860, с. 78.

[17] Еленев Ф. Польская цивилизация и ее влияние на Западную Русь. СПб., 1863, с. 82.

[18] Ф.Некифоров, В. Неверович. Историко-статистическое описание г. Рославля и уезда его // Памятная книжка Смоленской губернии на 1858 г. Смоленск, 1858, с. 110.

[19] Попов, И. Белоруссия и белорусы / 2-е изд./ М., 1912; Сельскохозяйственная статистика Смоленской губернии. /Составлена Яковом Соловьёвым…/. М., 1855; Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Смоленская губерния / сост. штабс-капитан М. Цебриков/. СПБ, 1862; М.Н. Катков. Русский язык в Западном крае // Московские ведомости». 1869, 9 августа № 175.

[20] Сельскохозяйственная статистика Смоленской губернии. /Составлена Яковом Соловьёвым.../ М., 1855.

[21] Живописная Россия / Под общ. ред. П.П. Семенова/. Репринт изд. 1882 г. Минск, 1994, с. 442.

[22] Ф.Некифоров, В. Неверович. Историко-статистическое описание города Рославля и уезда его // Памятная книжка Смоленской губернии на 1858 г. Смоленск. 1858, с. 126.

[23] Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. XL. Смоленская губерния. СПБ.: / Под ред.Н.А. Тройницкого/, 1904, с. XV.

[24] Попов И. Белоруссия и белорусы / 2-е изд./ М., 1912.; Карский Е.Ф. Белорусы. Том I. Введение в изучение языка и народной словесности. Варшава, 1903; Дурново Н.Н., Ушаков Д.Н., Соколов Н.Н. Очерк русской диалектологии. М., 1915.

[25] Тощенко Ж.Т. Этнократия: История и современность. Социологические очерки. М., 2003, с. 197.

[26] Гл.: Турук Ф.Ф. Белорусское движение. /Б.м./, 1994, с. 4.

[27] Антон Новина. Белорусы // Формы национального движения в современных государствах. Австро-Венгрия.Россия.Германия. СПБ., 1910, с. 385.

[28] Луцкевіч А.І. Усходняя Беларусь. Мінск, 1918, с. 4.

[29] Багдановіч М.А. Беларускае адраджэнне. Мінск, 1994, с. 9.

[30] У сярэдзіне 1880-х К.П. Пабеданосцаў занепакоена дакладаў цару пра планамерную каланізацыю палякамі Смаленскай губерні і звязаную з гэтым небяспеку. Гл.: Победоносцев К.П. Великая ложь нашего времени. М., 1993, с. 507.

[31] ТурукФ.Ф. Белорусское движение. с. 9.

[32] Варонка Я. Беларускі рух ад 1917 да 1920 году. Минск, 1991, с. 5.

[33] У завершанай форме гэтая канцэпцыя прадстаўлена ў брашуры: Сядура У.І. Смаленшчына — адвечная зямля беларускага народа. Нью-Ёрк, 1963. — 44 с.

[34] Михалюк Д. Революция 1917 г. в России и белорусское национальное движение // Революционная Россия 1917 года и польский вопрос: новые взгляды. М., 2009, с. 114.

[35] Михалюк Д. Революция 1917 г. в России и белорусское национальное движение // Революционная Россия 1917 года и польский вопрос: новые взгляды. М., 2009, с. 115.

[36] «Белоруская рада». 1917. № 7, с.2.

[37] Гарэцкі Р. Браты Гарэцкія. Мінск, 2008, с. 36.

БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНІЦКІ РУХ НА СМАЛЕНШЧЫНЕ (1920–30-я гг.)

Фарыд Беррашэд

Смаленшчына: тэрытарыяльна-гістарычны аспект

Грунтуючыся на дадзеных лінгвістыкі, можна сцвярджаць, што да з'яўлення славян, на тэрыторыі Смаленшчыны да пачатку 2 тысячагоддзя да н.э. пражывалі вялікія групы балтамоўных плямёнаў.

Вялізная колькасць балцкіх гідронімаў і археалагічных помнікаў паказвае на тое, што балты не сыходзілі з тэрыторыі Смаленшчыны, а былі паступова славянізаваныя[1].

Згодна В.В. Сядову, у IX-XI стст. Смаленская зямля мела наступныя межы: на захад ад Жыжыцкага возера і верхавінаў ракі Куныі мяжа ішла па Дзвіне і Рутавечы прыкладна да р. Оршыцы. Затым на усход, ахопліваючы верхавіны Вехры і Сажа, і далей — па вадападзелу Дняпра з Дзясной, Уграй і Вазузай. На паўночным усходзе мяжа ўключала верхавіны Волгі ад вусця Вазузы. На захадзе і поўначы Смаленшчына мела граніцу з Полацкай і Наўгародскай землямі. На поўдні — прыдняпроўскімі балтамі, а на ўсходзе — Волга-Клязмінскім міжрэччам.

З XII ст. Смаленск і падуладныя яму тэрыторыі ўжо ўяўляюць сабой самастойнае ўдзельнае княства, якое неўзабаве падпадае пад уплыў суседняга моцнага цэнтра — Вільні. Пасля паходаў князя Альгерда на Маскву, новая палітычная мяжа з усходняй дзяржавай праходзіць «…з единой стороны по Можайско, а з другой стороны по Угру, реку глубокую и болотную, которая почалася недалеко Дорогобужа в лесе за Смоленском миль 18, межи Калугою и Воротином, впадает в реку Оку».

У пачатку XVI стагоддзя агульная памежная лінія была зменена, што сталася вынікам маскоўска-літоўскіх войнаў.

«Лист перемирия вечного» між Літвой, у якой на час падпісання княжыў Казімір Ягайлавіч, і Маскоўскай дзяржавай, дзе на стале знаходзіўся Васіль Васільевіч, ад 31 жніўня 1449 г. сцвярджае:

> «.. а в отчину брате и твоею и моей брати молодшей во всё твое великое княжение, ни в Смоленск, ни во все Смоленские места, что из давна к Смоленску потягло, не вступатися; а тобе Казимиру ... не вступатися в мою отчину, ни во всё мое Великое княжение, ни в мое брати молодшое отчины и во Ржеву с волостьми по озеро по Орлице на полы, по озеро по Плотинцо, по Красный Борок, по Баранью речку, на верх Белейки, по Белейке на Поникл, на верх Сизки, с берёзы на мох, со мху на верх Осухи... А которые волости или оброки потягнули Новгородские к Литве из давна, и мне Князю Великому в то не вступатися по давному».

Грамата аб перамір'і ад 25 сакавіка 1503 г., якой папярэднічаў маскоўска-літоўскі ўзброены канфлікт, пералічвала ў сваім тэксце тое, што ўдавалася пакуль утрымліваць ВКЛ:

> «... нашых земель Александра ... волостей Мозыря, Буйча, Брягина, Речицы, Горволя, Стрешина, Чичерска, Пропойска, Могилёва, города Мстиславля с волостьми, города Кричева с волостьми, города Смоленска, и волостей Рославля, Иванкова, Прудов, Белина, Ельни, Ратщина, Новоселья, Свидита, Жереспера, Поречья, Нежады, Руды, Мушкович, Ветлицы, Щучья, города Витебска, волостей Бруса ... Свята, Озерища...».

У 1512 годзе, пад час чарговай вайны з Маскоўскім княствам, ВКЛ згубіла Смаленск, які будзе каля ста гадоў знаходзіцца ў складзе Маскоўскай дзяржавы. У 1520 г. пачаліся перамовы, у выніку якіх мяжа 1508 года была зацверджана. Новая «смаленская граніца» пачыналася паміж Дзвіной і Каспляй, далей ішла ў паўднёва-ўсходнім напрамку, уздоўж Дняпра, вусця Мярэі і да ракі Іпуць, дзе ізноў паўтарала ранейшую мяжу.

Праз 60 гадоў, паводле Ям-Запольскага міра ВКЛ вярнула сабе назад горад Вяліж з воласцю, а згодна Дэўлінскаму перамір'ю 1619 года Смаленская зямля зноў стала часткай Вялікага Княства Літоўскага. Аднак у складзе Рэчы Паспалітай згаданыя тэрыторыі доўга не пратрымаліся. У выніку вайны 1654-1667 гадоў Смаленскі край быў заняты маскоўскімі войскамі і больш ніколі не выпадаў з-пад расійскага трона.

Як адзначаў П.Федароўскі, геапалітычнае становішча Смаленскай зямлі вызначалася трыма фактарамі, якія ўплывалі на лёсы гэтай тэрыторыі: этнаграфічным адрозненнем дзвюх яе палоў — паўночна-ўсходняй і паўднёва-заходняй; нявызначанасцю межаў і,адпаведна, напружанасцю памежных адносінаў; а таксама эканамічнай залежнасцю ад суседзяў[2].

У 17 ст. войны за Смаленск і памежныя землі спыняюцца, а загаданая тэрыторыя паволі ўключаецца ва ўнутранарасійскі эканамічны зварот.

У складзе Расейскай імперыі Смаленшчына ўяўляла сабой асобную губерню, а з 1708 года яе тэрыторыя была падзелена на паветы. У 1775 годзе на базе «учреждения о губерниях» было ўтворана Смаленскае намесніцтва з падзелам яго на 12 паветаў. Акрамя пяці ўжо існаваўшых гарадоў: Смаленска, Дарагабужа, Вязьмы, Белага, Рослаўля — былі зацверджаны сем новых: Парэчча, Ельня, Сычэўка, Каспля, Красны, Рупосаў і Гжацк, хоць праз два гады замест Рупосава горадам была абвешчана Юхноўская падманастырная слабада, а замест Касплі — сяло Духаўшчына. У 1796 годзе ўсе намесніцтвы былі перайменаваны ў губерні. У 1797 годзе, пасля чарговай адміністрацыйнай рэформы, Красны, Ельня і Духаўшчына былі пераўтвораны ў заштатныя гарады, а іх паветы далучаны да іншых паветаў Смаленскай губерні.

У 1802 годзе былое адміністратыўнае драбленне на 12 паветаў было ўзноўлена. Сярод паветаў Смаленскай губерні былі наступныя:

Павет	*Памер у кв. в.*
Бельскі	9674,8
Рослаўскі	5509,6

Парэцкі	5128,1
Ельнінскі	4319
Духаўшчынскі	3710,8
Юхноўскі	3593,8
Гжацкі	3447,9
Дарагабужскі	3357,5
Смаленскі	2824,2
Вяземскі	2722,7
Сычэўскі	2558,9
Краснінскі	2403,8

Акрамя падзелу на паветы, у той час існавала і драбленне на больш дробныя па памерах тэрытарыяльна-адміністратыўныя адзінкі: станы, воласці, акругі і «сельские общества».

У другой палове XIX — пач.XX стст. Смаленская губерня межавала на поўначы і паўночным ўсходзе з Цвярской, на ўсходзе — з Маскоўскай і Калужскай, на поўдні — з Чарнігаўскай і Арлоўскай, на захадзе — з Магілеўскай, Віцебскай і Пскоўскай губернямі.

У той час межы Смаленскай губерні ў крыніцах вызначаліся неаднолькава і, пэўна, самымі дакладнымі звесткамі будуць матэрыялы вайскова-тапаграфічнага дэпо, якія ацэньваюць плошчу губерні ў 49,073 кв.в.

Пасля прыходу да ўлады бальшавікоў, пачаўся злом старога дзяржаўнага апарата і, адпаведна, старога тэрытарыяльна-адміністрацыйнага падзелу Смаленскай губерні. Дэкрэтам СНК ад 27 студзеня 1918 г. «О порядке изменения границ губернских, уездных и прочих» зацвярджалася права, згодна якому мясцовыя саветы маглі самастойна ствараць новыя адміністрацыйныя ці эканаічныя адзінкі[3].

У верасні 1918 года была створана так званая Заходняя Камуна, у склад якой пераходзілі Віцебская, Магілёўская, Смаленская, Мінская, Віленская губерні з цэнтрам у Смаленску.

Тое адміністратыўнае дзяленне трывала непрацяглы час, бо ў мэтах ўпарадкавання адносінаў савецкіх органаў між сабой, 23 снежня 1918 г. УЦВК пастановай «Об областных объединениях» ствараласа часовае Заходне-Абласное аб'яднанне, у якое ўваходзіла і былая Смаленская губерня. Перад гэтым, на II з'ездзе Саветаў Заходняй вобласці, які адбыўся ў Смаленску 10-14 красавіка 1918 г., з Віцебскай, Магілёўскай, Мінскай і Смаленскай губерняў была створана агульная адміністрацыйная адзінка — Заходняя вобласць з цэнтрам у Смаленску.

У рашэнні з'езда было запісана, што губерні Смаленская, Мінская, Магілёўская і Віцебская, як губерні непрамысловыя, але геграфічна блізкія, натуральна імкнуліся адна да другой, утвараючы «адзінае цэлае — Заходнюю вобласць»[4].

Заходняя вобласць (з верасня па снежань 1918 г. — Заходняя камуна) з цэнтрам у Смаленску ўключала ў сябе 25 паветаў. З іх 12 паветаў Смаленскай губерніі, 8 паветаў Магілёўскай губерніі, 5 паветаў Віцебскай губерніі.

30-31 снежня 1918 г. у Смаленску адбылася VI Паўночна-Заходняя абласная партыйная канферэнцыя, якая абвясціла стварэнне самастойнай Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі, якая ахоплівала сабой і Смаленскую губерню. У пачатку студзеня 1919 г. рэспубліканскія партыйныя і савецкія органы БССР пераехалі са Смаленска ў Мінск. А ў сувязі са стварэннем 2 лютага 1919 г. Літоўска-Беларускай ССР Смаленская губерня была выведзена са складу Беларусі і зноў увайшла ў склад РСФСР.

У 1920-я гады смаляне церпяць пастаянныя перакройванні сваёй мяжы.

Згодна сакавіцкаму перапісу 1923 г., усяго насельніцтва паветаў Смаленскай губерні складала 2.272.358 чалавек, або 47 жыхароў на 1 вярсту. Сельскія жыхары аб'ядноўваліся ў 1150 сельсаветаў, якія былі найменшай тэрытарыяльна-адміністрацыйнай адзінкай ў рэгіёне.

Наяўнае насельніцтва гарадоў налічвала 170 973 асобы, якія пражывалі як у павятовых цэнтрах, так і галоўным горадзе губерні[5].

Згодна «Всесоюзной перепеси населения 1926 года» Смаленская губерня складалася з наступных паветаў:

1. Смаленскага
2. Бельскага
3. Вяземскага
4. Гжацкага
5. Дзямідаўскага
6. Дарагабужскага
7. Ельнінскага
8. Рослаўскага
9. Сычэўскага
10. Ярцаўскага

Параўнальна з 1922 г., колькасць паветаў скарацілася, бо ў сувязі з узбуйненнямі БССР і тэрытарыяльна-адміністрацыйнай перабудовай, Мсціслаўскі, Красненскі і Духаўшчынскі паветы былі скасаваны[6].

Паветы падзяляліся на воласці, прычым, шэраг былых воласцяў Віцебскай, Магілёўскай і Калужскай губерняў уваходзілі ў склад Смаленскай губерні, а потым і вобласці.

Тэрыторыя Смаленскай губерні ў 1926 г. заставалася той жа і гэтак жа кіравалася, як гэта было ў 1922 годзе. Так будзе да 1929 г., хоць заходнія межы з Беларуссю былі канчаткова ўсталяваныя яшчэ ў 1926 г[7].

Насельніцтва Смаленскай губерні ў 1926 годзе (2.292.589 чалавек) было на 2,64 % вышэй узроўня 1920 года.

Гарадское насельніцтва губерні ўзрасло толькі на 9,8% у параўнанні з 1923 годам. Гэта было некалькі ніжэй, чым у сярэднім па Расіі. Узятыя разам, усе гэтыя лічбы паказваюць вызначаныя тэндэнцыі за 1922-1926 гады. Росквіт стаў выяўляцца ў больш спакойнай атмасферы, якая ўсталявалася з канца 1922 года.

Рух армейскіх частак, як гэта было ў 1914-1921 гадах, спыніўся, а эканамічныя саступкі пачыналі аказваць сваё ўздзеянне на сялянства, адносная бяспека якога знаходзіла свой выраз у вельмі высокім узроўні нараджальнасці.

Так, у 1916 г. колькасць насельніцтва ў сялянскіх гаспадарках Смаленскай губерні складала 1.855.014 чалавек, 1923 г. — 1.972.799 чалавек, а праз год, 1924 г., ужо 2.078.669 сталага сельскага насельніцтва[8].

З іншага боку, адносна нізкі прырост насельніцтва горада Смаленска, дзе перапіс зафіксаваў 70.247 жыхароў абодвух палоў, казаў пра тое, што яго прамысловая база была яшчэ больш хісткай, чым у яго гіганцкага суседа на паўночным усходзе — Масквы.

На 1 ліпеня 1925 г. у губернскім цэнтры працавала ўяго толькі 3100 прамысловых працоўных, на якіх даводзілася 366 служачых[9].

У 1920-30-я гг. індустрыяльнае развіццё рэгіёна паўплывала на рост колькасці гарадскога насельніцтва. За перыяд з 1926 па 1939 г. яго прырост у Смаленскай вобласці склаў прыкладна 166–168%. Так, у 1926 г. у гарадах Смаленскай вобласці пражывала 270.466 чал. (9 % ад усяго насельніцтва), а ў 1939 г. — 448.044 адпаведна (16,7%). У 1920-30-я гг. інтэнсіўна развіваўся г. Смаленск, але ў цэлым у рэгіёне абсалютна пераважала сельскае насельніцтва.

Аднак у Магілёўскай вобласці яго ўдзельная вага ў канцы 1930-х гг. быў ніжэй і складаў 77,4%, тады як у Смаленскай — 89,5%.

Згодна «Усесаюзным перапісам насельніцтва 1926 г.», на Смаленшчыне ўдзельная вага рускіх складала 96,6%, адлюстроўваючы тым самым працэс асіміляцыі беларускага насельніцтва.

Як адзначаў В.М. Кабузан, частка беларускай этнічнай тэрыторыі, у тым ліку большая частка Смаленскай губерніі, аказалася ў складзе Расіі ў выніку асіміляцыйных працэсаў[10].

У разгляданы перыяд працэсы мадэрнізацыі на тэрыторыі беларуска-расійскага памежжа ўступалі ў стадыю развіцця. Нягледзячы на некаторае павелічэнне колькасці гараджан, абсалютная большасць насельніцтва пражывала ў сельскай мясцовасці і было занята ў аграрным сектары эканомікі. Пры несумнеўных поспехах узровень пісьменнасці і адукацыі насельніцтва яшчэ не адпавядаў запатрабаванням эканомікі і культуры. Па ўзроўні пісьменнасці і адукацыі сельскага насельніцтва яшчэ адставала ад гарадскога. Гэта ў значнай ступені стрымлівала і этнакультурныя працэсы ў рэгіёне.

Насельніцтва і этнічныя працэсы

Ужо ў другой палове XIX ст. у літаратуры вяліся спрэчкі наконт этнічнай прыналежнасці насельніцтва Смаленскай губерні. Значная колькасць даследчыкаў, грунтуючыся на асабістых даследаваннях, а таксама дадзеных статыстыкі і працах іншых навукоўцаў, адназначна залічалі Смаленскую губерню ў лік беларускіх. Так, І. Папоў у 1912 г. пісаў:

> «Четыре губернии, лежащие в бассейне верхнего Днепра и его притоков, по истокам Немана и верхнему течению Западной Двины, — Витебская, Смоленская, Могилевская и Минская, — отличаются от остальных губерний России по населению и условиям хозяйства: это так называемые белорусские губернии»[11].

Не рэдкімі былі і процілеглыя высновы: аўтар «Белорусского края» Г.П. Майкоў, напрыклад, прылічае да Беларусі толькі Віцебскую, Магілёўскую і Мінскую губерні[12].

Неадназначнасць пытання заўважаў і М. Доўнар-Запольскі. Ён пісаў:

«Смоленскую губ. совершенно несправедливо многие относят к центральным губ., между тем она, по устройству поверхности, географическому положению, почве и экономическому состоянию, а в особенности, по своему населению, как одна из Белорусских губ., несомненно, принадлежит к группе губ. Северо-западного края. Это признают и такие маститые знатоки России, как Семёнов и др.»

Такім чынам, праблема этнічнай прыналежнасці насельніцтва Смаленшчыны застаецца дыскусійнай як у XIX, так і ў XX стст.

Калі казаць пра II-ю палову XIX ст., то ў гэты час насельніцтва Смаленскай губерні падзяляюць на беларускае і вялікарускае, акрэсліваючы т.зв. «Великорусские» і «Белорусские» паветы. Паводле «Девятой ревизии», дадзеныя якой прыпадаюць на 1851 г., паветы Смаленскай губерні падзяляліся па этнічнай прыкмеце наступным чынам:

Великорусские:	*Белорусские:*
Вяземский	Смоленский
Юхновский	Рославльский
Ельнинский	Дорогобужский
Сычевский	Бельский
Гжатский	Духовщинский
	Поречьский
	Краснинский

Такія ж самыя дадзеныя дае «Сельскохозяйственная статистика Смоленской губернии», составленная Я. Соловьёвым:

«Смоленская губерния в этнографическом отношении делится на две неровные части. К первой принадлежит северо-восточный угол губернии, то есть уезды: Вяземский, Юхновский, Гжатский, Сычевский и Бельский, с народонаселением великорусским. Все остальные уезды, стало быть, большая часть общего пространства губернии, населены жителями Белорусского племени»[13].

Аналагічна вызначаюць этнаграфічную прыналежнасць паветаў Смаленшчыны і «Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба», выдадзеныя ў 1862 годзе:

«…в этнографическом отношении, Смоленская губерния может быть разделена на две части. К первой принадлежит северо-восточный ее угол, уезды: Вяземский, Гжатский, Сычевский, Юхновский и большая часть Бельского, с населением Великорусского племени; ко второй принадлежат уезды: Смоленский, Краснинский, Духовщинский, Дорогобужский, Ельнинский, Рославльский и Поречьский, составляющие большую часть губернии с населением Белорусским»[14].

С. Максімаў указваў на геаграфічную адмежаванасць абодвух славянскіх народаў па водападзельным ўзвышшы «...где берут начало реки в одном только направлении в Днепр при посредстве Десны и Сожа». Водападзел быў «сустрэчным пунктам» вялікарускіх палехаў і смаленскіх беларусаў Рослаўскага, Ельнінскага і Смаленскага паветаў. Даследчык пісаў: «... рассмотренный теперь водораздел делит Смоленскую губернию на две части. В восточной остаются уезды Сычевский и Вяземский, и если мы присоеденим к ним Гжатский и Юхновский и восточную (наибольшую) часть Бельского, то таким образом отделим великорусскую Смоленщину. Затем уже всё остальное, далеко за политическую границу губернии, будет Белоруссия».

Паводле Максімава, Вязьма ўжо была «несомненно-великорусского» характара. Смаленск для Максімава выступаў у ролі «коренного белорусского города, главной столицы Кривичей, — Смоленска»[15].

Характэрнай рысай беларускіх паветаў з'яўлялася нізкая шчыльнасць насельніцтва ў параўнанні з вялікарускімі паветамі. Даследчыкі Д. Шэндрык і М. Доўнар-Запольскі выдзяляюць Вяземскае згушчэнне (чатыры ўсходніх павета Смаленскай губерні), якое служыла непасрэдным заходнім працягам маскоўскай густой паласы вялікарускага насельніцтва.

Паводле «Первой всеобщей переписи населения Российской империи 1897 г.» агульная колькасць мясцовых жыхароў, якія паказалі сваёй роднай мовай беларускую, складала 110 757 чалавек, або 6.61 % ад усяго ліку насельніцтва[16].

Менавіта Перапіс 1897 г. праводзіў тоўстую рысу пад спрэчкамі вакол этнічнага аблічча Смаленшчыны, якія не суціхалі ў навуковай літаратуры напрацягу цэлага стагоддзя.

У тячоме XL, які аналізаваў дадзеныя па Смаленскай губерні, рэдактары адмыслова падкрэслівалі: «Таким образом Смоленская губерния может быть причислена по своему этнографическому составу к губерниям великорусским, но никак не белорусским, так как великоруссы более чем в 13 раз превосходят численностью белоруссов»[17].

Згодна дадзеным 1897 г., вялікарусы складалі 91.65% усяго насельніцтва губерні, а беларусы, якіх у параўнанні з 1860-мі гадамі стала ў 7 разоў менш, у асноўным былі засяроджаны ў Красненскім павеце, дзе яны налічвалі каля 90% жыхароў.

Па ўсёй губерні было запісана 947 826 беларусаў, галоўным чынам у заходніх паветах: Бельскім, Дарагабужскім, Ельнінскім, Красненскім, Рослаўскім і Смаленскім[18].

Гэтыя лічбы адлюстроўваюць этнічныя працэсы, якія праходзілі на Смаленшчыне асабліва актыўна з 1860-х гг. разам з мадэрнізацыяй эканомікі і сацыяльнай рэальнасці. Статыстычныя сведкі даказваюць адсутнасць беларускай свядомасці сярод вяскоўцаў, якія паступова пераходзілі на рускую мову, і, адпаведна, былі залічаны ў лік вялікарусаў.

Яшчэ з канца 17 ст. беларускае насельніцтва бесперапынна жыло ў цеснай сувязі з вялікарусамі, што нароўні з праваслаўным веравызнаннем і слабасцю эканамічнага развіцця ўплывала на неакрэсленасць ў беларусаў нацыянальнай свядомасці: «... одним словом — на этих окраинах естественным образом обликом Белорусского племени не мог окончательно и целиком выказаться,

и соседи, так сказать, сами ещё не разобрались между собою. Скажем больше: они ещё сами себя не спознали в смысле самостоятельной племенной группы».

Трэба зазначыць, што вельмі складанай задачай з'яўляецца вызначэнне пэўнага этнасу, асабліва на яго этнічных межах. Гэта патрабуе ўсебаковага этнагеаграфічнага і параўнальнага этналінгвістычнага аналізу, уліку цэлага комплексу вызначальных прыкмет[19].

Яшчэ не існуе адзінага погляду на тое, які элемент(-ы) з'яўляецца галоўным у вызначэнні этнасу. Адным з пунктаў гледжання з'яўляецца тое, што найгалоўнейшым прызнакам этнасу з'яўляецца мова, асабліва ў даіндустрыяльны перыяд развіцця грамадства. Менавіта лінгвістычны аналіз быў характэрным для вызначэння рассялення славянскіх народаў у XIX ст., уключаючы беларусаў.

Яшчэ ў 1875 г. А.Ф.Рыцціх у сваёй «Этнографической карте Европейской России» вызначае тэрыторыю на захад ад Дарагабужа і на ўсход ад яго, на захад і поўдзень ад Вязьмы, на захад ад Рослаўля, а таксама Парэчча і Смаленскі павет як беларускую этнічную тэрыторыю. Яшчэ раней, у 1863 г., Р.Ф.Эркерт таксама ўключаў тэрыторыю Смаленшчыны ў арэал беларускіх гаворак.

Найбольш жа грунтоўнымі даследаваннямі беларускай моўнай мяжы з'яўляюцца працы акадэміка Я.Карскага і т.зв. «Опыт диалектологической карты русского языка в Европе» пад рэдакцыяй Дурнаво, Сакалова і Ушакова.

Яўхім Карскі адзначаў, што ў Смаленскай губерні беларусы жывуць побач з вялікарусамі. Ён падкрэслівае, што беларуская мова мае шмат агульнага з паўднёвавялікарускай гаворкай, і таму вызначэнне мяжы між рускім насельніцтвам і беларусамі вельмі праблематычнае. Акадэмік вызначае наступные рысы беларусаў:

1). Лад жыцця;

2). Светапогляд і народная паэзія;

3). Моўныя рысы.

Прычым моўныя рысы ў вызначэнні Карскага будуць самымі галоўнымі.

Наконт гаворак беларусаў Я.Ф. Карскі адзначае: «В Смоленской губернии граница белорусского племени идёт по меже между уездами Дорогобужским и Бельским, с одной стороны, и Юхновским, Вяземский и Сычевским — с другой; причём большая часть губернии населена белорусским племенем и лишь четыре восточных уезда (Юхновский, Вяземский, Сычевский и Гжатский) принадлежат южновеликорусскому наречию. Вообще, к востоку от Смоленска по железным дорогам (которых здесь много) белорусская речь уступает место великорусской, как это удалось мне наблюсти лично».

Такім чынам, Карскі залічае Бельскі, Дарагабужскі, Ельнінскі, Краснінскі, Парэцкі, Рослаўскі, Смаленскі паветы у лік тэрыторый, дзе дамінуе ці гучыць беларуская мова.

У адносінах да паўночных і ўсходніх межаў, Карскі і аўтары складзенага Маскоўскай дыялекталагічнай камісіяй «Опыта диалектологической карты русского языка в Европе» мелі пэўныя разыходжанні. «Опыт» адводзіць на поўначы для беларускіх гаворак толькі самую паўднёва-заходнюю частку Ржэўскага павета былой Цвярской губерні. Далей лінія праводзіцца амаль па самай мяжы былой Смаленскай губерні з Асташкаўскім паветам Цвярской

губерні і Таропецкім паветам Пскоўскай губерні, трохі адступаючы ад яе на поўдзень і паўднёвы ўсход.

Яўхім Карскі прасоўвае гэтую мяжу на поўнач. Ён лічыць, што беларускія пасяленні пачынаюцца ля г. Зубцова і цягнуцца па правым беразе Волгі (Малады Туд), дзе жывуць тудаўляне, заходзячы часам на левы бераг яе (па р. Ітамле ў Ржэўскім павеце і р. Малай Кошы ў Асташкаўскім павеце).Затым беларуская лінгвістычная мяжа падыходзіць да вытокаў Волгі і Заходняй Дзвіны.

Даследчык піша, што больш чыстая мова «лишь на западе, напр., в Боровке, Холмеце, Васильевском. По речьке Итомле встречаются лишь отдельные белорусские черты».

Усходняя мяжа паводле «Опыта» ляжыць па р. Вазузе, пачынаючы ад мяжы Сычэўскага павета былой Смаленскай губерні з Зубцоўскім паветам былой Цвярской губерні, далей праз Вяземскі, Дарагабужскі паветы па мяжы апошняга з Юхноўскім, праз Ельнінскі павет былой Смаленскай губерні і Масальскі павет былой Калужскай губерні на р. Болву, па р. Болве, прыкладна да перасячэння ёю мяжы Бранскага павета з Жыздрынскім, і далей у паўднёва-заходнім напрамку да мяжы Бранскага павета з Трубчэўскім, недалёка ад мяжы іх з Мглінскім паветам былой Чарнігаўскай губерні.

Карскі лічыў гэтую мяжу недакладнай і перабольшваючай беларускую тэрыторыю.

У прынцыпе, разыходжанні паміж Карскім і аўтарамі «Опыта диалектологической карты русского языка в Европе» не змяняюць асноўнай высновы, што тэрыторыя Смаленшчыны ўваходзіць у беларускі лінгвістычны арэал.

У міжваенны тады яшчэ захоўваўся беларускі лінгвістычны арэал губерні. Так, у 1919 г. Яў. Канчар у артыкуле «Территория и население Белоруссии» сцвярджае, што «белорусское племя» займае Смаленскую губерню (п. Смаленскі, Бельскі, Вяземскі, Гжацкі, Дарагабужскі, Духаўшчынскі, Ельнінскі, Краснінскі, Парэцкі, Рослаўскі, Сычэўскі, Юхноўскі), нават перабольшваючы сапраўдную колькасць беларускіх паветаў, уключаючы ў іх лік вялікарускія Гжацкі, Сычэўскі, Бельскі, Вяземскі, Юхнаўскі паветы.

Вельмі важнымі даследваннямі з'яўляюцца даследванні Паўла Растаргуева, якія праводзіліся ім і ў 30-я гг.XX ст.

Так, экспедыцыя П. Растаргуева, якая праводзілася летам 1931 г., павінна была высветліць паўночна-ўсходнія межы беларускіх гаворак Смаленшчыны. Даследчык даследваў в. Свістуноў Бахараўскага сельсавета Ржэўскага павета, адзін з пунктаў, які ляжыць на поўдзень ад мяжы, якая была прыведзена ў «Опыте», і к поўначы ад мяжы Я.Ф. Карскага. Растаргуеў зыходзячы з вынікаў даследвання схіляецца да мяжы, прыведзенай у першай крыніцы.

Ён таксама прымае дадзеныя «Опыта» ў адносінах усходняй мяжы ў былых паветах Вяземскім, Сычэўскім, Дарагабужскім, Масальскім, Жыздранскім. Дзеля гэтага, аўтарам быў сабраны матэрыял пунктаў на захад ад гэтай мяжы (Міцева, Іздзешкава) і на ўсход ад мяжы Я. Карскага (Вялічава, Царава-Займішча).

Трэба дадаць, што ў XIX–XX ст. шмат якія этнаграфічныя карты фіксуюць дадзеную вышэй беларуска-вялікарускую моўную мяжу. Адзначым карты прафесара Т. Фларынскага, «Этнографическую карту славянского мира» Нідэрле,

карту Дытрыха Шэфера, Я. Станкевіча і інш., якія адлюстроўваюць моўную сітуацыю ў дадзены перыяд. Цікава і тое, што яшчэ ў 1958 г. «Этнография народов СССР» падавала межы беларускага насельніцтва на тэрыторыі Смаленскай вобласці РСФСР.

Зноў падымаючы пытанне аб такім панятку як «этнас», трэба адзначыць, што мова з'яўляецца адным з найгалоўнейшых элементаў этнаса, але не адзіным (возьмем культуру, самасвядомасць, агульнасць паходжання, тэрыторыю і інш.). У вызначэнні нацыянальнага складу насельніцтва памежных тэрыторыяў, як у выпадку са Смаленшчынай, трэба разглядаць матэрыяльную культуру рэгіёна. Мова і матэрыяльная культура маюць паміж сабой непасрэдную сувязь. Гэта сувязь павінна існаваць нават у тых рэгіёнах, дзе існуе уплыў чужых культураў.

Матэрыяльная культура ўвасабляецца ў шматлікіх элементах: пабудовах, вопратцы, хатнім начынні і інш.

Аналізуючы вопратку Смаленскай губерні, заўважым, што амаль усе аўтары XIX ст. адзначаюць, што элементы вопраткі былі яшчэ адным этнічным маркерам, што адрознівалі беларуса ад вялікаруса. Этнаграфічная разнастайнасць смаленскай губерні лепш за ўсё захаваўся ў жаночым народным касцюме, як найбольш захаваўшайся частцы матэрыяльнай культуры[20].

Максімаў падкрэсліваў, што «... на еженедельных торжествах в городе Смоленске, белые магерка и свита уже очень приметны ». Прычым адбывалася змяшэнне беларуска-вялікарускіх элементаў у вопратцы, што звязана з запазычаннямі ў вялікарускага насельніцтва пэўных элементаў вопраткі і, увогуле, памежнымі ўзаемаўплывамі абодвух народаў. Той жа Максімаў піша:

> «... та же встреча обуженного кверху колпака с великорусской шляпой гречневиком и с торчащими, в защиту от солнца, полями происходит на всех базарах калужского полесья и даже на ярмарке в Дорогобуже».

У Ельнінскім павеце быў шырока распаўсюджаны «саян» — жаночая вопратка, якая складалася са спадніцы і ліфа і напамінала сабой сарафан.

Лічыцца, што саян складаўся на аснове «андарака» і «шнуроўкі», якія маюць больш ранні характар. Этнограф Лебедзева адзначала, што на Смаленшчыне змена андарака і шнуроўкі саянам адбылася ў пачатку XX ст. (у с. Бярозаве, Ханіне і інш.).

Побач з андаракам, на тэрыторыі Смаленшчыны мелася і панёва. Мяжа між панёвай і андаракам пралягае па р. Угры.

Мяжа паўднёвавялікарускага касцюма (кашуля з касымі полікамі, панёва з трох полкаў на гашніку, тунікападобны фартух «запон», падшываная палатняная кічка з бісерным падпатыльнікам, шыйныя пацеркі, пушкі для вушэй, касаваротка і інш.) ішла па вярхоўях Угры, р. Прысмара, вёсцы Дуброўка і Грабаўка і ў былой Жырацінскай воласці. На захад ужо вызначаецца беларускі касцюм: белыя зіпуны, саян, валяныя белыя капелюшы, лубковыя дзявочыя капелюшы, сеткі жаночых галаўных убораў.

Што тычыцца жылля сялян Смаленскай губерні, то яно не мела агульнага плана. На тэрыторыі дадзенай губерні зафіксаваныя планы жылля: беларускі, паўднёварускі, сярэднярускі. У некаторых раёнах фіксуецца некалькі слаёў

жылля: самы першы і стары — беларускі тып; паўднёварускі слой, які напластоўваецца на першы, і потым самы новы — гарадскі тып.

Сярэднерускі план жылля сустракаецца у былым Сычэўскім павеце, ідзе па р. Вазузе, праз Вяземскі і Дарагабужскі паветы да р. Угры. На поўдзень ад Угры ідзе паўднёварускі план праз сёлы Весялуху, Гняздзілава, Паўлінава і Добрыцу на р. Прысмару, далей па рэках Прысмары і Дзясне на вёскі Снопаць, Рагнедзіна і далей да раз'езду Сешча на чыгункі Полацк — Смаленск — Марыупаль. На захадзе ад р. Дзясны паўднёварускі план жылля перамяжаецца з беларускім; беларускі тып прысутнічае ў сяле Жарна на р. Жарне, у 27 км. ад Ельні, але толькі ў старых хатах, у той час у новых — план паўднёварускі, у в. Шчыпань пакрываючы слой — агульны з беларускім; у сёлах Траянавай слабадзе і Рагнедзіне таксама беларускі план; у с. Волкава- Ягор'е былога Ельнінскага павета, на мяжы з былым Смаленскім паветам, у больш новых хатах план- паўднёварускі, але ў старых хатах план беларускі; у в. Ханіна сустракаецца план хаты з паўднёварускімі рысамі, але ўстойліва прасочваецца беларускі план. Таксама ў былым Вяземскім павеце сустракаецца беларускі план; беларускі план вызначаны ў былым Красненскім (с. Бярэжня, Міхейкава) і Духаўшчынскім паветах, у былым Бельскім павеце перакрыжоўваюцца беларускі і сярэднярускі план жылля.

Дабавім тое, што шмат нам дае тэрміналогія прадметаў матэрыяльнай культуры. На тэрыторыі Смаленшчыны і зараз бытуюць такія назвы як «кут», «покут», «кутны угал». Слова «кут» вызначана на Рослаўшчыне, Смаленшчыне, тэрыторыі былога Ельнінскага павета. Тое ж тычыцца і назваў пабудоў, звязаных з культурай зерневых хлябоў. На Смаленшчыне сустракаюцца побач такія назвы як «гумно», «овін», «еўня». Прычым, калі першыя дзве назвы сустракаюцца і ў паўднёварусаў, і ў сярэднярусаў, і ў беларусаў, то апошняя назва — выключна беларуская. Яна сустракаецца ў былых паветах Сычэўскім, Ельнінскім, Рослаўскім.

Для Смаленскіх вёсак характэрная і вялікая колькасць беларускіх словаў, што абазначаюць прадметы матэрыяльнай культуры.

Таксама ідэнтычнасць смаленскіх і беларускіх элементаў лексікі характэрна да сялянскіх прозвішчаў і мянушак.

Такім чынам, супастаўляючы між сабой этналінгвістычную карту Смаленшчыны і геаграфію прадметаў матэрыяльнай культуры, можна сцвярджаць, што яны шмат у чым супадаюць, што паказвае разам з астатнімі дадзенымі, у тым ліку гістарычнымі і статыстычнымі, на беларускі характар значнай часткі Смаленскай губерні.

У 1920-я гг. для беларускага насельніцтва паўднёва-заходняй Смаленшчыны быў характэрны высокі ўзровень ідэнтыфікацыі з чужой этнічнай групай, якой з'яўлялася вялікарускае насельніцтва рэгіёна. На вывучаемай тэрыторыі дамінавала, хоць і не была абсалютнай, так званая монаэтнічная ідэнтычнасць з чужой этнічнай групай. Гэта было галоўным чынам звязана з больш высокім эканамічным, сацыяльным і культурным статусам вялікарускага насельніцтва вобласці. Непасрэдным вынікам ідэнтыфікацыі з вялікарускім насельніцтвам сталі этнагэнетычныя працэсы культурнай і моўнай асіміляцыі мясцовых беларусаў.

У сувязі з гэтым, трэба адзначыць значную колькасць вялікарускага насельніцтва ў рэгіёне, суседства вялікарускіх этнічных масіваў і, што вынікае, працэсы метысацыі насельніцтва ў змяшаных шлюбах. Моўная асіміляцыя выяўлялася ў непрыстыжнасьці беларускай мовы і паступовай страце мовы мясцовага насельніцтва беларускіх кампанентаў і «калябанні» моўных рысаў па шляху стабілізацыі рускіх з'яў у вобласці гукаў, формаў, сінтэксісу і слоўнікавага складу гаворак[21].

Яшчэ ў дарэвалюцыйны час смаленскімі сялянамі выказваліся патрабаванні да настаўнікаў, каб яны звярталі ўвагу і сачылі за мовай вучняў, прывіваючы ім «маскоўскае» вымаўленне. У 1920-я гг. сітуацыя практычна не змянілася, а, наадварот, у выніку інтэнсіфікацыяй мадэрнізацыйных працэсаў, моўная асіміляцыя ахапіла ўсё большую колькасць людзей.

Да прыкладу, у 1932 справаздача па беларусізацыі ў Манастыршчынскім раёне сведчыла: «... коренизация школ за 5 лет ощутимых результатов не дала, так как разговорный язык местного населения не является белорусским, а нечто среднее»[22]. За чатыры гады да таго, у дакладзе пра палітасветсетку Смаленскай губерні адзначалася, што «... беларускае насельніцтва, у большасці сваёй, ставіцца [да мовы] індыферэнтна. Бываюць выпадкі актыўнага процідзеяння арганізацыі школ на роднай мове»[23].

Крыніцы сведчаць, што сярод мясцовых беларусаў у 1920-я гг. адбывалася і змена элементаў традыцыйна-бытавой культуры: быт вяскоўцаў, іх вопратка, прылады працы, посуд, хатняе начынне набываюць вялікарускі вясковы ці мяшчанскі характар. Напрыклад, у раёнах Смаленшчыны па рэках Жарне і Дзясне стары беларускі тып жытла перакрываўся больш новым — паўднёварускім, а часам і жытлом гарадскога тыпу[24].

Не такой пашыранай, але існаваўшай мадэллю этнічнай ідэнтычнасці беларусаў, была і монаэтнічная ідэнтычнасць, якая супадала з сапраўднай этнічнай прыналежнасцю вяскоўцаў. Да нашых дзён захаваліся дакументы, якія адлюстроўваюць наяўнасць беларускай ідэнтычнасці ў жыхароў Смаленскай вобласці. Так, пасля ўзбуйнення БССР у 1924 годзе, тыя жыхары Смаленшчыны, што былі прыпісаны да Смаленскай вобласці РСФСР, але лічылі сябе беларусамі, адсылалі прашэнні ў ЦВК БССР аб далучэнні іх вёсак да Беларусі. Жыхары вёсак Вялікі Рай, Малы Рай і Свірыдаўка Бахоцкай воласці пісалі:

> «...Собравшись сего числа (1924 г., марта 30 дня) на общий сход и обсудив вопрос о присоединении нас к Великороссии, решили: ввиду того, что мы искони принадлежали к нации белорусов, каковыми были наши прадеды, отцы и деды...Узнав, что наши деревнии отходят к Смоленскому уезду, следовательно к Великороссии, в нас пробудились национальные чувства — жажда присоединения к родному краю, в котором мы родились и желаем умереть, защищая наше национальное право»[25].

Аналагічна выказваліся сяляне Шышкоўскага раёна Бахоцкай воласці, матывуючы сваё жаданне далучыцца да БССР тым, што яны не жадалі «отстать от своей национальности и своего коренного белорусского языка». Тая з'ява прыняла масавы характар і ахапіла шырокія тэрыторыі памежных вёсак. Тлумачэнне такога ўсплёску нацыянальнай свядомасьці і беларускай ідэнтычнасці

цяжка тлумачыць адной блізкасцю Беларусі як нацыянальнага цэнтра ці нейкай адной прычынай.

Верагодна, на такую з'яву аказалі ўплыў наступныя фактары:

1) суб'ектыўныя, якія выражаліся ў тым, што размежаванне прывяло да штучнага падзелу рэгіёна, то бок людзі пакінулі сваіх родных, знаёмых, эканамічных партнераў за межамі рэспублікі (напрыклад, Аслянская воласць была падзелена папалам між РСФСР і БССР);

2) сацыяльна-эканамічныя, якія маглі ўздзейнічаць на памежнае насельніцтва ў сувязі з лепшым узроўнем жыцця ў БССР, бо, напрыклад, на той час стаўкі заработнай платы для 1 разраду ў Смаленскай губерні раўняліся 4 рублям, а ў суседніх паветах Беларусі — 7 рублям[26];

3) палітычныя, якія маглі выражацца ў недаверы да мясцовых і рэспубліканскіх уладаў (на Смаленшчыне былі зафіксаваны і сялянскія хваляванні) і, адпаведна, адлюстроўвацца на жаданні жыхароў увайсці пад юрысдыкцыю іншага рэспубліканскага ўраду. Да таго ж, не трэба забывацца на наяўнасць у губерні нацыянальнай беларускай інтэлігенцыі, як мясцовай, так і прыезджай з БССР, і звязаны з ёй

4) асветна-мабілізацыйны фактар, які выяўляўся ў «абуджэнні» этнічнай ідэнтычнасці беларускай перыферыі. Напрыклад, вядома, што сярод студэнтаў так званага Беларускага зямляцтва ў Смаленску, якое дзейнічала ў 1920-я гг., ураджэнцы Смаленскай губерні складалі каля 20% ад ліку усіх яго членаў[27].

У мясцовай адміністрацыі і сістэме адукацыі былі нацыянальна свядомыя кадры, якія гуртаваліся вакол Беларускай секцыі Смаленскага аддзела народнай адукацыі і вакол беларускіх школаў губерні. Мабілізацыйна-асветная праца дала свой плён і былі прыклады, калі навучэнцы ахвотна займаліся на беларускай мове, а беларуская школа мела аўтарытэт. Праўда, такіх школ было ў параўнанні з іншымі мала.

Грунтуючыся на няпоўным шэрагу крыніц, цяжка зафіксаваць наяўнасць на тэрыторыі Беларускай Смаленшчыны іншых формаў этнічнай ідэнтычнасці, такіх як біэтнічная і маргінальная этнічная ідэнтычнасці, якія з'яўляюцца паняткамі больш прыватнага, чым групавога характару і патрабуюць дадзеных складаных псіхалагічных тэстаў-анкет, якіх, на вялікі жаль, няма. Тым ня меньш, можна з упэўненасцю сцвярджаць, што ў вывучаемым рэгіёне, у тым ліку, у раёнах, якія зараз знаходзяцца ў складзе Расеі, у 1920-я гг. беларуская самаідэнтыфікацыя мясцовага насельніцтва мела месца, хоць і ў абмежаваных формах.

Дзейнасць беларускіх нацыянальна-культурных арганізацый Смаленскай губерніі (1920–1930-я гг.)

Смаленшчына ўключылася ў ажыццяўленне беларускага нацыянальнага праекту амаль адразу з іншымі тэрыторыямі Беларусі. На I Усебеларускім кангрэсе прысутнічалі дэлегаты выбранныя з'ездам Смаленскай губерні. Асноўная маса гэтых дэлегатаў, з'яўляючыся галоўным чынам членамі Беларускага Абласнога Камітэта, выступала за культурную аўтаномію і стварэнне асобнай беларускай вобласці ў рамках Расіі[28].

Адначасова з Усебеларускім з'ездам ваенныя беларускага паходжання сабраліся на з'езд ваеннай акругі ў самім Смаленску. Удзельнікі гэтага з'езда перадалі ў прэзідыюм з'езда і Беларускі цэнтральны вайсковы камітэт дэкларацыю, у якой гаварылася аб падтрымцы аўтаноміі Беларусі ў саюзе з федэратыўнай расійскай рэспублікай, а таксама выказваліся патрабаванні аб стварэнні беларускай арміі[29].

У сувязі з нежаданнем камандавання Заходняга фронту фармаваць беларускія часткі, працэс іх арганізацыі пачаўся па-за межамі яго ўплываў. У Смаленску акруговы з'езд беларусаў-вайскоўцаў прыняў рашэнне аб стварэнні ў гэтым «старадаўнім беларускім горадзе» I Смаленскага беларускага палка шляхам папаўнення беларусамі 322-й Віцебскай дружыны[30].

У Смаленск прыязджаюць актывісты беларускага руху, а сярод іх і Фабіян Шантыр, які збіраўся арганізаваць партыю левых эсэраў. На першы усегарадскі ўстаноўчы сход новай партыі сабралося каля 100 чалавек. Ф. Шантыр быў абраны старшынёй, а Гаўрыла Гарэцкі, брат пісьменніка Максіма Гарэцкага, сакратаром сходу, які так не адбыўся. Пасля адмовы ўдзельнікаў сходу выкарыстоўваць беларускую мову як працоўную, Шантыр і Гарэцкі пакінулі яго.

Неўзабаве з Петраграда ў Смаленск прыехаў Алесь Чарвякоў, які меў на мэце стварыць беларускую секцыю РКП, але справа скончылася безвынікова[31].

У лютым 1918 г., калі пад нямецкай акупацыяй апынулася амаль уся Беларусь, пад савецкай уладай заставалася уся Смаленская губерня. У Смаленску размяшчаўся эвакуяваны з Менску Выканаўчы камітэт заходняй вобласці і фронту.

1 студзеня 1919 г. у Смаленску было абвешчана стварэнне Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, у склад якой увайшла большая часка Смаленшчыны. Ужо праз два тыдні пасля абвяшчэння ЦК РКП(б) вырашыў вылучыць Смаленскую губерню з новастворанай рэспублікі.

Працэс станаўлення органаў кіравання адукацыяй і культурай на тэрыторым Заходняй вобласці (Заходняй Камуны) прайшоў некалькі этапаў. На першым этапе, стаў вызначальным для часткі тэрыторый былых Смаленскай, Калужскай, Бранскай, Цвярской, а таксама беларускіх губерняў, адбываўся парцэс стварэння структурных формаў губернскіх, павятовых і валасных аддзелаў народнай адукацыі, якія фактычна адказвалі за ўсю адукацыйную і культурна-асветніцкую працу.

Выканаўчы камітэт Заходняй вобласці арганізаваў аддзел народнай адукацыі, які ўвайшоў у склад аблвыканкама самым апошнім — 30 красавіка 1918 г[32].

Паўсядзенную працу абласнога аддзела народнай адукацыі значна ўскладняла частая змена або адсутнасць спецыялістаў, бо штаты амаль усіх пададдзелаў былі недакамплектаванымі.

Пастанова арганізаваць пры Смаленскім ГВК нацыянальныя аддзелы: яўрэйскі,польскі, латышскі, беларускі — выконвалася нераўнамерна. Былі прызначаны загадчыкі ўсіх аддзелаў, апрача беларускага, які існаваў толькі на паперы.

Да ліку культурна-асветных устаноў губерніі адносіліся хаты-чытальні, бібліятэкі, лікпункты (пункты па ліквідаці непісьменнасці і малапісьменнасці), у гарадах — клубы, школы дарослых падвышанага тыпу і іншыя[33].

У 1921–1922 г. нацыянальная праца на Смаленшчыне праводзілася слаба, «бо на ўсёй тэрыторыі дадзенага рэгіёна не былі арганізваны беларускія аддзелы». Па інфармацыі беларускага Наркамата асветы, ў рэгіёне функцыянавалі толькі хоры, гурткі і тэатральныя трупы аматараў[34].

Гледзячы на гэта, у 1921 годзе па ініцыятыве ўрада БССР пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай адукацыі была заснавана Беларуская секцыя ў складзе трох членаў і двух кандыдатаў. Яна працавала ў губерні з перапынкамі ў 1922–23 і 1925–27 гг., непасрэдна падначальвалася Беларускаму цэнтральнаму бюро пры народным камісарыяце асветы РСФСР і Саўнаркаму пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай адукацыі, займаючыся арганізацыяй на тэрыторыі Смаленскай губерні нацыянальных школ, клубаў, іншых культурна-асветных устаноў для беларускага насельніцтва.

Так, у 1923 г. часопіс «Крывіч», рэдактарам якога быў В. Ластоўскі, сведчыў: у канцы жніўня і ў пачатку верасня ў Смаленскай губернскай цэнтральнай бібліятэцы адбылася выстава беларускага друку — тых кніг і часопісаў, якія, з вялікімі цяжкасцямі былі сабраны Беларускай губернскай секцыяй. Выстава дала смалянам шмат цікавага, бо большая частка іх нават не ведала, што ў беларусаў ёсць свае кніжкі. «Пасля выстаўкі аб'явілася шмат жадаючых пачытаць што-небудзь беларускае, асабліва гэта прыметна сярод моладзі»[35].

Але ключавым пытаннем для беларускай меншасці становіцца ў першую чаргу пытанне школьнай адукацыі на роднай мове. У ліпені 1923 г. у Смаленску была сабраная міжведамасная нарада, на якой абмяркоўвалася праблема беларусізацыі губерні ў цэлым і беларускага школьніцтва ў прыватнасці. Удзельнікамі мерапрыемства было выказана пажаданне аб стварэнні у губерні беларускага школьніцтва, але з улікам згоды на тое самога насельніцтва.

Спачатку пад кіраўніцтвам загадчыка секцыі Мікалая Агейчыка праводзілася работа па выяўленні і даследаванні раёнаў кампактнага пражывання беларусаў на тэрыторыі губерні. Гэтыя захады мелі за мэту вывучэнне мэтазгоднасці выкладання беларускай мовы ў школах і установах, рэгістрацыю настаўнікаў, якія ведалі беларускую мову. Беларуская секцыя праводзіла падбор кандыдатаў на Цэнтральныя беларускія настаўніцкія курсы пры Наркамаце РСФСР у Мінску.

Ігнараванне органамі Смаленскага губернскага аддзела народнай асветы і губернскім партыйна-савецкім кіраўніцтвам працэсаў нацыянальнага самавызначэння беларусаў на Смаленшчыне прывяло да ліквідацыі Беларускай секцыі паводле пастановы губернаскага аддзела народнай асветы ў чэрвені 1923 г.

Увогуле, Смаленскі губернскі савет пры падтрымцы першага скаратара ЦК КП(б)Б і намесніка наркамасветы П.І. Валасевіча актыўна выступаў за адлучэнне ад Беларусі шэрагу раёнаў і далучэння іх да Смаленскай губерні РСФСР[36].

Беларусізацыя школы пачалася фактычна ў 1926-1927 вучэбным годзе, пасля таго, як пасля настойлівых захадаў Наркамата РСФСР, дзейнасць Беларускай скцыі была адноўлена.

У 1925/26 навучальным годзе былі адкрыты першыя 2 беларускія школы і 2 пункты па ліквідацыі непісьменнасці. Летам 1926 г. пры секцыі была арганізавана беларуская метадычная камісія на 1926/1927 навучальны год на чале з загадчыкам секцыі Усеваладам Ганчаровым. Былі распрацаваны вучэбныя праграмы для школ па беларускай мове, геаграфіі, гісторыі, а таксама праведзены губернскія летнія курсы беларускіх настаўнікаў.

Ужо праз год беларускіх школ першай ступені ў губерні было 36, павышаных — 4.

Пад кіраўніцтвам секцыі з 1926/27 навучальнага года ў Руднянскім, Рослаўскім, Манастыршчанскім і Шумяцкім паветах працавала 21 беларуская школа, дзе навучаліся 652 вучні, а таксама гурток па вывучэнні беларускай мовы ў Заходнім упраўленні сувязі.

У 1927/28 научальным годзе колькасць падкантрольных секцыі школ выросла да 37.

Аднак з прычыны нястачы матэрыялных сродкаў пастановай губернскага аддзела народнай асветы восенню 1927 г. Беларуская скцыя была ліквідавана.

Функцыі нацыянальных секцый і кіраўніцтва нацыянальнымі школамі былі перададзены інспектару па справах нацыянальных меншасцяў губернскага аддзела народнай асветы.

У 1929 г. было адкрыта беларускае аддзяленне пры Собалева-Вараб'ёўскім педтэхнікуме, а таксама было вырашана пытанне аб арганізацыі педухіла ў Руднянскай беларускай дзевяцігодцы. У 1932 г. у апошняй на школьным, дашкольным і падрыхтоўчым аддзяленнях навучалася 143 асобы. Беларускае аддзяленне працавала і пры Клінцоўскай Саўпартшколе, а таксама Смаленскім педрабфаку[37].

Рэальнае становішча беларускамоўнай адукцыі не было лёгкім. Вельмі часта настаўнікі беларускіх школ не мелі педагагічнай адукацыі і, больш за тое, не валодалі літаратурнай беларускай мовай. Слабая матэрыяльна-тэхнічная база, адсутнасць сродкаў і частыя пратэсты сялян супраць беларускай школы адмоўна ўплывалі на нацыянальнае асветніцтва ў краі.

Таму ў 1934 г. пачынаецца наступ на беларускую школу і перад самым пачаткам заняткаў «...ввиду того, что ряд белорусских школ...фактически работает на русском языке, вследствие отсутствия базы для их коренизации, и, учитывая требования населения», на рускую мову пераводзяцца некаторыя школы Невельскага, Руднянскага і Гардзееўскага раёнаў[38].

Апошнія беларускія школы на Смаленшчыне былі ліквідаваны ў 1938 годзе, азначаючы тым самым канец беларускага школьніцтва гэтай тэрытарыяльнай адзінкі Расіі.

Краязнаўчы рух — яшчэ адна форма беларускай культурна-асветнай працы на Смаленшчыны. 19 сакавіка 1926 г. па ініцыятыве невялікай групы зацікаўленых асобаў у Смаленску быў зацверджаны Статут Смаленскага таварыства краязнаўства.

Маладое таварыства, якое спачатку не мела ані сродкаў, ані ўласнага памяшкання, распачала актыўную працу сярод студэнцтва, вучнёўскай моладзі, настаўніцтва і энтузіястаў. У 1927 г. аддзяленні таварыства дзейнічалі ў Вязьме, Сычоўцы і Дарагабужы, былі ўтвораны ініцыятыўныя групы па стварэнні філіяў арганізацыі ў Ельні і Рослаўле[39]. Таварыства вяло перапіску з Цэнтральным бюро краязнаўства РСФСР, рэгулярна дасылала свае допісы ў газету «Наш край», актыўна супрацоўнічала з Інстытутатам Беларускай Культуры і Цэнтральным бюро краязнаўства пры ім, метадычным бюро Губана і іншымі інстытуцыямі.

Навукова-даследчая дзейнасць арганізацыі выяўлялася ў наступных галінах: прыродазнаўчай, эканамічнай, гістарычнай, археалагічнай і этнаграфічнай. Так, вядомы беларускі археолаг А.Н.Ляўданскі разам з В.Тарасенкам і Г.Парфёнавым абследавалі гарадзішчы і курганы; у галіне этнаграфіі і фальклярыстыкі плённа працавалі В.Дзьмітраў і А.Палашэнкаў. У прыродазнаўчай галіне А.В. Цьвятковым, В. Даўгашовым, В.В. Дабравольскім і іншымі вялося збіранне матэрыялаў па флоры і фаўне.

У 1920-я гг. асноўная маса беларускай меншасці пражывала ў сельскай мясцовасці, але канцэнтрацыя нацыянальных сіл адбывалася ў губернскім Смаленску.

З 1923 па 1925 гг. у Смаленскім універсітэце на пасадзе справавода рабфака працаваў Усевалад Фальскі, былы камісар замежных спраў Часовага рабочасялянскага савецкага ўрада Беларусі, адзін са стваральнікаў беларускага прафесійнага тэатра.

У горадзе галоўнымі асяродкамі, рыхтаваўшымі нацыянальныя кадры для беларусаў, былі вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы.

Першая вышэйшая навучальная ўстанова ў губернскім цэнтры — Смаленскі дзяржаўны універсітэт — быў заснаваны ў 1918 годзе, маючы перад сабой даволі простыя мэты: будучы правінцыйнай ВНУ, навучаць на двух сваіх факультэтах — педагагічным і медыцынскім — настаўнікаў і медпрацаўнікоў для патрэбаў рэгіёна.

Універсітэт з'яўляўся месцам прыцягнення не толькі абітурыентаў Смаленскай губерні, а потым вобласці, але і навакольных акругаў, у тым ліку беларускіх. Так, першы набор на медыцынскі факультэт СДУ адбыўся ў 1920 годзе. Усяго было прынята 118 чалавек, якія прайшлі падрыхтоўчае аддзяленне, арганізаванае пры Смаленскім рабфаку. Па тэрытарыяльным прызнаку залічаныя студэнты размяркоўваліся наступным чынам: Смаленская губерня — 76 чалавек, Гомельская губерня — 10 чалавек, Бранская губерня — 3 студэнты, БССР — 14 чалавек, Маскоўская губерня — 2 чалавекі, УССР — 3 чалавекі, «іншых» — 10 чалавек. Па меры роста навучальнай установы, колькасць студэнтаў узрастала, але, акрамя гэтага, пашыралася і іх тэрытарыяльнае прадстаўніцтва: праз некалькі год прадстаўнікоў губерні было ўжо 382 чалавекі, гамяльчан — 60, бранскіх студэнтаў — 35, прыезджых з БССР — 40, студэнтаў з Яраслаўскай губерні — 81 чалавек, прадстаўнікоў Кастрамской губерні — 32, масквічоў было 12, украінцаў — 18 чалавек[40].

Наяўнасць шматлікага беларускага студэнцтва ў Смаленску прывяла да таго, што ўжо ў 1922 годзе тут былі заснаваны першыя нацыянальныя гурткі.

Падставай гуртавання смаленскай моладзі служыла цікавасць да гісторыі і культуры Беларусі. Беларускі гісторык М. М. Улашчык трапна заўважаў на гэты конт: »Беларускі рух рос ў геаметрычнай прагрэсіі. Беларусы, нацыянальна свядомыя людзі, перасталі быць навіною, дзівам. Колькасць іх узрастала амаль з кожным месяцам, і гэты рост павінен быў замацавацца ў нейкія арганізацыйныя формы. Быў вялізны ўздым нацыянальнай свядомасці, людзі нечым хацелі праявіць сябе, нешта рабіць не чыноўнае, не абавязковае, але тое, што завецца «для душы»[41].

У 1920-я гг. арганізацыі беларускай моладзі узніклі раней ў такіх гарадах як Масква, Ленінград, Варонеж, Казань, падаючы добры прыклад землякам з іншых навучальных устаноў РСФСР. Асноўная задача студэнцкіх зямляцтваў зводзілася да таго, каб дапамагаць арганізацыі той частцы студэнцтва Беларусі, якая арыентавалася на працу дзеля Айчыны і «…хоча і будзе працаваць над адраджэннем гэтае сялянскае краіны»[42].

Відавочна, што Смаленску — самаму блізкаму беларусам гораду РСФСР — было наканавана стаць адным з цэнтраў нацыянальнага руху за межамі Савецкай Беларусі. Смаленская моладзь трапіла ў вір беларусізацыі, у натхненні спрабуючы прапагандаваць нацыянальную гісторыю і культуру ў даволі супярэчлівыя і нялёгкія часы НЭПа.

На працягу 1920-х гг., у перыяд правядзення «карэнізацыі» — палітыкі ўрада РСФСР па пераводзе на родную мову дзяржаўных і іншых устаноў акругаў, дзе жыло нярускае насельніцтва — ішла даволі актыўная праца з нацыянальнымі меншасцямі. Падобная практыка тычылася і Смаленскай губерні, дзе назіраліся пэўныя зрухі ў абароне правоў беларускага насельніцтва: беларусам губерні выдзяляліся месцы ў вышэйшыя навучальныя ўстановы краіны, мясцовымі органамі ўлады арганізоўвалася школьная справа, пасылаліся настаўнікі на курсы ў БССР.

У 1921 годзе па ініцыятыве ўрада БССР пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай адукацыі была заснавана Беларуская секцыя ў складзе трох членаў і двух кандыдатаў. Беларуская секцыя, якая працавала ў губерні з перапынкамі ў 1922–23 і 1925–27 гг., непасрэдна падначальвалася Беларускаму цэнтральнаму бюро пры народным камісарыяце асветы РСФСР і Саўнаркаму пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай адукацыі, займаючыся арганізацыяй на тэрыторыі Смаленскай губерні нацыянальных школ, клубаў, іншых культурна-асветных устаноў для беларускага насельніцтва. Арганізацыя, у наяўнасці якой меліся вельмі абмежаваныя магчымасці, разлічвала на дапамогу нацыянальна-свядомай моладзі ды таму ўсяляк падтрымлівала яе пачынанні.

Увосень 1924 г. выканкам Смаленскага дзяржаўнага універсітэта афіцыйна зарэгістраваў Беларускае студэнцкае зямляцтва[43]. Маладзёжная арганізацыя адразу занялася педагагічнай і навукова-даследчай дзейнасцю. Каб змякчыць навучальную адарванасць ад БССР, выбарнае праўленне зямляцтва разам з Беларускай секцыяй пачало забяспечваць студэнтаў беларускімі падручнікамі і дапаможнікамі.

Беларускае студэнцкае зямляцтва з самага пачатку стваралася ў рамках існуючай на той час аўтарытарнай савецкай сістэмы. Легалізацыя зямляцтва не толькі насіла абавязковы характар з-за умоў «дыктатуры пралетарыяту», але

і была пажаданай з пункту гледжання пошуку магчымай матэрыяльнай дапамогі.

Справа ў тым, што да канца 1920-х гг. грамадскія арганізацыі, прамым чынам не пагражаючыя савецкай уладзе, мелі права на падкантрольнае існаванне. Больш за тое, беларусізацыя і карэнізацыя узводзіліся ў разрад афіцыйнай палітыкі, забяспечваючы існаванне і абмежаванае фінансаванне нацыянальным суполкам, якія павінны былі прытрымлівацца афіцыйнай ідэалогіі. У сувязі з гэтым, арганізатары смаленскага Беларускага зямляцтва спадзяваліся на афіцыйную дапамогу як мясцовых, так і цэнтральных уладаў.

З-за адсутнасці шырокага спектра матэрыялаў, мы не можам канчаткова сцвярджаць аб пераважаючых палітычных сімпатыях у суполцы. Тым не менш, шэраг ускосных сведчанняў пераконвае, што яны былі даволі рознымі, ад нацыяналістычных да камуністычных. Тое самае тычыцца і прычын уваходжання студэнтаў у склад зямляцтва. Відавочна, што матывацыя моладзі была вельмі розная: для стваральнікаў і актывістаў зямляцтва галоўнай мэтай хутчэй за ўсё было нацыянальнае адраджэнне Беларусі ў савецкай ці дэмакратычнай формах, нацыянальнае выхаванне моладзі, а для шэрагоўцаў — як фінансавая дапамога, так і натуральная патрэба гуртавацца з землякамі. Акрамя таго, цалкам верагодна, што вялікая частка членаў зямляцтва была прынята ў яго лік калектыўным чынам: пасля стварэння ў 1926 годзе беларускіх аддзяленняў губернскай Саўпартшколы і губернскага рабфака частку іх студэнтаў маглі аўтаматычна залічыць у лік беларускага зямляцтва.

Гаўрыла Гарэцкі, вядомы беларускі дзеяч і адзін з арганізатараў Першага ўсебеларускага студэнцкага з'езда, яшчэ ў 1920-я гг., у час дзейнасці Смаленскага зямляцтва, задаваўся пытаннем «што ж такое беларускае студэнцтва?». Згодна яго звесткам, у Смаленску на той час было 250 студэнтаў-беларусаў, якія разам з беларускімі студэнтамі іншых куткоў Савецкага Саюзу складалі каля 2440 чалавек. Гарэцкі лічыў гэтую лічбу павялічанай, бо, на яго думку, сярод таго студэнцтва былі і такія, што варожа ставіліся да беларускага нацыянальнага руху. Усіх студэнтаў Г. Гарэцкі падзяляў на «нацыянальна несвядомых», «індыферэнтных» і «шчырых беларусаў», якія падзялялі ідэі нацыянальнага адраджэння Беларусі, а таксама «празелітаў», якія вызнавалі толькі культурна-эканамічнае адраджэнне, абмінаючы нацыянальнае[44]. «Шчырых беларусаў» на думку Гарэцкага сярод студэнтаў было каля 20%. Думаецца, што падобную градацыю можна выкарыстоўваць і да Смаленскага беларускага зямляцтва.

Вельмі хутка дзейнасць зямляцтва пачала набіраць абароты, чаму спрыяла арганізацыя ў 1925 г. пры Смаленскім Губана Савета па асвеце беларусаў, які распрацаваў доўгатэрміновы план працы з беларускай меншасцю, куды ўваходзілі наступныя мерапрыемствы: «1) Скласці этнаграфічную карту беларускага насельніцтва Смаленскай губерні; 2) Зрабіць улік беларусаў, што як ведаюць, так і хацелі бы вывучаць беларускую мову; 3) Высветліць, якія школы можна перавесці на беларускую мову; 4) Выкарыстаць студэнтаў-беларусаў з мэтамі прапаганды асветы і для [...] падрыхтоўкі беларускага насельніцтва да пераходу на родную мову; 5) Прасіць Губана паслаць настаўнікаў на курсы перападрыхтоўкі ў Мінск; 6) На аснове сабранага матэрыялу Савету распраца-

ваць канкрэтны план па адкрыцці беларускіх школ, адначасова распрацаваць план палітыка-асветнай працы»[45].

Са сваімі задачамі Савет па асвеце беларусаў спраўляўся не ў поўнай меры, прымаючы пад увагу малую колькасць яго супрацоўнікаў і мізэрнае фінансаванне яго дзейнасці. Амаль адразу стала вядома, што пытанне аб пасылцы беларускіх настаўнікаў на курсы ў сталіцу Беларусі закрываецца, бо Смаленскі Губплан адмаўляўся адпусціць Савету належныя сродкі. «Беларускія работнікі» былі вымушаны абапірацца на ўласныя рэсурсы, выкарыстоўваючы энтузіязм моладзі і нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, гатовай працаваць бясплатна на карысць Бацькаўшчыны.

Першы загадчык Беларускай секцыі Мікалай Агейчык, малады настаўнік Пётр Кароль і студэнт педагагічнага факультэта СДУ Усевалад Ганчароў сталі арганізатарамі і асноўнымі актывістамі Смаленскага зямляцтва. З самага пачатку пры ім стаў працаваць гурток беларусазнаўства, якім кіравалі пазначаныя вышэй асобы. Выкладчыкі М. Ражнова, Ю. Лазарэвіч вучылі студэнцкую моладзь беларускай літаратурнай мове. Лекцыі па гісторыі і этнаграфіі чытаў Аляксандр Ляўданскі, які неўзабаве стаў вядомым беларускім археолагам.

Беларуская секцыя ў якасці дапамогі аформіла для зямляцтва падпіску на газеты «Савецкая Беларусь» і «Чырвоная змена», на часопісы «Маладняк» і «Наш Край». З часткі атрыманых выданняў зямляцтва камплектавала беларускі фонд губернскай бібліятэкі.

29 лістапада 1925 года пад кіраўніцтвам зямляцтва была праведзена першая канферэнцыя навучэнцаў-беларусаў г. Смаленска. Адным з важнейшых было пытанне аб пашырэнні беларускай культурна-асветнай працы ў горадзе. Канферэнцыя таксама выказвалася за ўтварэнне ў СДУ кафедры беларусазнаўства, якая абслугоўвала бы таксама і навучэнцаў некаторых смаленскіх тэхнікумаў. Напрыканцы канферэнцыі яе ўдзельнікамі ў Мінск была паслана прывітальная тэлеграма.

Такім чынам, мы бачым, што галоўнай перадумовай узнікнення Беларускага студэнцкага зямляцтва ў Смаленску была наяўнасць у краі значнай колькасці свядомых беларусаў, як мясцовых, родам з так званай Беларускай Смаленшчыны, так і прыезжых — студэнтаў смаленскіх навучальных устаноў і супрацоўнікаў губернскіх органаў улады.

Узнікненню зямляцтва спрыяла правадзімая на працягу 1920-х гг. на тэрыторыі Смаленшчыны палітыка «карэнізацыі», а таксама актыўная пазіцыя Беларускай секцыі мясцовага Губана.

Асноўнымі мэтамі зямляцтва былі: падтрыманне сувязяў членаў арганізацыі з Беларуссю, культурнае абслугоўванне беларускага студэнцтва, дапамога ў правядзенні беларусізацыі на Смаленшчыне.

Трэба адзначыць, што да 1926 года ў зямляцтве не было цвёрда акрэсленай структуры і яно ўяўляла сабой даволі неарганізаванае аб'яднанне. Праз два гады пасля рэгістрацыі ў Смаленскім універсітэце, зямляцтва атрымала з Мінска інструкцыю, згодна якой яно мусіла сфармаваць свае рабочыя органы, што хутка і было зроблена. Інструкцыя была распрацавана студэнцкім прафсаюзам — Пралетстудам.

Згодна «Положению о студенческих землячествах» ЦБ Пралетстуда, зямляцтва з'яўлялася аб'яднаннем студэнтаў-землякоў ВНУ, рабфакаў, вышэйшых партшколаў і вайсковых вучэбных устаноў, і мела за мэту матэрыяльную дапамогу сваім членам»[46].

Зямляцтва павінна было прыцягваць да аказання матэрыяльнай дапамогі студэнтам розныя арганізацыі; здабываць сродкі шляхам правядзення тыдняў дапамогі, вечарын і канцэртаў, збірання ўзносаў, ахвяраванняў; арганізоўваць ільготнае набыццё вучэбных дапаможнікаў, прызначаць стыпендыі, а таксама матэрыяльную дапамогу хворым і бедным навучэнцам.

Зразумела, што ва ўмовах савецкага рэжыму іншыя мэты перад зямляцтвамі ставіцца не маглі, а асабліва гэта датычыцца іх нацыянальна арыентаванай працы. З самага пачатку, беларускія студэнцкія зямляцтвы, якія актыўна займаліся беларусізацыяй як сярод сваіх членаў, так і сярод мясцовага насельніцтва, былі на адмысловым становішчы.

Правілы падкрэслівалі, што членамі зямляцтва маглі быць толькі студэнты, якія паходзілі з адной вобласці, губерні, аўтаномнай ці саюзнай рэспублікі, не пазбаўленыя выбарчых праў па Канстытуцыі СССР. Такімі мерамі улада страхавала сябе ад магчымага пранікнення ў афіцыйныя студэнцкія суполкі «варожых элементаў», што на практыцы адбывалася вельмі часта.

Студэнты не мелі права ўваходзіць адначасова ў некалькі зямляцтваў, а прыём у члены арганізацыі адбываўся па заяве, якая разглядалася на пасяджэнні агульнага схода зямляцтва і задавальнялася ў выніку станоўчага галасавання большасці прысутных.

Выбыццё з ліку членаў зямляцтва магло адбывацца або па асабістым жаданні выбываючага, або па пастанове агульнага схода, прычым, у апошнім выпадку студэнта выключалі толькі пры наяўнасці з яго боку «ганебных для зямляцтва ўчынкаў ці злачынных дзеянняў». Кожны год спісы членаў зямляцтва павінны былі падавацца ў яго Праўленне.

Кажучы пра арганізацыйную пабудову, заўважым, што агульны сход зямляцтва склікаўся як яго Праўленнем і рэвізійнай камісіяй, так і па патрабаванні 1/3 часткі арганізацыі. Агульныя сходы зямляцтва маглі быць чарговымі і надзвычайнымі, і лічыліся сапраўднымі пры наяўнасці не менш паловы членаў зямляцтва. Калі на сход не прыходзіла вызначаная колькасць людзей, то прызначаўся другі сход, які быў сапраўдным ужо пры любой колькасці прысутных. Кіраўніцтва арганізацыі павінна было своечасова праінфармаваць членаў зямляцтва наконт месца, часу, прадметаў запланаванага сходу.

На агульных сходах зямляцтва прымала і выключала сваіх членаў; абірала Праўленне і рэвізійную камісію; разглядала і зацвярджала свае сметы. Акрамя таго, на агульных сходах разглядаліся і зацвярджаліся даклады і справаздачы Праўлення і рэвізійнай камісіі, а таксама разглядаліся сродкі спагнання пазыкаў з членаў арганізацыі.

Усе пытанні на агульных сходах, за выняткам пытанняў, адмыслова прадугледжаных у спецыяльным «Палажэнні», вырашаліся простай большасцю галасоў. Тыя пытанні, што падымаліся асобнымі членамі зямляцтва або групамі, маглі ўносіцца на разгляд агульнага схода не інакш як праз Праўленне і з яго пастановы.

Тыя члены, што прапускалі два сходы запар або не ўносілі на працягу двух месяцаў членскіх узносаў без прычыны, лічыліся выбылымі з зямляцтва.

Цэнтрам студэнцкага зямляцтва з'яўлялася Праўленне, якое абіралася на агульным сходзе арганізацыі ў колькасці 3-х «сябраў» і 3-х «кандыдатаў» тэрмінам на 6 месяцаў.

Праўленне з'яўлялася выканаўчым органам і прытрымлівалася ва ўсіх сваіх дзеяннях інструкцыі, разгледжанай і зацверджанай агульным сходам членаў зямляцтва.

Што тычыцца Беларускага смаленскага зямляцтва, то архіўныя дадзеныя сведчаць, што на яго агульным сходзе, які адбыўся 6 сакавіка 1926 г., быў упершыню абраны спіс «сябраў» і «кандыдатаў» Бюро арганізацыі. Спіс быў зацверджаны, як тое і патрабавалася, Выканаўчым Бюро Смаленскага універсітэта.

Кіруючыя пасады зямляцтва на пачатку яго дзейнасці былі размеркаваны наступным чынам: старшынёй Бюро, а, фактычна, і кіраўніком зямляцтва, стаў студэнт-педагог з Калінінскай акругі БССР Ус. Ганчароў, а сакратаром арганізацыі быў абраны яго зямляк, навучэнец Фармацэўтычнага тэхнікума А. Міхальчанка. Акрамя таго, дзеля лепшай эфектыўнасці працы, пры Праўленні зямляцтва былі створаны культурніцкая і эканамічная камісіі, якія павінны былі адказваць за вызначаныя накірункі працы.

Дзеля таго, каб праверыць работу Праўлення, на паўгады была абрана рэвізійная камісія, якая складалася з 3 асобаў. Згодна статуту, склад Праўлення і рэвізійнай камісіі лічыліся легітымнымі, калі ў тыднёвы тэрмін з даты іх абрання прадстаўнік Губпрафсавета таго горада, дзе існавала зямляцтва, не апратэстоўваў выбар у Губпрафсавеце. Што тычыцца смаленскага зямляцтва, то рэвізійную камісію, створаную пры ім, узначалілі два рабфакаўцы — М. Гамаліцкі і А. Свечнікаў — а таксама адзін з найбольш актыўных членаў зямляцтва случчак Мітрафан Чадовіч — студэнт мясцовай Саўпартшколы і кандыдат ВКП(б)[47].

Сярод студэнтаў былі і 3 «кандыдаты» ў Бюро зямляцтва: першымі кандыдатамі сталі студэнтка Жукоўская, якая вучылася на рабочым факультэце, а таксама яе калега-рабфакавец В. Козел (http://admin.smolensk.ru/repress/repression.php?ZN=0&Surname=%EA%EE%E7%E5%EB) і камсамолец Залыт.

Праўленне зямляцтва кіравала ўсімі цякучымі справамі і, у прыватнасці, мела права даваць «меркаванні» і пастановы стыпендыяльным камісіям ВНУ па пытанні аб залічэнні моладзі на дзяржаўныя і прыватныя стыпендыі.

Канчатковае рашэнне аб прызначэнні стыпендый студэнтам, высунутым зямляцтвам, належыла прыняць прадстаўніку Губвыканкама, які заключаў дамову і рэгістраваў стыпендыі ў Стыпендыяльных камісіях ВНУ. У тых выпадках, калі былі рознагалоссі, пытанне пераносілася ў губернскую або цэнтральную Стыпендыяльныя камісіі, рашэнне якіх было абавязковым.

Праўленне таксама распаўсюджвала па ўзгадненні з прадстаўнікамі Губвыканкама і Губпрафсавета грашовыя і іншыя сродкі, якія паступалі ў зямляцтва ад мясцовых органаў.

Адзначым, што сярод магчымасцяў Праўлення была і арганізацыя ў горадзе, дзе вучыліся члены зямляцтва, а таксама на іх радзіме, розных прад-

прыемстваў дзеля атрымання сродкаў. Зямляцтва магло заключаць дамовы з адпаведнымі гаспадарчымі органамі ад свайго імя.

Цікава, што Праўленне надзялялася юрыдычнымі правамі, магло выступаць у абарону інтарэсаў свайго зямляцтва на судзе.

Сродкі студэнцкага згуртавання складаліся з уступных і членскіх узносаў, памер якіх вызначалі самі студэнты. Акрамя узносаў зямляцтва магло мець у сваім распараджэнні пазыкі, ахвяраванні і дапамогу, якія выдзяляліся мясцовымі органамі ўлады, установамі, кааператыўнымі і прыватнымі асобамі. Больш за тое, аб'яднанне магло атрымліваць адначасовую дапамогу, а таксама працэнты на ўласныя капіталы.

Ліквідацыя зямляцтва магла адбывацца ў некалькіх выпадках: па пастанове агульнага сходу, калі яна выносілася большасцю галасоў, ці па пастанове ўрадавых органаў. Ліквідацыю праводзіла адмысловая Ліквідацыйная камісія, што абіралася агульным сходам у колькасці 3-х чалавек.

Падсумоўваючы, можна зрабіць выснову, што ўнутраны дэмакратызм структуры Беларускага зямляцтва спалучаўся са знешнім кіраўніцтвам арганізацыі. Цэнтральнае Бюро пралетарскага студэнцтва, губернскі выканаўчы камітэт, губернскі савет прафесійных саюзаў былі тымі органамі, якія кантралявалі склад студэнцкага зямляцтва, яго фінансавыя сродкі, формы і, наогул, дзейнасць. Зямляцтву адводзілася роля арганізацыі, якая павінна былі займацца галоўным чынам фінансавым забеспячэннем сваіх членаў.

Што тычыцца нацыянальнага складу членаў Смаленскага зямляцтва, то, дзякуючы захаваўшымся дакументам, яго можна адлюстраваць з высокай ступенню дакладнасці. Так, у 1926–27 навучальным годзе студэнты СДУ — члены Беларускага студэнцкага зямляцтва — былі ураджэнцамі наступных частак Беларусі: Барысаўская акруга — 3, Віцебская акруга — 12, Гомельская акруга — 6, Гродзенская губерня — 5, Калінінская акруга — 15, Магілёўская акруга — 4, Аршанская акруга — 13, Смаленская губерня — 6 чалавек. Віленская губерня, Слуцк, Дуброўна, Горкі, Мінск і Кубана-Чарнігаўская вобласць мелі па 1 прадстаўніку[48].

Такім чынам, 75 беларусаў-студэнтаў СДУ, якія былі ў складзе Смаленскага зямляцтва, у асноўным з'яўляліся ураджэнцамі ўсходніх частак БССР, што і не дзіўна, улічваючы блізкасць Смаленска.

Сярод членаў зямляцтва былі прадстаўнікі не толькі СДУ, але і Саўпартшколы, Кааператыўнага, Фармацэўтычнага, Медыцынскага тэхнікумаў нацыянальны склад якіх быў амаль аднолькавы, за выняткам некаторых асаблівасцяў.

Яўрэі, якія таксама ўваходзілі ў арганізацыю, у асноўным вучыліся ў Фармацэўтычным тэхнікуме, што можа тлумачыцца іх традыцыйнай прафесійнай арыентацыяй і даволі высокім адукацыйным ўзроўнем. На рабфаку і на педагагічным факультэце СДУ яўрэяў практычна не было.

Увогуле, у 1926–27 навучальным годзе колькасць членаў зямляцтва складала 115 чалавек, з іх яўрэяў было прыкладна 13%. Ужо на наступны 1927–28 навучальны год колькасць членаў зямляцтва павялічваецца да 158 чалавек, але колькасць яўрэяў зніжаецца да 8%.

У прынцыпе, гэтыя дадзеныя з'яўляюцца толькі прыблізнымі, бо ўвесь час Праўленне зямляцтва імкнулася ўдасканаліць улік сваіх членаў. Але трэба звярнуць увагу на тое, што ў смаленскія навучальныя ўстановы штогод усё менш і менш прымаліся выхадцы з «непралетарскіх» слаёў насельніцтва, сярод якіх вельмі часта аказваліся як раз гараджане-яўрэі.

Вельмі характэрным з'яўляецца той факт, што сярод членаў беларускага зямляцтва былі і ўраджэнцы Смаленскай губерні. Так, у 1926–27 навучальным годзе такіх асобаў было 13, а праз год ужо 31, што можа быць сведчаннем пашырэння беларускай ідэнтычнасці сярод смаленчукоў.

У складзе зямляцтва былі і студэнты родам з Заходняй Беларусі. Так, 5 чэрвеня 1926 г. у «Развёрстцы месцаў на беларускія аддзяленні рабфакаў» адзначалася, што Таварыству палітэмігрантаў Заходняй Беларусі выдзялялася 10 месцаў на смаленскім рабфаку[49]. У 1926–27 годзе ў зямляцтве з ліку ўраджэнцаў Гродзенскай губерні было 7 чалавек, у той жа час з Віленскай губерні — толькі 2 студэнты.

Праз год колькасць выхадцаў з заходніх паветаў Беларусі павялічваецца на 6 чалавек. Наяўнасць заходніх беларусаў у шэрагах беларускіх студэнтаў можа быць растлумачана. Канешне, мы не можам высветліць усіх абставінаў, якія вымусілі беларусаў прыехаць у Смаленск і там далучыцца да землякоў з усходу: хтосьці з ліку заходніх беларусаў здаўна знаходзіўся ў Расіі ці Савецкай Беларусі і быў «заходнікам» толькі па паходжанні, а хтосьці апынуўся ў губернскім цэнтры не па сваёй волі. У апошнім выпадку эміграцыя моладзі з польскай тэрыторыі заключалася ў сацыяльных і палітычных прычынах. Прыналежнасць да КПЗБ, сапраўдныя і ўяўныя поспехі нацыянальнага будаўніцтва ў БССР, нацыянальны ўціск, і проста недаступнасць польскай вышэйшай адукацыі памножаныя на савецкую прапаганду — усё гэта спрыяла з'яўленню у Смаленску «закардоннікаў» ці, як яны праходзяць па дакументах зямляцтва, «эмігрантаў з Польшчы».

«Летом, лесистыми дорогами и болотами, скрываясь от полиции и жандармов, пробиралась крестьянская белорусская молодёжь в Советскую Белоруссию для поступления в университет» — так маляўніча апісваў савецкі часопіс ахвяры заходнебеларускай моладзі на ніве адукацыі[50]. Верагодней за ўсё, эмігранты трапілі ў Смаленск у асноўнай сваёй масе не выпадкова, а па адмысловым накіраванні ўрада, бо, як правіла, перабежчыкаў з Захаду не пакідалі ў памежнай Беларусі, а імкнуліся накіраваць углыб краіны.

Што тычыцца сацыяльнага складу членаў зямляцтва, то тут трэба заўважыць, што дадзеныя аб сацыяльным паходжанні студэнцтва з'яўляюцца даволі ўмоўнымі і іх вельмі цяжка праверыць. Тое было звязана з пашыранай практыкай хаваць сваё сапраўднае сацыяльнае паходжанне, таму інфармацыю аб паходжанні членаў смаленскай суполкі трэба прымаць з пэўнай доляй асцярожнасці, нягледзячы на тое, што дакументы сцвярджаюць аб рабоча-сялянскай большасці. Некаторыя студэнты, асабліва яўрэі, былі жыхарамі гарадоў і мястэчак і, адпаведна, дзецьмі мяшчан і службоўцаў. Усяго ў 1927–28 навучальным годзе гараджан у зямляцтве было 12 чалавек.

Для нас даволі цікавым пытаннем з'яўляецца партыйная прыналежнасць членаў зямляцтва і, наогул, іх заангажаванасць на той час у савецкую палітыч-

ную сістэму. Вядома, што ў 1926–27 навучальным годзе 38 беларусаў ці 33% ад агульнай колькасці членаў зямляцтва з'яўляліся членамі ВЛКСМ, 12 (10%) — кандыдатамі ў члены ВКП(б), 9 (8%) — членамі ВКП(б) і 2 (1,7%) — членамі КПЗБ. На наступны год колькасць камсамольцаў павялічылася да 65 (41%) чалавек, членамі ВКП(б) былі запісаны 34 (22%) чалавекі, а кандыдатам ў ВКП(б) быў толькі адзін чалавек[51].

Камсамольцы і партыйныя студэнты пераважна з'яўляліся навучэнцамі мясцовага рабфаку пры СДУ і Саўпартшколы, што насіла тады фактычна абавязковы характар для адзначаных вышэй катэгорый навучэнцаў. Членства ў Камуністычнай партыі і Камсамоле не толькі з'яўлялася паказчыкам палітыка-ідэалагічнай арыентацыі моладзі, але было і першай прыступкай для кар'ернай лесвіцы, істотнай дапамогай ў вучобе.

Павелічэнне колькасці камсамольцаў і партыйных членаў зямляцтва палягае, як паказвалася на прыкладзе студэнтаў-яўрэяў, у агульнай палітыцы, якую праводзіла савецкая улада ў сферы вышэйшай адукацыі. Так, на працягу 1920-х гг. у Смаленскім дзяржаўным універсітэце праводзілася кампанія па «пралетарызацыі» студэнцтва, тэмпы якой паскараюцца ў 1929 г. у сувязі з агульнай зменай унутрыпалітычнага курсу краіны. З мэтай узмацніць прыток у ВНУ рабоча-сялянскай моладзі і абмежаваць колькасць выхадцаў з «буржуазных» слаёў, урадам СССР была выдадзена вялізная колькасць загадаў і пастаноў.

Яшчэ 2 жніўня 1918 г. быў выдадзены загад У. І. Леніна, ліквідаваўшы прывілеі «буржуазна-дваранскага саслоўя» на вышэйшую адукацыю. У распрацаванай Леніным пастанове СНК «О приёме в высшие учебные заведения РСФСР» было указана, што на першае месца павінны былі быць прыняты «лица из среды пролетариата и беднейшего крестьянства», якім на вучобу выдзяляліся стыпендыі[52]. На думку афіцыйнага гісторыка тых часоў М. Пакроўскага, новы склад студэнцтва забяспечваў «определённый минимум марксизма и практицизма в … преподавании»[53].

Што тычыцца Смаленска, то рух па наданні мясцоваму універсітэту больш «адпаведнага» сацыяльна-палітычным рэаліям выгляду паступова прыносіў свае плады. Для таго, каб праводзіць тую палітыку у масах студэнцтва, пры СДУ быў створаны так званы рабочы факультэт ці рабфак. Згодна А. В. Луначарскаму, рабфакі, якія з'явіліся ў Расіі ў 1919 г., былі свайго роду «пажарнымі лесвіцамі», прыстаўленымі да вокнаў вышэйшых навучальных устаноў, каб па іх маглі падымацца выхадцы з рабочага і сялянскага асяродкаў.

Асноўнай мэтай рабфакаў з'яўлялася дапамога рабочым без спецыяльнай адукацыі ў падрыхтоўцы да ўступных выпрабаванняў у ВНУ. Тое было накіравана, як пазначалася вышэй, на «пралетарызацыю» універсітэта і адбывалася ў рэчышчы афіцыйнай палітыкі, якая ставіла сабе задачу ачысціць ВНУ краіны ад «варожых элементаў».

У Смаленскім універсітэце ў першыя гады яго існавання і да пачатку карэннага пералома ў 1929 годзе сітуацыя была абсалютна нездавальняючай для партыйных колаў. Напрыклад, на медыцынскі факультэт СДУ ў 1920 годзе паступіла толькі 9 прадстаўнікоў «класа-гегемона» — рабочых, а 74 % ад ліку

ўсіх студэнтаў былі непралетарскага паходжання. Сацыяльны склад ВНУ, такім чынам, мала чым адрозніваўся ад дарэвалюцыйных часоў.

Па меры узмацнення савецкага дыктату ў сістэме вышэйшай адукацыі, сацыяльны склад губернскай навучальнай установы паволі «выпраўляўся». У верасні 1929 года Бюро партыйнай ячэйкі Смаленскага універсітэта з задавальненнем пазначала, што новапаступіўшыя студэнты складаліся на 70 % з працоўных, 18 % з сельскагаспадарчых працоўных і на 12 % з сялян[54]. Значнае «паляпшэнне» сацыяльнага складу новаспечаных студэнтаў навучальнай установы нарэшце стала рэальнасцю. Рабоча-сялянскі кантынгент на педагагічным факультэце ахоплівaў прыкладна 71 %, а на медыцынскім факультэце — 77 % ад ліку ўсіх студэнтаў.

Адміністрацыя універсітэта абвясціла пра амбітныя планы падтрымкі будучай рабоча-сялянскай інтэлігенцыі. Самыя паспяховыя студэнты выпускных курсаў атрымлівалі сабе ў «грамадскую нагрузку» курыраванне адстаючых рабочых. Стыпендыі таксама сталі інструментам палягчэння новага студэнцкага жыцця для былых рабочых і сялян.

Смаленскае зямляцтва, такім чынам, з'яўлялася праекцыяй дзяржаўнай палітыкі, накіраванай на будаўніцтва новай вышэйшай школы: сацыяльны склад беларускага студэнцтва станавіўся ўсё больш пралетарскім, што, на задумку ўладаў, мусіла даць вынікі.

Членства ў партыі і ВЛКСМ часта суправаджалася удзелам студэнцтва ў шматлікіх прафсаюзных арганізацыях. Моладзь на той час уступала ў розныя прафсаюзы галоўным чынам дзеля вельмі неабходнай тады фінансавай падтрымкі. Аднак у першую пяцігодку існавання СДУ і пазней у прафсаюзах лічылася толькі каля паловы ўсіх студэнтаў. У вывучаемым намі Беларускім зямляцтве ў 1926–27 вучэбным годзе сітуацыя была такая: сярод членаў, якія навучаліся ва універсітэце (усяго 75 чалавек), 42 студэнты састаялі ў прафсаюзах розных галінаў («Желдор» — 10, «Кожевников» — 1, «Коммунальников» — 2, «Медсантруд» — 23, «Рабземлес» — 2, «Совторгслужащих» — 3, «Химиков» — 1), а, адпаведна, 33 студэнты нідзе па прафсаюзнай лініі не праходзілі[55].

Прыналежнасць да прафесійных саюзаў вызначалася тым, у якім прафсаюзе лічыўся той ці іншы студэнт да паступлення ва універсітэт, або які прафсаюз накіраваў яго на рабфак. Да таго ж, у прафсаюзы ўступалі ўжо ў час вучобы, і пры гэтым, прафсаюзная прыналежнасць не абавязкова адпавядала факультэту: былі члены «Медсантруда» і на педагагагічным факультэце СДУ, а члены прафсаюзу «Совторгслужищих» сярод студэнтаў-медыкаў. Студэнты маглі пераходзіць з аднаго прафсаюзу ў іншы як, напрыклад, глава Смаленскага зямляцтва Усевалад Ганчароў, які спачатку састаяў у шэрагах «Медсантруда», але ў наступны год перайшоў у больш адпаведны будучаму настаўніку «Рабрпрос».

Трэба канстатаваць, што членства ў прафсаюзах насіла намінальны характар, а іх работа ўвесь час крытыкавалася за фармалізм і бяздзейнасць. Увогуле, роля прафсаюзных арганізацый зводзілася не толькі да непасрэднай сацыяльнай абароны навучэнцаў, але і да звычайнага кантроля над імі, абвастрэння класавай барацьбы ў іх шэрагах.

Можна заўважыць, што беспартыйнасць старшыні зямляцтва Ус. Ганчарова ўраўнаважвалася наяўнасцю ў кіруючых структурах зямляцтва партыйных членаў і камсамольцаў. Нажаль, адсутнасць крыніц не дае нам магчымасці высветліць ці адбываліся выбары ў Праўленне зямляцтва на аснове квотаў, ці члены КСМ і ВКП(б) трапілі туды выключна дзякуючы сваім асабістым якасцям.

Гуртаванне смаленскага студэнцтва, такім чынам, адбывалася не толькі на падставе месца нараджэння, але і па нацыянальным прызнаку, што статутам зямляцтва не было прадугледжана. У смаленскае зямляцтва акрамя беларусаў прымаліся яўрэі, а таксама прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, калі яны былі ўраджэнцамі Беларусі.

У асноўным, членами зямляцтва былі студэнты, прыехаўшыя з Усходняй Беларусі ў Смаленск на вучобу. Пашыраная сярод жыхароў некаторых раёнаў Смаленшчыны беларуская самаідэнтыфікацыя паўплывала на тое, што сярод членаў зямляцтва значную групу складалі выхадцы з Смаленскай губерні, якіх таксама прымалі ў арганізацыю.

Асобную групу землякоў-беларусаў складалі студэнты з Заходняй Беларусі, якія былі пераважна палітычнымі і сацыяльнымі эмігрантамі. У асноўным, члены зямляцтва былі выхадцамі з сялян і рабочых, хоць у арганізацыі і прысутнічала вядомая доля мяшчан і дзяцей службоўцаў. Большасць членаў зямляцтва была беспартыйнай, у той час калі палова ўсіх студэнтаў састаяла ў галіновых прафсаюзах.

Аб тым, што ўяўляла сабой ў самым пачатку сваёй дзейнасці студэнцкае зямляцтва, мы можам даведацца з хадайніцтва смаленскага Губернскага аддзела народнай адукацыі ў Народны камісарыят асветы БССР аб аказанні дапамогі «белорусскому землячеству Смоленска». Прадстаўнікі мясцовай адміністрацыі сцвярджалі, што зямляцтва «представляет собой крупное объединение, имеющее до 200 человек. Это землячество, в состав которого входят учащиеся белорусы высшего и средних смоленских учебных заведений, даст в будущем работников…для БССР»[56].

Напрыканцы 1925 года адзін з найбольш актыўных удзельнікаў працы зямляцтва і яго галоўны арганізатар Мікалай Агейчык пакінуў Смаленск. Ужо ў студзені 1924 г. ён лічыўся «ліквідавным» — звольненым з працы з-за «адсутнасці сродкаў на ўтрыманне адной штатнай адзінкі»[57]. Звольніўшы Агейчыка, мясцовая адміністрацыя фактычна закрывала Беларускую секцыю, якая пачынала беларусізацыю ў губерні. Нам не вядома, якой была сапраўдная прычына скарачэння секцыі: адсутнасць фінансавання, нядбайнасць мясцовых уладаў у нацпытанні ці нежаданне падымаць «беларускасць» у губерні.

Верагодна, мясцовае начальніцтва, спужаўшыся актыўнасці М. Р. Агейчыка ў арганізацыі беларускай працы, вырашыла яго нейтралізаваць. Да нашых дзён дайшла цікавая характарыстыка, дадзеная ў пратаколе губернскай нарады па працы сярод нацменшасцяў на былога беларускага супрацоўніка: «Что касается белорусов, то, по словам Агейчика, имеется 120000, а по данным тов. Ильенко белорусов нет. Далее Агейчик требует открытия около 200 белорусских школ, т. к. по его словам имеется около 30000 детей. Но такое количество белорусов сомнительно; губоно разослал циркуляры для учета дей-

ствительного количества белорусов и нужно ли создавать отдельные белорусские школы для них. Агейчик — националист, беспартийный, необходимо заменить партийным товарищем[58].

У 1925 г. Губана быў вымушаны аднавіць Беларускую секцыю ў сувязі з інтэнсіфікацыяй курсу цэнтральнага ўрада на карэнізацыю. У секцыю быў часова прызначаны «слабо владеющий белорусским языком и совершенно чуждый белорусской культурной работе» супрацоўнік мясцовай адміністрацыі Хенах, якога вельмі хутка замянілі на больш прыдатнага да справы студэнта Усевалада Ганчарова, што значна пашырыла фармальныя магчымасці Беларускага зямляцтва. Менавіта дзякуючы сумяшчэнню Ус. Ганчаровым пасадаў загадчыка Беларускай секцыі і старшыні зямляцтва, праца апошняга з канца 1925 па 1927 гг. характэрызуецца найбольшай актыўнасцю і згуртаванасцю.

Хоць у складзе зямляцтва і была даволі вялікая колькасць навучэнцаў, але, па вялікім рахунку, не ўсе беларусы аднолькава ўдзельнічалі ў працы арганізацыі. Як канстатавалі самі студэнты, наведвалі рэгулярна мерапрыемствы зямляцтва толькі 80% беларусаў, з якіх толькі 20 чалавек былі актывістамі беларускага студэнцкага руху[59].

Адразу пасля ўзнікнення зямляцтва пачалася яго праца, інтэнсіфікаваўшаяся пасля канчатковага арганізацыйнага афармлення. Так, у паперы Смаленскага Губана сцвярджалася, што «…землячество проводит культурно-просветительную работу, как среди членов, так и не членов землячества …».

Актыўнасць працы зямляцтва добра адлюстроўвае перыядычнасць і рэгулярнасць яго агульных сходаў, на якіх павінны былі прыймацца найважнейшыя для арганізацыі пастановы. У справаздачы Бюро зямляцтва, дакладчык Ус. Ганчароў адзначаў, што за час працы арганізацыі ў 1926–1927 н.г. усяго было праведзена 3 агульнага схода і арганізавана два вечара»[60]. З восені 1927 па зіму 1928 гг. у рамках працы зямляцтва адбылося 7 такіх сходаў.

Формы дзейнасці зямляцтва былі самымі рознымі і заключаліся ў працы студэнтаў у гуртках, арганізацыі беларускіх вечарынаў, выступленнях перад беларускімі часткамі Чырвонай арміі, шэфстве над беларускімі школамі губерні, аказанні матэрыяльнай дапамогі трываючым нястачу членам і інш.

Асноўнай формай працы зямляцтва, як адзначалася вышэй, была так званая «культпраца» у гуртках, якія аб'ядноўвалі як студэнтаў СДУ, так і навучэнцаў смаленскіх тэхнікумаў. Усе жадаючыя маглі працаваць як у гуртку беларусазнаўства, драматычнай студыі, так і беларускім хоры.

У сувязі з тым, што жыццё студэнтаў таго часу было спартанскім і ліхаманкавым і яны былі моцна загружанымі, у канцы вучэбнага года часта спынялася праца студэнтаў у гуртку беларусазнаўства, бо з-за пачынаючыхся залікаў навучэнцам бракавала часу. Горш была сітуацыя з харавым і драматычным гуркамі, бо іх кіраўнікі, якіх зямляцтва пераважна наймала, перманентна адмаўляліся працаваць з-за нізкай аплаты, якую маглі выдзяліць беларусы. Часам само зямляцтва было вымушана адмаўляць кіраўнікам гуркоў з-за іх нізкай кампетэнтнасці і благіх вынікаў працы.

Паступова студэнты дэталізоўвалі і ўдакладнялі стратэгію сваёй будучай працы ў развіцці культработы. Прыйшоўшы з летніх канікулаў у верасні 1927 г., беларусы вырашылі пашырыць працу гуркоў, зноў арганізаваўшы драма-

тычны і харавы, да якія сярод моладзі быў устойлівы інтарэс. Што тычыцца гуртка беларусазнаўства, які з вясны не працаваў, то яго таксама планавалі адкрыць, дапаўняючы ім адкрыты ў верасні 1926 г. у СДУ курс беларусазнаўства. Сярод планаў была і арганізацыя не менш двух платных вечароў.

Справы ў зямляцтве ішлі актыўна і ў снежні 1927 года, сабраўшыся на новае пасяджэнне, студэнты абмяркоўвалі ўласныя дасягненні. Запланаваны раней вечар, як і патрабавалася, быў падрыхтаваны дзеля ўсіх беларусаў горада. Драматычным гуртком, распачаўшым сваю працу, была пастаўлена п'еса Янкі Купалы «Прымакі». Пасля п'есы было выступленне музычнага гуртка, дэкламацыя і «скокі». З-за абмежаванасці сродкаў, арганізатары вымушаны былі браць па 5 капеек за білет, каб аплаціць памяшканне і музыку. Білеты былі разасланыя па тэхнікумах, трапілі і ў Смаленскі ўніверсітэт, так што колькасць прысутных была даволі значная.

Зноў пачалася праца гуркоў пад патранажам беларускага зямляцтва. Кіраўніком драмгуртка назначылі студэнта Медыцынскага тэхнікума Івана Хацкевіча, якому даручалася зрабіць аб'яднанне дробных суполак Саўпартшколы, рабфаку і тэхнікумаў у адзіны буйнейшы сталы гурток.

У сувязі з тым, што сярод членаў зямляцтва былі асобы, якія жадалі прыняць удзел у працы «спеўнага» гуртка, скарбніку зямляцтва А. Караськову было даручана ўзначаліць адпаведную працу і распачаць запіс.

Традыцыя арганізацыі вечароў у зямляцтве не спынілася на пастаноўцы купалаўскіх «Прымакаў», і студэнты амаль адразу прыступілі да рэпетыравання п'есы Францішка Аляхновіча «Калісь». Даследчык Юры Чудзін здзіўляўся такім паводзінам студэнтаў, бо аўтар п'есы ужо другі год знаходзіўся у Салавецкім лагеры[61]. Падаецца зусім непраўдападобным, што актывісты зямляцтва нічога не ведалі пра арышт драматурга, бо пра гэта пісала не толькі савецкая, але і замежная прэса. Верагодна, беларуская моладзь такім чынам выказвала свой пратэст супраць арышту вядомага беларускага дзеяча, спадзяючыся на недасведчанасць смаленскай адміністрацыі.

Пасля зімовых канікулаў 1928 года актыў зямляцтва падсумоўваў зробленае. Студэнты адзначалі працу Івана Хацкевіча, які мусіў інтэнсіфікаваць работу драматычнага гуртка і працягваць правядзенне яго заняткаў. А. Караськову, прызначанаму кіраўніком харавога гуртка, было даручана неадкладна правесці арганізацыйную працу, якую ён амаль сарваў сваім бяздзеяннем, а таксама скласці стабільныя спісы жадаючых спяваць і вызначыць дзень рэпетыцый. Праўленнем зямляцтва прапаноўвалася наняць прафесійнага хормайстра па прозвішчы Ратнер з аплатай 20 рублёў у месяц за 20 гадзін. Наймалі Ратнера тэрмінам на 4 месяцы. За гурток беларусазнаўства, якому таксама збіраліся наняць платнага кіраўніка, адказным прызначаўся студэнт рабфака В. Клім.

У 1928 годзе праца па арганізацыі гуркоў пачала канчаткова наладжвацца, праўда, адказныя за гурткі працавалі не з аднолькавым імпэтам. Іван Хацкевіч да лютага 1928 г. толькі зладзіўся прыняць 33 студэнты, у той час калі Клім скардзіўся на малую актыўнасць рабфакаўцаў на беларусазнаўчай ніве. Лепш справы ішлі ў кіраўніка беларускага хору Караськова, які паспеў прыняць у яго шэрагі 26 ахвотных, і праводзіў з навучэнцамі рэгулярныя заняткі.

На думку студэнтаў, беларуская культурніцкая праца мусіла быць прыкметнай, таму ў Бюро зямляцтва зноў узнікае ідэя арганізацыі чарговага беларускага вечару. Арганізацыйная частка мерапрыемства была даволі хутка здзейснена, а сам вечар быў запланаваны на 4 сакавіка 1928 г. Рэгламент вечару ўключаў падрыхтаваную драматычным гуртком п'есу «Чырвоныя кветкі Беларусі», затым ішла чарга беларускага хору. У фінале вечара павінны быў таксама адбыцца канцэрт арганізаванага зямляцтвам струннага гуртка. На мерапрыемства зямляцтва адпускала 10 рублёў і нарыхтавала 400 білетаў[62].

Як сведчаць дакументы, студэнты Смаленскага ўніверсітэта даволі прыхільна сустрэлі ініцыятыву беларусаў і станоўча ацанілі вечар. Не адбышлося, праўда, без накладак, бо заключны выступ струннага гуртка так і не адбыўся, і, як скардзіўся кіраўнік драматычнай трупы, блага абстаяла справа з грымёрам, якога ён сам і замяніў. Таксама прысутныя заўважылі і не зусім упэўненыя паводзіны студэнтаў на сцэне, да якой акторы-аматары не здолелі прызвычаіцца з-за адсутнасці рэпетыцыйнага памяшкання.

У працы гурткоў назіралася і пастаянная ратацыя кадраў. Так, з прычыны таго, што хармайстар Ратнер дрэнна спраўляўся са сваімі абавязкамі, з ім разлічваліся і перадавалі гурток новаму кіраўніку — Івашчанку. Усевалад Ганчароў, прыроджаны кіраўнік і шчыры актывіст беларускай справы, здолеў дамовіцца з новым кіраўніком аб аплаце, якая не перавышала 20 рублёў у месяц за 16 гадзін заняткаў.

Працы гурткоў, па словах Усевалада Ганчарова, увесь час замінала адсутнасць Беларускага клуба ці нават асобнага памяшкання для заняткаў. Беларусы ўвесь час шукалі выйсце з такой сітуацыі і праводзілі свае мерапрыемствы то ў памяшканні Латышскага клуба, то ў залі Саўпартшколы.

У красавіку 1928 г. зямляцтва вырашыла паставіць пытанне перад Нацменам Смаленскага губана аб водпуску яму асобнага памяшкання. Да таго ж, Бюро вырашыла звярнуцца ў Дзяржаўнае выдавецтва Беларусі, каб тое выслала накладным плацяжом ў Смаленск літаратуру, патрэбную для працы хора і драматычнай студыі: 2 беларускія спеўнікі М. Равенскага і У. Тэраўскага, а таксама новыя беларускія п'есы.

Перад канцом 1927–28 навучальнага года студэнты планавалі арганізаваць новы, выключна ўнутрыбеларускі вечар, прымеркаваны да перавыбараў Праўлення зямляцтва, якія мелі адбыцца 14 кастрычніка 1928 г. Падобныя ўнутрыбеларускія вечары ўжо ладзіліся зямляцтвам і мелі сярод студэнтаў вялікі поспех. Вядома, што 5 снежня 1926 года ў Саўпартшколе зямляцтва правяло вечарыну да 20-годдзя літаратурнай дзейнасці Якуба Коласа, на якой чытаўся даклад аб творчасці паэта, дэкламаваліся ягоныя вершы і гучалі спевы.

Распрацоўка праграмы новага вечара была як і раней даручана культкамісіі зямляцтва, а сакратар арганізацыі М. Цішкевіч павінны быў дамовіцца наконт памяшкання ў Саўпартшколе. Будучы медык Іван Хацкевіч, а па сумяшчальніцтве галоўны рэжысёр зямляцтва, зноў браўся рэпетаваць п'есу, а кіраўнік хора Івашчанка дапамагаў яму ў сваім накірунку.

На агульным сходзе студэнцтва, які адбыўся на 6 дзён пазней запланаванага тэрміна, старшыня арганізацыі рабіў агляд дзейнасці Праўлення зямляцтва за 1927–28 н.г. У адрозненні ад афіцыйнай справаздачы, накіраванай

Смаленскім зямляцтвам у ЦБПС у Мінску, у прамове Ус. Ганчарова нічога не было сказана пра гурток беларусазнаўства, які, хутчэй за ўсё, студэнтам так і не ўдалося хоць раз нармальна сабраць. Па словах старшыні, драматычным гуртком за год дзейнасці было пастаўлена 4 п'есы, студэнцкі беларускі хор выступаў 3 разы. Былы глава Беларускай секцыі ў чарговы раз скардзіўся на адсутнасць добрых кіраўнікоў, цякучасць асабовага складу гурткоў, а таксама адсутнасць сталага памяшкання.

Вядома, што Праўленне зямляцтва ўвесь час займалася таксама пытаннем арганізацыі літаратурнага гуртка, але працаваць у ім жадаючых не было. У канцы 1920-х гг. у Смаленску пражываў высланы з Беларусі Алесь Дудар, а па справах адкрыцця філіі «Маладняка» ў Смаленск у 1925 г. прыязджаў пісьменнік Іларый Барашка, які сустракаўся з Ус. Ганчаровым. У газетах і журналах БССР пачатку 1926 г. ужо гаварылася аб яе існаванні ў горадзе, хоць прамых сведчанняў пра гэта не выяўлена. Праз некалькі гадоў, студэнт Ганчароў зноў спрабуе арганізаваць літаратурную суполку, але і на гэты раз яго імкненні нічым не скончыліся.

Відавочна, што праца ў літаратурным гуртку патрабавала ад студэнтаў асаблівага таленту, які не так часта сустракаецца. Ад моладзі патрабаваўся і даволі высокі інтэлектуальны ўзровень разам з выдатнай падрыхтоўкай.

Што тычыцца апошняй, то карціна тут была даволі песімістычнай. Новая палітыка прыёму ў ВНУ прамым чынам адбівалася на акадэмічных стандартах і ўзроўні смаленскіх студэнтаў, у тым ліку беларусаў. Дыскусіі ў партыйнай ячэйцы Медыцынскага інстытута, які быў створаны ў 1930 годзе на базе адпаведнага факультэта СДУ, праліваюць пэўным чынам святло на гэтую праблему. Так, на снежаньскай нарадзе партячэйкі 1930 года сцвярджалася, што сапраўдная карціна акадэмічнай паспяховасці студэнтаў была сумная, хоць па статыстыцы колькасць праваліўшыхся студэнтаў на паперы і зменшылася.

Выкладчыкі Смаленскага медінстытута баяліся канфліктаваць са студэнтамі, не выдзяляючы паспяховых ад асноўнай масы. У інстытуце па-ранейшаму захоўваўся брыгадны метад, але было зразумела, што ён сябе не апраўдваў, і вёў да катастрафічнага зніжэння ўзроўню адукацыі. Рэзалюцыя партыйнага Бюро сцвярджала аб неабходнасці індывідуальных экзаменаў для кожнага студэнта, бо брыгадны метад змяншаў адказнасць асобна ўзятага навучэнца.

Акрамя зніжэння ўзроўню падрыхтоўкі студэнтаў, зніжаўся і навукова-акадэмічны ўзровень навучальнай установы, бо ў міжваенны перыяд склалася традыцыя распрацоўваць толькі тыя навуковыя праблемы, якія дапамагалі бы ў рашэнні народагаспадарчых задач[63]. Акадэмічная работа была ўвесь час дэзарганізавана ў сувязі з пастаяннымі адпраўкамі камсамольцаў і іншых актывістаў па заданні партыі ў сельскую мясцовасць. Гэта было звязана з папулярнай у той час ідэяй аб тым, што «акадэмізм плюс навыкі ў практычнай грамадскай працы даюць патрэбнага нам спецыяліста»[64].

Адсутнасць кворуму на занятках шмат у чым тлумачылася «сацыяльнай актыўнасцю» студэнцтва, удзел у якой даваў моладзі «перавагу па ўсіх лініях (стыпендыя, праца пасля сканчэння навучальнай установы, розныя льготы і г.д.)». Як адміністрацыя універсітэта, так і партыя гралі ролю ў дэзарганізацыі

заняткаў, часта праводзячы ў іх час нарады і мітынгі. Дысцыпліна таксама была не на самым высокім узроўне. Былі выпадкі, асабліва на рабфаку, калі студэнты грубіянілі выкладчыкам ці адмаўляліся адказваць на іх пытанні. Норавы сярод студэнцтва таксама былі часта даволі нізкага кшталту. Былі выпадкі, калі студэнт не ведаў на настаўніка якога прадмету, якой школы вучыўся.

Зразумела, што знайсці шмат літаратараў сярод студэнтаў «ад сахі» было даволі праблематычна, хоць зямляцтва не пакідала сваёй ідэі арганізаваць новыя гурткі, у тым ліку і гурток студкораў.

Імкненне Ус. Ганчарова падрыхтаваць уласных беларускіх карэспандэнтаў было звязана як з агульнай модай 1920-х гг. на аматарскую журналістыку, так і даволі утылітарнай мэтай інфармавання насельніцтва аб беларускай справе на Смаленшчыне. Да таго ж, грашовая падмога ў выглядзе ганарараў за дасланыя артыкулы таксама не была бы для студэнтаў залішняй.

Яшчэ ў лютым 1927 г. старшыня ЦБ Пралетстуда Беларусі В. Башмачнікаў заклікаў удзельнікаў беларускіх зямляцтваў дасылаць у газеты «Звязда», «Савецкая Беларусь», «Чырвоная змена» нарысы аб сваёй дзейнасці. Як бачна з публікацый тых часоў, актыўным студкорам зямляцтва можна было лічыць толькі самога старшыню, які раз-пораз змяшчаў свае артыкулы ў губернскай газеце «Рабочий путь» і, часам, агульнабеларускіх выданнях.

Так, у канцы 1926 г. у артыкуле «Савецкай Беларусі», Ганчароў гнеўна піша аб рашэнні Смаленскага гарсавета перадаць грошы, якія выдзяляліся на культурна-асветную працу сярод беларускага насельніцтва, на жыллёвае будаўніцтва ў губерні. На думку старшыні Белсекцыі «Нужно Смоленскому горсовету позаботиться не только о жилстроительстве, а и о культурном обслуживании белорусского населения Смоленщины»[65]. Акрамя матэрыялаў Усевалада Ганчарова, аўтарам знойдзены толькі два артыкулы, напісаныя былымі членамі зямляцтва ў 1929 г.: артыкул «эмігранта з Польшчы» А. Бірулі[66], а таксама матэрыял стваральніка зямляцтва Мікалая Агейчыка, які ў 1929 годзе настаўнічаў на Віцебшчыне[67].

З кожным навучальным годам Беларускаму зямляцтву прыходзілася збіраць свой актыў і нанова распачынаць працу гуркоў.

Як адзначалася, у мэтах пашырэння роднага слова і інфармавання моладзі аб падзеях на радзіме, зямляцтва займалася распаўсюджваннем сярод беларусаў айчынных газет і часопісаў. На 1927 год беларускімі студэнтамі атрымлівалася мала прэсы: толькі 2 экзэмпляры «Савецкай Беларусі», часопісы «Полымя», «Маладняк» і «Узвышша». Праз год, у лютым-чэрвені 1928 года сітуацыя выглядала аналагічна. Колькасць асобнікаў «Савецкай Беларусі» павялічылася да 2 адзінак, «Звязду» выпісвалі ўсяго ў 1 экзэмпляры, «Чырвонай змены» таксама быў 1 нумар. Часопісы «Узвышша», «Полымя» і «Наш край» выпісвалі на ўвесь 1928 год.

Хоць на 158 членаў зямляцтва гэтая колькасць друку была мізэрнай, але тое ўсё ж такі было значным дасягненнем, улічваючы дарагоўлю падпіскі, якая была недасяжнай для моладзі. Падпіска на прэсу ажыццяўлялася галоўным чынам па навучальных установах, у залежнасці ад іх профіля: на 1928 г. на СДУ выпісваліся часопісы «Полымя», «Узвышша», «Маладняк», а таксама газеты «Савецкая Беларусь», «Звязда» і «Чырвоная змена». У той самы час

асобна на смаленскую Саўпартшколу выпісвалася «Савецкая Беларусь» і «Полымя», а на Медтэхнікум — толькі прамыслова-эканамічная «Савецкая Беларусь».

Акрамя прэсы, як адзначалася, Бюро зямляцтва закупала для студэнцтва і беларускія падручнікі, дзякуючы якім, студэнты маглі засвойваць беларускую навуковую тэрміналогію, авалодваць літаратурнай беларускай мовай, што было карысным для іх прафесійнай дзейнасці пасля вяртання дамоў.

Пашырэнню беларускай культурнай прысутнасці ў сценах смаленскіх навучальных устаноў спрыялі і так званыя «беларускія куткі» ў насценгазетах. Студэнтам удалося рабіць рэгулярныя допісы з жыцця Беларускага зямляцтва ў насценгазетах Саўпартшколы і універсітэта, хоць Бюро арганізацыі пастаянна падымала пытанне пра арганізацыю ўласнай насценгазеты ці часопісу, якія планавалася выпускаць на беларускай мове. На жаль, апошняе ажыццявіць студэнтам не ўдалося з-за рознагалоссяў з адміністрацыямі навучальных устаноў, якія не хацелі бачыць вынікі занадта актыўнай працы «нацыяналаў» ў сваіх калідорах.

Цікава, што ў мэтах прапаганды беларускай культуры, нацыянальныя актывісты выкарыстоўвалі і самыя модныя і перадавыя на той час прыёмы, у прыватнасці, кінематограф. Так, у пачатку 1929 г. у кіраўнікоў зямляцтва ўзнікла ідэя «дагаварыцца з адпаведнымі ўстановамі Беларусі аб высылцы беларускай кінофільмы». Вядома, што кінафільмы сапраўды былі беларусам высланы і арганізацыя беларускіх кінасеансаў збірала людзей ледзь не ў некалькі разоў больш, чым звычайныя мерапрыемствы зямляцтва.

Культурна-асветная дзейнасць беларускіх валанцёраў даходзіла не толькі да членаў зямляцтва, але і да іншых беларусаў, якія волей лёсу апынуліся ў горадзе на Дняпры. Некаторыя размешчаныя ў Смаленску часці Чырвонай Арміі складаліся амаль цалкам з беларусаў, таму аб'яднанне перыядычна арганізоўвала паказныя выступленні сваіх гурткоў перад ваеннаслужачымі, пашыраючы маштаб сваёй дзейнасці.

Праз студэнтаў зямляцтва, прыбыўшых з тэрыторыі Польшчы, рабіліся актыўныя крокі па супрацоўніцтве з палітэмігрантамі з Заходняй Беларусі[68]. Частка ўраджэнцаў Заходняй Беларусі і уцекачоў з II Рэчы Паспалітай, як адзначалася вышэй, паступілі на рабфак і розныя факультэты Смаленскага дзяржуніверсітэта, а некаторыя з іх, як студэнт Клім, былі актыўнымі ўдзельнікамі беларускага жыцця ў горадзе. Беларускае зямляцтва разам з польскімі эмігрантамі інфармавала грамадскасць аб падзеях вакол беларускай меншасці ў Польшчы, часам збіраючы на свае мерапрыемствы масу людзей.

Напрыклад, 11 сакавіка 1928 года на сходзе, сабраным Беларускім зямляцтвам і прымеркаваным да судовага працэсу ў Польшчы над Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамадой, сабралося 375 чалавек. На сустрэчы прагучаў даклад рабфакаўца, ураджэнца Віленшчыны І. В. Дашкевіча аб вядомым палітычным працэсе, а таксама аб палітычным і нацыянальным становішчы ў Заходняй Беларусі. Агульны сход, заслухаўшы даклад І. Дашкевіча, выказваў «свае глыбокае абурэнне проці агіднае і суровае расправы над удзельнікамі БСРГ». Студэнты ад імя смаленскага Беларускага зямляцтва пратэставалі супраць «тэрору польскіх катаў» і скончылі пасяджэнне лозунгамі «Рукі прэч

ад працоўных Заходняй Беларусі!» і «Няхай жыве Камуністычная партыя — правадыр працоўных!».

Нам цяжка сказаць ці былі падобныя сходы сапраўды волевыяўленнем беларускай грамады, ці сталі толькі часткай агульнасавецкай кампаніі, накіраванай супраць Польшчы. Цікава, што аналагічная заява прагучала на агульным сходзе Беларускага студэнцкага зямляцтва ў Кіеве. Даклад Т. Ахрамовіча ў Кіеве амаль поўнасцю супадаў па змесце з выступленнем І. Дашкевіча ў Смаленску[69].

Мы бачым, што роля зямляцтва не абмяжоўвалася выключна асветнай працай сярод беларусаў. Арганізацыя мусіла ўзяць на сябе папулярную тады грамадскую нагрузку ў асвятленні ўнутранай палітыкі «буржуазнай Польшчы» ў дачыненні да беларускага насельніцтва.

Трэба ўпамянуць, што на беларускае студэнцтва г. Смаленска ўскладалася таксама і задача дапамагаць губернскім уладам у правядзенні беларусізацыі. Кіраўнік Беларускай секцыі Ус. Ганчароў следам за М. Агейчыкам спадзяваўся пашырыць на Смаленшчыне беларускае школьніцтва, у чым яму павінны былі садзейнічаць калегі па зямляцтве. У студзені 1929 г. зямляцтва паведамляла ў Мінск, што яго ўдзельнікамі ажыццяўлялася шэфства над Любавіцкай і Руднянскай беларускімі школамі. Студэнты прыязджалі да школьнікаў, чыталі ім лекцыі па беларускай гісторыі і літаратуры, дарылі пісьмовыя прыналежнасці, «партрэты правадыроў», выступалі з п'есамі і нават паказвалі беларускае кіно. Зямляцтва вырашыла любым чынам дамагчыся, каб на месцы вышэй адзначаных навучальных устаноў былі адкрыты 10 і 9-гадовыя школы сялянскай моладзі. Нам не вядома, як ажыццяўлялася гэтая мэта, але факт, што студэнтам гэта вельмі хутка ўдалося.

Яшчэ адной формай дзейнасці Смаленскага зямляцтва, згодна яго ўставу, было аказанне сваім членам матэрыяльнай дапамогі. Даследчык расійскага студэнцтва А. Іваноў падкрэслівае, што яшчэ ў пачатку XX ст. аператыўную дапамогу, прычым даволі эфектыўную ў выніку сваёй своечасовасці, студэнты атрымлівалі і ад зямляцтваў. Яны аб'ядноўвалі студэнтаў-землякоў, якія, як і іх нашчадкі ў 1920-я гг., прыязджалі на вучобу з розных гарадоў і вёсак Расійскай імперыі. Матэрыяльная падтрымка студэнцтва, такім чынам, была не навіной для зямляцтваў яшчэ і ў дасавецкі час[70].

На працягу 1920-х гг. фінансавае становішча смаленскіх студэнтаў было вельмі цяжкім. Стыпендыямі былі забяспечаныя далёка не ўсе студэнты, якім яны патрабаваліся. Атрымлівалі грашовыя выплаты толькі каля 30-40 працэнтаў навучэнцаў. Заўважым, што ў першай палове 1920-х гадоў памер стыпендыі складаў прыкладна ад 6 да 15 рублёў, калі, для параўнання, кошт абедаў у студэнцкіх сталовых па льготных цэнах складаў прыблізна 6 рублёў на месяц. На працягу другой паловы 1920-х гадоў адбылося паступовае павелічэнне стыпендый да 30-35 рублёў у месяц, але ва ўмовах росту цэн гэтага было далёка недастаткова, таму пераважная колькасць студэнтаў была вымушана шукаць выпадковыя і дадатковыя падпрацоўкі[71].

Што тычыцца Смаленска, то ў першыя гады існавання СДУ стыпендый студэнты не атрымлівалі зусім. Губхарчкам выдзяляў на карысць студэнтаў хлеб у колькасці 25 пудоў, затым да 50 пудоў у месяц. Прычым усё гэта рабілася

нерэгулярна. Толькі ў 1922–23 вучэбным годзе было ўнесена ў смету і адпускалася штомесяц 65 стыпендый на 545 чалавек, што, літаральна, з'яўлялася кропляй у моры церпячых недахоп навучэнцаў.

Цікавыя сведчанні пра матэрыяльнае становішча студэнтаў Смаленскага універсітэта пакінуў прафесар В. А. Юдэніч, які вучыўся ў 1920-х гг. на медыцынскім факультэце СДУ: «Тагачаснае студэнцкае жыццё было зусім не лёгкім... Інтэрнатаў для студэнтаў тады не было. Стыпендый ў першыя гады вучобы ніхто не атрымліваў. Дапамагала студэнцкая «біржа працы», якая шукала падпрацоўкі для бедных студэнтаў на чыгуначнай станцыі, дзе мы грузілі вагоны, на інтэнданцкіх, кааператыўных і дравяных складах. Гэта ... школа жыцця шмат чаму нас навучыла і запомнілася назаўсёды... Вельмі добра памятаю як аднойчы падаў дождж, і я, каб зберагчы свае адзіныя, моцна зношаныя боты, басанож ішоў праз увесь горад на Пакроўку здаваць экзамены»[72].

Смаленскае студэнцтва, а разам з ім і выкладчыкі, вынаходзілі розныя сродкі, каб паправіць матэрыяльны стан навучэнцаў.

Першым шляхам папаўнення сціплага матэрыяльнага становішча студэнтаў была так званая каса ўзаемадапамогі, якая шляхам пастаноўкі вечароў і спектакляў арганізоўвала дапамогу студэнтам. Магчымасці касы ўзаемадапамогі, па сведках, былі вельмі малаважнымі, таму адмысловыя «тыдні дапамогі студэнцтву», якія ладзіліся з мэтай папаўнення касы, не маглі сур'ёзна паправіць іх цяжкага фінансавага становішча.

Аднак для большай часткі студэнтаў сродкамі існавання быў заробак пры разгрузцы вагонаў на станцыі, часткова на заводзе імя Калініна і ў пакхаўзах Губернскага харчовага камітэта. Для пошуку працы і размеркавання яе сярод студэнтаў, была створана спецыяльная камісія. Камісія брала падрады, якія выконваліся студэнтамі, на розныя работы, уключна да чысткі базарнай плошчы.

Тым не менш, падзённай працы на ўсіх не хапала. Прыкладам, за апошнія тры месяцы 1925 года у Смаленску працавала ўсяго 137 чалавек пры дзённым заробку ад 90 капеек да максімальнай сумы ў 1 рубель 25 капеек. Арганізаваная для студэнцтва сталовая не магла задаволіць патрабаванняў студэнцкай масы, бо ў ёй абедалі толькі 15% навучэнцаў.

Што тычыцца харчавання, то яно было нездавальняючым. У справаздачы па Педагагічным інстытуце г. Смаленска узімку 1930 года сцвярджалася, што сакратарыят Абкаму не выканаў абяцання паспрыяць лепшаму харчаванню сярод студэнтаў. Больш таго, інстытуцкая сталовая была выключана з мясаразмеркавальнага плана. У снежні 1930 года у інстытуце давалі мяса толькі тры разы, замест раней запланаваных чатырох. З такім харчам студэнты як смаленскіх, так і агульнасавецкіх навучальных устаноў ледзь зводзілі канцы з канцамі, з'едліва даводзячы ў вершаванай форме:

Обед, скажу без лишних слов
И сохранив серьёзность тона,
Содержит менее жиров,
Хотя бы чем «бином Ньютона»[73].

Для дапамогі студэнтам існавалі і грашовыя крэдыты, якіх на ўсіх не хапала, а карысталіся ім, у асноўным, рабфакаўцы. За апошнія тры месцы 1925 года крэдыт выразіўся ў суме 7.641 руб., чаго было недастаткова[74].

Але ўсё гэта насіла эпізадычны, несістэмны характар, не даючы магчымасці навучэнцам забяспечыць сябе пражытковым мінімумам.

У 1924–25 навучальным годзе ў Смаленскім універсітэце стыпендыі размяркоўваліся на 231 студэнта, якія атрымлівалі грашовую дапамогу ад Галоўпрафобра (127 стыпендый), Губвыканкама (22 стыпендыі), прафсаюзаў (26 стыпендый), а таксама ад другіх губерній і розных устаноў (56 стыпендый).

Па дадзеных смаленскага губпрафсавета студэнты «асноўных» факультэтаў атрымлівалі 257 дзяржаўных стыпендый і 83 ад Губвыканкама, а менавіта, 160 стыпендый было для Педфаку, а 167 — Медыцынскаму факультэту[75].

Нам невядома чаму лічбы двох пададзеных вышэй крыніц адрозніваюцца між сабою, але, верагодна, афіцыйная прафсаюзная статыстыка насіла менш аб'ектыўны характар, улічваючы пашыраныя тады прыпіскі ў мэтах «упрыгожыць» цяжкае становішча студэнтаў. Аднак, прафсаюзныя органы былі вымушаны пагадзіцца, «что материальное положение студенчества ещё чрезвычайно тяжёлое».

Мы бачым, што ні падпрацовак, ні паралельнай працы ва ўстановах, ні натуральных відаў дапамогі ў выглядзе льгот пры праездзе па чыгунцы, а таксама прадстаўлення на льготных умовах інтэрнатаў, льготаў пры аплаце камунальных паслугаў, льготаў па аказанні медыцынскай дапамогі і снабжэнні курортнымі месцамі — усяго гэтага не было дастаткова для падтрымання прымальнага ўзроўню жыцця студэнтаў.

Цалкам зразумела, што студэцтва з беларускіх зямель імкнулася выкарыстаць кожную магчымасць, каб палепшыць свой матэрыяльны стан. Адной з мэтаў Беларускага зямляцтва, згодна яго статуту, якраз і была матэрыяльная дапамога сваім членам.

Бюро смаленскага зямляцтва разглядала заявы аб аказанні матэрыяльнай дапамогі даволі часта. Грошы размяркоўваліся галоўным чынам паміж студэнтамі той акругі, адміністрацыя якой адпускала аб'яднанню фінансы.

Так, на просьбы аб матэрыяльнай дапамозе, пададзеныя шэрагам студэнтаў у лютым 1928 г., зямляцтва адказала станоўча толькі ў тым выпадку, калі студэнты былі родам з Аршанскай акругі. Моладзь вырашыла «…грошы, адпушчаныя Аршанскай акругай, размеркаваць толькі між студэнтаў гэтай акругі». Памер адначасовай фінансавай дапамогі быў невялікім, максімальна складаючы траціну стыпендыі — 5 рублёў, у той жа час асноўная маса навучэнцаў атрымлівала толькі 2 рублі. Студэнты, якія паходзілі з іншых акруг, вымушаны былі чакаць сваёй чаргі.

Адсюль яшчэ адзін сродак адшукання грошай — выдзяленне членаў зямляцтва па акругах Беларусі на пошукі фінансавання. Студэнту Кліму, да прыкладу, 14 снежня 1927 года прапаноўвалася на працягу двух дзён адшукаць на рабфаку валанцёраў, жадаючых заняцца ў сваіх акругах пошукам сродкаў, Марыі Чунаевай трэба было зрабіць тое ж самае ў Саўпартшколе. Абраныя студэнты павінны былі шукаць грошы ў час зімовых канікулаў па месцах жыхарства, звяртаючыся ў акруговыя інстанцыі.

На пасяджэнні 15 студзеня 1928 г. было вырашана скласці спіс членаў Беларускага зямляцтва з Мінскай акругі, і ў трохдзённы тэрмін адаслаць яго ў Мінскі акруговы выканаўчы камітэт. Тое ж самае рабілася па Мазырскай акрузе. Членам арганізацыі з Аршаншчыны паведамлялася аб тым, што Бюро зямляцтва атрымала ад іх Акружнога выканкаму 50 рублёў, якія потым былі між імі размеркаваны. Таксама было вырашана скласці спіс членаў зямляцтва Віцебскай акругі і паслаць яго з просьбай аб дапамозе сваім землякам, якія жылі ў надзвычай цяжкім матэрыяльным становішчы.

Пошук сродкаў для аказання матэрыяльнай дапамогі вёўся зямляцтвам увесь час. Прычым, справа не абмяжоўвалася адсыланнем прашэнняў па акругах і выдзяленнем адказных студэнтаў. Як адзначалася вышэй, студэнты штомесячна збіралі з кожнага свайго члена ўзносы памерам у 5 капеек. Раз-пораз з гэтых грошай удавалася аказваць невялікую матэрыяльную дапамогу асобным «сябрам», якія знаходзіліся ў самым цяжкім матэрыяльным становішчы.

Карціну вельмі абмежаваных фінансавых магчымасцяў зямляцтва можа адлюстраваць і яго зайздросная ўпартасць у дасыланні лістоў у Пралетстуд БССР з просьбамі аб грашовай дапамозе. Выканаўчае бюро Смаленскага дзяржаўнага універсітэта разам з Белсекцыяй звычайна падтрымлівалі гэткія звароты: у СДУ па-ранейшаму былі беларускія аддзяленні, а на Смаленшчыне працягвалася беларусізацыя.

Так, Смаленскі аддзел народнай адукацыі ў сваім звароце да ЦБПС Беларусі падкрэсліваў, што «... Белсекция Смолгубоно поддерживает просьбу землячества об оказании ему материальной помощи и зачислении его в число белорусских землячеств, т.к. землячество...нуждается в денежной помощи»[76]. Просьба аб матэрыяльнай дапамозе матывавалася тым, што суполка не толькі праводзіла актыўную культурна-асветную працу, але і мела ў сваім штаце шмат беларускіх студэнтаў, якім тэрмінова патрабавалася падтрымка.

Як заўжды, самую актыўную ролю ў розшуку грошай па ўсіх крыніцах граў загадчык Белсекцыі і старшыня зямляцтва Ус. Ганчароў, які, у рэшце рэшт, дамогся прыняцця абъяднання ў лік сталых зямляцтваў і асацыятыўных членаў Пралетарскага студэнцтва БССР. На думку старшыні гэта магло істотна дапамагчы арганізацыі.

ЦБ Пралетстуда БССР, як адзначалася, гэта кіруючы орган прафесійна арганізаванага беларускага студэнцтва, які быў створаны ў верасні 1923 года ў Мінску з мэтай аказання камуністычнага ўплыву, уцягнення ў грамадскую працу і абароны інтарэсаў студэнтаў-членаў прафсаюза. Спачатку арганізацыя называлася Беларускае бюро пралетарскага студэнцтва, а з 1926 года — ЦБ Пралетстуда. У яго ўваходзілі Віцебскае, Магілёўскае і Гомельскае гарбюро. ЦБ аб'ядноўвала прафкамы і выканаўчыя бюро прафсекцый ВНУ, тэхнікумаў, рабфакаў і саўпартшколаў Беларусі, беларускіх студэнцкіх зямляцтваў ВНУ СССР. ЦБ Пралетстуда выбіралася на канферэнцыі, складалася з 15 членаў і 5 кандыдатаў, кіравалася прызідыумам з 5 членаў і 2 кандыдатаў. У 1924–1930 гг. ЦБ правяло 6 канферэнцый, на якіх акрамя справаздач ЦБ і Наркамасветы ставіліся агульнапалітычныя пытанні, на якіх з дакладамі выступалі кіраўнікі Беларусі.

Сваю працу ЦБ праводзіла праз арганізацыйную, акадэмічную, культурна-асветную і эканамічную камісіі. У розныя гады прафсаюзамі былі ахоплены ад 22 да 52% студэнтаў. Прычым, пры паступленні ў іх ўлічваўся сацыяльны статус і праводзіўся палітычны экзамен. У Пралетстуд звычайна прымаліся студэнты старэйшых курсаў, актывісты грамадскай працы. У снежні 1926 года з 9707 студэнтаў членамі прафсаюзаў былі 5570 чалавек. Студэнцкія прафсаюзныя арганізацыі, якія ўваходзілі ў ЦБ Пралетстуда, будаваліся паводле вытворчага прынцыпу за выключэннем рабфакаў. ЦБ мела сваіх прадстаўнікоў у калегіі Галоўпрафасветы, межведамаснай камісіі па размеркаванні на працу і практыку, на біржы працы, у праўленнях і дэканатах ВНУ.

Студэнцкія прафкомы ўдзельнічалі ў абмеркаванні вучэбных планаў, распрацоўцы метадычных матэрыялаў, уплывалі на фарміраванне прыёмных камісій і камплектаванне вышэйшых і сярэдніх школаў, размеркаванне студэнтаў на працу і вытворчую практыку.

З 1928 года Цэнтральнае Бюро ва ўмовах нарастання камандна-адміністратыўнага дыктату праяўляла актыўнасць ў барацьбе з «праявамі чужой ідэалогіі», ачышчэнні ад «сацыяльна-чужога элементу», «пралетарызацыі» навучальных устаноў. Студэнцкія прафсаюзы ўдзельнічалі ва ўсіх кампаніях, што праводзіла партыя.

Працай Беларускага бюро кіравала, акрамя ЦСПСБ і галіновых прафсаюзаў, яшчэ і Маскоўскае цэнтральнае бюро Пралетстуда пры ВЦСПС. У 1925 годзе ЦБ выпускала часопіс «Чырвоны сцяг», а ў 1929–1930 гг. радыёгазету «Чырвоны студэнт». Для дзейнасці ЦБ Пралетстуда быў характэрны фармалізм, адсутнасць рэальнага дэмакратызму. Паводле пастановы прызідыума ВЦСПС ад 01.07.1932 г. функцыі па працы сярод студэнцтва былі перададзены ад Пралетстуда да Аргбюро студэнцкіх секцый ВЦСПС, што існавала да 01.06.1937 г.[77].

Як казалася раней, менавіта фінансавыя цяжкасці падштурхнулі студэнтаў Смаленскага зямляцтва звярнуцца да ЦБ Пралетстуда аб залічэнні ў яго склад. Прыняцце зямляцтва ў склад Пралетстуда абяцала забеспячэнне грашовымі субсідыямі ды іншага кшталту дапамогай.

Да ўваходу ў склад ЦБПС, Беларускае зямляцтва мела вопыт атрымання невялікай дапамогі ад вышэй адзначанай структуры. Напрыклад, 9 ліпеня 1927 года прадстаўніком зямляцтва М. Чадовічам была атрымана расписка «... ад ЦБ Пралетстуду для Смаленскага беларускага зямляцтва» ў атрыманні аднаго камплекту часопіса «Савецкае будаўніцтва».

Працэс прыняцця смаленскага зямляцтва ў прафсаюз зацягнуўся на даволі працяглы час. З Мінску быў запатрабаваны адмысловы спіс «з паказаннем грунтоўных ведаў аб сябрах зямляцтва (узрост, пол, сацыяльнае становішча, партыйнасць, мясцовасць паходжання і інш.)».

Дасылаючы 2 жніўня 1927 г. ў мінскі Палац працы спісы членаў зямляцтва за 1926–1927 гг. навучальны год, Выканбюро СДУ ад свайго імя прасіла залічыць зямляцтва ў лік сталых беларускіх зямляцтваў і аказаць яму магчымую матэрыяльную дапамогу.

Універсітэт падкрэсліваў, што на 1927–1928 н.г. зямляцтва павінна было павялічыцца прыблізна ў 2 разы, бо адкрывалася 2 новых беларускіх аддзяленні рабфака і адно Саўпартшколы.

Больш чым праз тры месяцы Выканбюро СДУ зноў накіроўвае паперу ў БССР. Ліст аказаўся больш пераканаўчым. Намеснік загадчыка Выканбюро Ляўцоў і яго сакратар Рысберг цвярджалі, што наяўнасць нацыянальнага аддзялення на Рабфаку (каля 90 чалавек) і Саўпартшколе (каля 30 чалавек), а таксама беларусаў-навучэнцаў у другіх навучальных установах, рабіла неабходнай арганізацыю сярод іх дастатковай асветнай працы. Яшчэ раз гучаў заклік аб выдзяленні грошай на падтрымку найбольш бедных беларусаў.

Само зямляцтва таксама звязалася з Пралетстудам БССР і, даслаўшы ў ЦБ неабходныя дакументы, хадайнічала аб залічэнні.

У Мінску справу Беларускага студэнцкага зямляцтва разглядалі да канца лістапада 1927 г. і, у рэшце рэшт, афіцыйна залічылі аб'яднанне ў склад беларускага Пралетстуда. Нягедзячы на спадзяванні моладзі, гэта не вырашыла ўсіх іх матэрыяльных цяжкасцяў. Фінансавыя магчымасці зямляцтва хоць і палепшыліся, але не настолькі істотна, каб казаць пра канец усіх праблем.

Па каштарысу на Беларускае зямляцтва выдзялялася ўсяго 300 рублёў на год, чаго было відавочна недастаткова, улічваючы шматлікія накірункі яго дзейнасці. Перасланыя з Беларусі грошы ў першую чаргу размяркоўваліся між студэнтамі, а потым ужо ішлі на цякучыя затраты зямляцтва. У кастрычніку 1928 г., калі адбываліся перавыбары Праўлення, рэвізійная камісія ў асобе студэнта Гамаліцкага сцвярджала, што грашовы прыход зямляцтва раўняўся 353 рублям 31 капейцы, калі «па расходу» значылася 236 рублёў 351 капейка. Зямляцтва, уступіўшы ў Пралетстуд, па-ранейшаму вымушана было камплектаваць свой бюджэт не толькі з яго дапамогай, але і за кошт узносаў, грашовых асігнаванняў з трэціх арганізацый, уласнай касы ўзаемадапамогі.

У той жа час, напружаныя адносіны склаліся між Смаленскім зямляцтвам і Гомельскім студэнцкім зямляцтвам. Вядома, што на жнівень 1927 года Гомельскае зямляцтва павінна было ўліцца ў штат Беларускага зямляцтва[78]. Галоўнай прычынай нацягнутых адносінаў між зямляцтвамі было тое, што Смаленскае зямляцтва патрабавала насуперак жаданням гамяльчан, каб яны ўліліся ў агульнабеларускую структуру. Гэта жаданне з боку Праўлення было матывавана як ідэалагічнымі перакананнямі, так і практычнымі, бо ў гамяльчан былі як грашовыя сродкі, якія яны атрымлівалі з Гомельшчыны, так і такое жадаемае Усеваладам Ганчаровым памяшканне для дзейнасці зямляцтва. Справа аб зліцці Гомельскага зямляцтва з агульнабеларускім не была вырашана і ў 1929 годзе.

Такім чынам, мы бачым, што формы працы зямляцтва ў асноўным супадалі з дэкларованымі ў статуце мэтамі арганізацыі. Тым не менш, аказанне фінансавай дапамогі членам зямляцтва, якое мела стаць асноўнай мэтай арганізацыі, праводзілася слаба. Матэрыяльная дапамога ажыццяўлялася ў выглядзе адначасовых грашовых выплат, сфармаваных на аснове сродкаў, атрыманых ад Пралетстуда БССР, мясцовых органаў улады, акругаў Савецкай Беларусі. У адрозненні ад аказання фінансавай дапамогі, культурная праца з'яўлялася асноўнай сярод членаў Беларускага зямляцтва, раскрываючы яго нацыя-

нальны характар. Яна заключалася ў працы гурткоў беларусазнаўства, струнным, драматычным і харавым, якія аб'ядноўвалі як студэнтаў СДУ, так і навучэнцаў смаленскіх тэхнікумаў. Акрамя дэкларацыяваных функцый, студэнты займаліся распаўсюджваннем беларускага перыядычнага друку, аказвалі шэфскую дапамогу беларускім школам губерні, спрыялі паляпшэнню студэнцкага быта. Дзейнасць арганізацыі ўказвае на яе нацыянальную арыентаванасць.

Улетку 1928 года некаторыя члены зямляцтва з педагагічнага факультэта СДУ святкавалі ў губернскім Доме працаўнікоў асветы заканчэнне універсітэта. Вядомы пісьменнік Максім Гарэцкі, які праездам апынуўся ў горадзе, узгадвае гэты выпадак у сваім творы-дзённіку «Кіпарысы». На выпускным вечары беларускі пясняр пазнаёміўся з некалькімі студэнтамі, якія распавялі яму пра свой беларускі гурток і нацыянальны ўхіл на рабочым факультэце.

М. Гарэцкаму не вельмі спадабалася нацыянальная праца ў СДУ і ён са скрухай занатоўвае, што «... апрача [беларускага] гуртка і [беларускага] ўхілу на аддзяленні рабфаку нічога [беларускага] ў [Смаленскім] універсітэце няма»[79]. Пабываўшы пасля выпускнога ў рэктара СДУ прафесара М. М. Равінскага, пісьменнік гутарыў з ім пра беларускую кафедру, якая па словах прафесара была толькі на паперы, бо грошай на яе не было: Масква сродкі не магла выдзяліць, а Мінск гэтага рабіць не хацеў. «А калі грошы, — сцвярджаў Равінскі, — катэдра хоць зараз».

Выпускніком 1928 г. быў і былы старшыня закрытай Беларускай секцыі, а таксама галава Беларускага зямляцтва, Усевалад Ганчароў. Верагодна, прыняўшы ўдзел у Першым з'ездзе беларускіх асветнікаў РСФСР ў верасні 1928 г., а таксама правёўшы свой апошні агульны сход, Ганчароў паехаў працаваць па размеркаванні[80]. Далейшы лёс старшыні зямляцтва нам не вядомы. Адзіныя даступныя нам звесткі сведчаць, што ў 1929 годзе Усевалад Ганчароў трапіў у цяжкае матэрыяльнае становішча. Захавалася заява былога старшыні Белзямляцтва ад 29 сакавіка 1929 года, у якой ён пісаў:

> «У сувязі з маім цяжкім сучасным матэрыяльным і сямейным становішчам, прашу Бюро зямляцтва зрабіць мне матэрыяльную дапамогу і выдаць мне з сродкаў зямляцтва 25 рублёў. Даваджу да ведама Бюро, што мною ў час маёй працы ў Бюро было страчана каля 10 руб. на паездку ў Менск па справах зямляцтва. Але з прычыны адсутнасці ў той час сродкаў у Зямляцтве, гэтыя грошы мне не звярнуліся. Гэткім парадкам я прашу звярнуць 10 руб. і выдаць, як дапамогу, 15 рублёў. Вельмі прашу не адмовіць. Ус. Ганчароў»[81].

Пралетстуд, у адказ на заяву былога беларускага актывіста, паведамляў

> «што ... не супярэчыць супраць выдзялення т. Ганчарэнку (Ганчарову — *Ф.Б.*) 10 рублёў ва ўплату за камандыроўку».

Замест Ус. Ганчарова старшынёй зямляцтва стаў студэнт СДУ, ураджэнец Вяліжскага павета Іван Дубінец. Гэты студэнт кіраваў зямляцтвам да сакавіка 1929 года. Гэта і ёсць апошняя вядомая дата ў біяграфіі зямляцтва. Прыкладна тады ж абарвалася праца беларускіх зямляцтваў у Ленінградзе, Маскве, Кіеве, Томску ды іншых гарадах. Нам да гэтага часу невядома, з-за якой прычыны спыняе сваю дзейнасць Беларускае студэнцкае зямляцтва ў Смаленску. Тым

не менш, шэраг ускосных сведчанняў указвае на прымусовую ліквідацыю арганізацыі, што прадугледжвалася яе статутам.

Па-першае, варта адзначыць, што ліквідацыя Беларускага зямляцтва магла адбыцца ў сувязі з асаблівым націскам на студэнцкія арганізацыі з боку цэнтральных уладаў, які ўзмацняецца з 1929 года — ва ўсіх адносінах пераломнага не толькі для студэнцтва, але і ўсяго насельніцтва Савецкай краіны. Уступіўшы ў склад Пралетстуда БССР, смаленскае Беларускае студэнцкае зямляцтва, падкантрольнае мясцовым органам улады і адміністрацыі СДУ, вымушана было ўзгадняць сваю работу ў выніку і з афіцыйным студэнцкім прафсаюзам.

У 1929 г. у Маскве адбываецца III Усесаюзны з'езд пралетарскага студэнцтва, на якім былі прыняты шматлікія пастановы, арыентаваныя на новыя з'явы ва ўнутрыпалітычным курсе СССР. Студэнцкія арганізацыі, згодна рэзалюцыі з'езда, павінны былі бачыць асноўную задачу сваёй дзейнасці ў актывізацыі рэформы школы, мабілізуючы вакол гэтай работы ўсю студэнцкую моладзь. Запланаваная рэформа дапускала не толькі перабудову сістэмы навучання і ўзмацненне сувязі навучальных устаноў з вытворчасцю, але і выхаванне ў сценах ВНУ студэнтаў новага сацыялістычнага гатунку. З'езд падкрэсліваў, што

> «...помимо участия в работе по перестройке школы, основной задачей студенческих организаций является обеспечение подготовки из студентов таких специалистов, которые на деле могли бы быть активными участниками социалистического строительства»[82].

Зыходзячы з гэтага, на III Усесаюзным з'ездзе ЦБ Пралетстуда ставіла перад сабой асноўную задачу па засяроджванні ўвагі прафесійных студэнцкіх арганізацый на пытаннях грамадска-палітычнага выхавання навучэнцаў, а таксама выказала сваім нізавым арганізацыям прэтэнзіі, звяртаючы іх ўвагу на нездавальняючы стан выхаваўчай працы.

Адстойваючы лінію І. В. Сталіна на абвастрэнне класавай барацьбы з «унутраным ворагам», вярхушка пралетарскага студэнцтва абвяшчала аб неабходнасці узмацнення кантролю над настроямі студэнцкай масы ў сувязі з тым, што «агульнае абвастрэнне класавай барацьбы ў краіне знайшло свае адлюстраванне і ў асяродку студэнцтва». З'езд пралетарскага студэнцтва прызнаваў, што прафсаюзныя студэнцкія арганізацыі недастаткова ўлічвалі ў сваёй працы розныя настроі сярод асобных груп маладзёжы і не заўсёды рэагавалі на пранікаючую ў шэрагі студэнтаў «непралетарскую» ідэалогію.

Вядома, Беларускае зямляцтва не магло не ўвайсці ў лік «непралетарскіх» ці «варожых» арганізацый, бо гуртаванне студэнтаў у арганізацыі адбывалася не па класавай, а нацыянальнай прыкмеце. Відавочным парушэннем статута зямляцтва з'яўлялася тое, што ў яго шэрагі прымаліся смаленскія беларусы, якія не былі ўраджэнцамі БССР, і, адпаведна, не маглі ўваходзіць у арганізацыю.

Павёўшы «самую решительную борьбу с направлениями, враждебными идеологии пролетариата и делу его социалистического строительства», ЦБ Пралетстуда, хутчэй за ўсё, у некаторых выпадках пазбавілася ад сваіх нацыя-

нальных студэнцкіх структураў, засяродзіўшыся на класавай рабоце і, да таго ж, сэканоміўшы грошы, якія раней выдзяляліся зямляцтвам. Прычым, да канца не зразумела, што ж з'яўлялася асноўнай прычынай ліквідацыі зямляцтваў рукамі ЦБ Пралетстуда: жаданне вызваліць вядомыя грашовыя сродкі, якія раней ішлі на дапамогу зямляцтвам, палітычны курс на барацьбу з класавым ворагам ці ўсё агулам.

Так, напрыклад, Варонежскае беларускае зямляцтва, не зважаючы на актыўны пратэст сваіх членаў, было распушчана Цэнтральным бюро нібы з-за фальсіфікацыі сваёй актыўнай дзейнасці і падробку афіцыйных справаздач. У прынцыпе, прыпіскі і скажэнні на паперы былі тады даволі пашыранай з'явай на ўсіх узроўнях, таму верагодна, што парушэнні з боку зямляцтва сапраўды мелі месца. Але наўрад ці прыходзіцца сумнявацца, што падробка дакументацыі была толькі повадам для ліквідацыі. Хутчэй за ўсё, Варонежскае зямляцтва стала першым з ліку беларускіх студэнцкіх зямляцтваў, якое стала ахвярай новай палітыкі абвастрэння класавай барацьбы, паступовага згортвання беларусізацыі і наступу на нацыянальную інтэлігенцыю.

Студэнцкае зямляцтва — гэта заўсёды арганізацыя з вельмі актыўным складам, які цікавіцца палітыкай, а ў нашым выпадку, носіць нацыянальны характар. Псіхалогію студэнта, які прыехаў на вучобу, добра апісала даследчыца расійскага студэнцтва Н. Я. Алесіч: «... такі студэнт аглушаны шумам вялікага горада, выбіты з каляіны звыклага жыцця, адзінокі, і тут яго пачынае лавіць крамола... у зямляцтве», якое характарызуецца як адзін з цэнтраў палітычнай актыўнасці[83]. Такая сітуацыя рана ці позна павінна была прывесці да канфлікту з урадавымі ўстановамі.

Што тычыцца Беларускага зямляцтва ў Смаленску, то ў пачатку 1929 г. яму было вынесена першае папярэджанне. Захаваўся дакумент — пратакол пасяджэння зямляцтва, у якім адзначалася неабходнасць ліквідаваць харавы гурток, які пад час выступу ў Савецкай партыйнай школе «скампраментаваў сябе як нацыянальны». Не вядома, што канкрэтна не спадабалася кіраўніцтву Саўпартшколы ў выступленні беларускага хору, але можна дапусціць, што яго рэпертуар не ўключаў савецкіх песень, замест якіх спяваліся беларускія нацыянальныя творы. Гэты выпадак быў даволі сімптаматычным, прымаючы да ўвагі стартаваўшую з пачатку 1929 г. чыстку смаленскіх навучальных устаноў.

У лютым 1929 г. рэктар Смаленскага універсітэта М.М. Равінскі вымушаны быў падаць «па асабістым жаданні» ў адстаўку, вызваляючы свае месца прызначанаму з Масквы камуністу Белкіну. На самой справе, гэтая акцыя была запланавана ўрадам, які замяніў не толькі безпартыйнага рэктара СДУ, але і ўсіх універсітэцкіх дэканаў. З гэтага часу пачынаецца актыўны наступ на прафесарска-выкладчыцкі склад, які паступова расфарміроўваецца і папаўняецца новаспечанай партыйнай прафесурай. Напрыклад, сумна вядомы былы кіраўнік Белсекцыі Хенах быў прызначаны выкладчыкам гісторыі партыі, хоць не меў ніякай вышэйшай адукацыі і не апублікаваў ніводнай навуковай працы.

З прыходам новага рэктара Белкіна ўзмацняецца кантроль над студэнцкім складам універсітэта, які, па пастанове мясцовага абкаму, трэба было максімальна вычысціць і камунізаваць. Сфарміраваная гарадскім кіраўніцтвам ка-

місія павінна была рэгулярна рапартаваць аб поспехах чысткі шэрагаў навучэнцаў.

Увесну, 9 мая 1929 г., камісія агучыла вынікі сваёй працы. Яна заўважыла некаторыя «паляпшэнні» ў сацыяльным складзе студэнцкай масы, якія сталі рэальнасцю дзякуючы прамым загадам смаленскага абкаму. Партыйныя кадры сярод новапаступіўшых студэнтаў складалі ўжо 15.4 % у параўнанні з 5.2% ў 1928 годзе. Колькасць членаў Камсамола павялічылася з 22.1% да 38.9 %, у той час, калі прадстаўнікоў рабочых і сялян стала 72.3% замест ранейшых 42 %.

Нягледзячы на відавочныя поспехі, камісія ўсё адно па-ранейшаму была незадаволена. Справа ў тым, што толькі 14 новаспечаных студэнтаў былі выпускнікамі рабфака, астатнія жа 290 чалавек (81 %) з'яўляліся выпускнікамі сярэдніх школ, а значыцца былі студэнтамі, залічанымі ва універсітэт без адрыву ад вытворчасці. Гэтая карціна псавала ўсе планы кіраўніцтва цалкам камунізаваць універсітэт, запоўніўшы яго былымі пралетарыямі.

За зімова-вясновы перыяд 1929 г. абкамаўская камісія паспела выключыць з СДУ 45 студэнтаў, пераважна за ўтойванне іх сямейнага паходжання і «антысемітызм». Камісія падкрэслівала, што кампанія па «чыстцы» СДУ была недастаткова інтэнсіўнай і выказвала думку, што не менш 200 студэнтаў трэба было тэрмінова выключаць за тое, што яны адназначна былі «варожымі элементамі»[84].

Наогул, у 1928–29 гг. на тэрыторыі Смаленскай губерні ішлі вельмі «плотныя» і маштабныя чысткі па ўсіх накірунках: ад партыйных ячэек да праваахоўных органаў. Так, да разбірання так званага «смаленскага нарыва» ў 1929 г. у губернскай камсамольскай арганізацыі налічвалася 22.568 чалавек. Праверка, у выніку, паказала, што фактычна членаў КСМ было ў два разы меней — 10.925 чалавек. З заяўленых 1032 ячэек «не хапіла» і было распушчана 110. З распушчаных як «чуждые» — 29 %, як неіснаваўшыя — 42 %, як малакольскасныя — 29%. Персанальна выключылі з камсамола 1467 чалавек ці амаль кожнага сёмага члена арганізацыі.

Рэзалюцыя бюро Смаленскага губкама ВЛКСМ ад 3 сакавіка 1929 года пацвярджала «нездавальняючы» стан калектыва Смаленскага універсітэта і выказвалася за пастаноўку пытання аб чыстцы навучальнай установы «у сувязі з вялікай засмечанасцю універсітэта непрыхільным элементам»[85].

Падаецца правільным думаць, што смаленская суполка трапіла ў віхуру факультэцкіх чыстак, праводзіўшыхся вясной 1929 года, і была або распушчана мясцовымі органамі ўлады, або прымушана да самароспуску.

Упамянуты вышэй выпадак з харавым гуртком, мог стаць адной з прэтэнзій зямляцтву, дзейнасць якога маглі лёгка асудзіць за «правы» ці «нацыяналістычны» ўхіл. Акрамя таго, зямляцтву маглі напомніць і іншыя грахі: ад пастаноўкі п'есы асуджанага Францішка Аляхновіча да настойлівых патрабаванняў адчыніць беларускую дзесяцігодку, матываваных тым, што беларускія вучні вымушаны былі ісці ў рускамоўную школу. Цалкам верагодна, што сярод выключаных членаў ВКП(б), КСМ у час ліквідацыі «смаленскага нарыву» былі і «сябры» Беларускага зямляцтва, што магло кінуць на яго цень падазрону.

Да таго ж, адметнымі з'яўляюцца сувязі Белзямляцтва з палітэмігрантамі з Заходняй Беларусі. Вядома, што смаленскае Таварыства палітэмігрантаў Заходняй Беларусі было даволі шматколькаснай структурай. Так, у «развёрстцы месцаў на беларускія аддзяленні рабфакаў» ад 5 чэрвеня 1926 года сцвярджалася, што Таварыству палітэмігрантаў Заходняй Беларусі адводзілася 10 месцаў ў Смаленскі дзяржаўны універсітэт. Вядома, што лёс палітычных эмігрантаў з Польшчы з нарастаннем масавых рэпрэсій быў незайздросным, таму не выпадае сумнявацца, што сувязі Белзямляцтва з эмігрантамі былі кампраментуючымі для арганізацыі.

Ліквідацыя Беларускага зямляцтва ў Смаленску ў 1929 годзе наўрад ці аўтаматычна падпісвала смяротны прысуд яго актывістам. Як пісала амерыканская даследчыца Вольга Наркевіч, рэжым тэрора ў 1929 годзе быў яшчэ ў сваёй першапачатковай стадыі[86]. Беларускім студэнтам, відавочна, прапаноўвалася сканцэнтраваць сваю грамадскую актыўнасць на агульнасавецкіх студэнцкіх арганізацыях, прафсаюзных секцыях, ВЛКСМ ці ячэйках МОПРу, Асавіяхіму, пунктах ліквідацыі непісьменнасці.

Некаторыя члены Беларускага зямляцтва, наогул, здолелі пазбегнуць рэпрэсій 1930-х гадоў, напрыклад, як член зямляцтва С. І. Матускоў родам з мястэчка Дуброўна Аршанскай акругі, які скончыў ў 1928 годзе медыцынскі факультэт СДУ. Былы член зямляцтва ў будучыні стаў вядомым вучоным і са снежня 1951 г. займаў пасаду дырэктара Адэскага навукова-даследчага скурна-венералагічнага інстытута. У 1967 г. С. Матускоў абараніў доктарскую дысертацыю па праблемах венералагічных захворванняў[87].

Не так светла склалася жыццё найбольш актыўных членаў зямляцтва. Вядома, што былы член Цэнтральнага бюро смаленскага Беларускага зямляцтва В.С. Клім увосень 1934 г. вярнуўся з СССР к сабе дамоў, у Заходнюю Беларусь. Верагодней за ўсё, перайшоўшы мяжу нелегальна, экс-камсамолец В. Клім такім кшталтам «прагаласаваў нагамі» за Савецкую краіну. Больш таго, будучы па натуры даволі актыўнай асобай, былы смаленскі рабфакавец вельмі грунтоўна ўключыўся ў мясцовую беларускую дзейнасць.

З сакавіка 1935 г. «Студэнцкая трыбуна» — дадатак да газеты «Беларуская крыніца» — у сваім артыкуле, прысвечаным жыццю беларускіх студэнтаў ў СССР, пісала, што «…у восені мінулага году (1934 г. — Ф.Б.) грамадзянін Клім, каторы вярнуўся летам з Саветаў пасля доўгага там прабывання, на зборках, так званых «пятнічных», у Беларускім Інстытуце Гаспадаркі і Культуры зрабіў некалькі дакладаў аб жыцці ў Саветах. Паміж іншым, успомніў у іх і аб жыцці студэнцкім, прадстаўляючы яго ў дрэнных колерах»[88]. Негатывізм Кліма да Савецкай улады добра адлюстроўваюць спрэчкі, якія ўзніклі пасля яго дакладаў: аўтару рабіліся закіды ў тэндэнцыйным прадстаўленні савецкага жыцця. Рэдакцыя «Студэнцкай трыбуны» стала абараняць Кліма, дзякуючы чаму і надрукавала адпаведны артыкул ў сваім выпуску.

Што здарылася далей з В.С. Клімам мы не ведаем, хоць і зразумела, што ўцёкі з СССР былі для яго тады паратункам.

У адрозненні ад свайго цёзкі і магчымага родзіча В. Кліма, студэнт рабфака СДУ, член Беларускага зямляцтва К.П. Клім, у Польшчу не вярнуўся, што каштавала яму жыцця. Ураджэнец в. Шані Пружанскага павета Гродзенскай гу-

берні, Канстанцін Клім, скончыўшы смаленскі рабфак, падаўся вучыцца ў Маскву. Пяцікурснік Маскоўскага інстытута чыгуначнага транспарта К. Клім быў арыштаваны 4 верасня 1937 г., і праз два месяцы прыгавораны за «шпіёнскую дзейнасць на карысць Польшчы» да вышэйшай меры пакарання. Былы член зямляцтва сустрэў сваю смерць на вядомым палігоне НКУС «аб'ект Бутава»[89].

Што тычыцца аднаго з першых «беларусізатараў» Смаленшчыны, першага загадчыка Беларускай секцыі і арганізатара Беларускага зямляцтва Мікалая Рыгоравіча Агейчыка, то ён толькі на пару дзён перажыў Канстанціна Кліма. Ураджэнец в. Байкі Слонімскага павета Гродзенскай губерні, М. Агейчык у свой час атрымаў вышэйшую адукацыю, і апынуўшыся на Смаленшчыне, уладкаваўся ў Губернскі аддзел народнай адукацыі, дзе і быў да свайго ад'езду «беларускім работнікам». На час арышту 5 мая 1937 г. Агейчык працаваў настаўнікам у школе-камуне на станцыі Забалоцінка Віцебскага раёна. Мікалай Агейчык быў асуджаны асобай нарадай пры НКУС СССР як «удзельнік дыверсійна-тэрарыстычнай арганізацыі» і за «шпіянаж на карысць Польшчы» да вышэйшай меры пакарання[90].

Трагічна абарвалася жыццё і былога «рэвізора» зямляцтва М.Г. Гамаліцкага, ураджэнца в. Звяняга Вольскага павета Смаленскай губерні. Былы студэнт СДУ, а падчас арышту інжынер Райміжлеспрамсаюза, Мікалай Гамаліцкі быў схоплены ў Ленінградзе і 9 верасня 1937 г. расстраляны за шпіянаж[91].

Даследчык Ю. Чудзін лічыць, што зямляцтва магло існаваць у пасіўным стане і пасля 1929 года. У 1930 г. ў смаленскай газеце выйшла заметка, у якой невядомы аўтар заклікаў дапамагчы мясцовым беларусам у стварэнні ўласнага клуба, а кастрычнікам 1931 г. датавана вельмі туманнае ўпамінанне аб існаванні ў Смаленску беларускай тэатральнай групы, якая, на думку Ю. Чудзіна, магла быць аскепкамі тэатральнага гуртка Івана Хацкевіча.

Аднак наўрад ці выпадае спадзявацца на тое, што Беларускае зямляцтва працягвала існаваць хоць і ў пасіўным стане пасля 1931 года, бо ўзмацніўшыся ўціск і новая хваля арыштаў практычна не давала такіх шанцаў.

У 1931 г. на старонках віленскай «Беларускай крыніцы» быў апублікаваны «пратэст Беларускага нацыянальнага камітэту ў Вільні ў справе пераследу камуністычнай уладай беларускага народу ў Усходняй Беларусі». Прадстаўнікі БНК сцвярджалі, што «... гэтакі пераслед працаўнікоў на ніве беларускай культуры мае месца не толькі ў Мінску, ... але і ў...Смаленску».

Такім чынам, можна зрабіць выснову, што спыненне дзейнасці зямляцтва адбылося не раней вясны 1929 года і насіла, верагодна, характар прымусовай ліквідацыі. Ліквідацыя ўяўляла сабой рэакцыю мясцовых органаў улады на змены ўнутрыпалітычнага курсу СССР у дачыненні да грамадскіх арганізацый і нацыянальнага пытання, і адбылася ў выніку «чысткі» Смаленскага дзяржаўнага універсітэта вясной 1929 года.

Крыніцы

[1] Седов В.В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. М., 1970, с. 192.

[2] Голубовский П.В.История Смоленской земли до начала XV ст. Киев: Университет Св. Владимира, 1895, с. 86.

[3] О порядке изменения границ губернских, уездных и прочих: Декрет СНК 27 янв. 1918 г. // Собр. Узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьянского Правительства (СУ). 1918, № 21, с. 318.

[4] К.Н. Космачев. Из истории Октябрькой революции на Западе России и образования Белорусской ССР // Этнография славянских народов /Под ред. В.А. Шулякова/ Смоленск, 2000, с. 113.

[5] Весь Смоленск и губерния на 1925-26 год. Смоленск, 1925, с. 31.

[6] Список губерний и уездов РСФСР, ССРБ и УССР. М., 1922, с. 10.

[7] Роджер Петибридж. Смоленская губерния в 1926 году. С. 126.

[8] Весь Смоленск и губерния на 1925 — 26 год. Смоленск, 1925, с. 79.

[9] Весь Смоленск и губерния на 1925 — 26 год. Смоленск, 1925, с.107.

[10] Кабузан В.М. Русские в мире. СПб., 1996, с. 257.

[11] Попов И. Белоруссия и белорусы / 2-е изд./ Москва, 1912, с. 3.

[12] Майков П.М. Белорусский край / Составил П.М. Майков/. СПб., 1898, с. 3.

[13] Сельскохозяйственная статистика Смоленской губернии. Составлена Яковом Соловьёвым, начальником бывшего смоленского отряда уравнения государственных крестьян в денежных сборах, на оснований сведений, собранных сим отрядом. М., 1855.

[14] Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Смоленская губерния / сост. Генерального штаба штабс-капитан М.Цебриков. — СПБ: типография Департамента Генерального штаба, 1862, с. 126.

[15] Живописная Россия / Под общ. ред. П.П. Семенова/ Репринт изд. 1882 г. Минск, 1994, с. 442.

[16] Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. XL Смоленская губерния. СПБ.: Издание центрального статистического комитета министерства внутренних дел. Под ред.Н.А. Тройницкого, 1904, с. XV.

[17] Первая всеобщая перепись населения Российской империи 1897 г. XL Смоленская губерния. СПБ.: Издание центрального статистического комитета министерства внутренних дел. Под ред.Н.А. Тройницкого, 1904, с. XVI.

[18] Луцкевіч А.І. Барацьба за вызваленне. Вільня — Беласток, 2009, с. 164.

[19] Дз.У. Дубінін. Этнічная тэрыторыя і дзяржаўныя межы беларусаў // Актуальныя праблемы станаўлення і развіцця беларускай дзяржаўнасці. Ч. 1: Гісторыя беларускай дзяржаўнасці ад старажытнасці да 1918 г. С. 145.

[20] Л.М. Козикова. Женский крестьянский костюм Смоленской губернии конца XIX — нач. XX веков (основные типы, комплексы) // Минск — Смоленск — Москва: этнография славянских народов / под ред. В.А. Шулякова/ Смоленск: СГПУ, 2000, с. 203.

[21] Расторгуев П.А. Говоры на территории Смоленщины. М., 1960, с. 21.

[22] Корсак А. Праблемы беларусізацыі ў Смаленскай губерні і Заходняй вобласці РСФСР у 1918-1938 гг. // Культура беларускага пагранічча: тэматычны зборнік навуковых прац. Кн. 6. Горкі — Брэст. 1999, с. 45.

[23] Корсак А. Беларусы на Смаленшчыне // Беларусіка. Кн.6.Ч. I. Мн., 1997, с. 307.

[24] Расторгуев П.А. Говоры на территории Смоленщины. М., 1960, с. 186.

[25] НАРБ. Ф. 6. Матэрыялы па ўзбуйненні і раяніраванні БССР. Воп 1. Спр. 346. арк.398.

[26] Казлоў Л., Цітоў А. Беларусь на сямі рубяжах. Мн., 1993, с. 50.

[27] НАРБ. Ф. 268. Цэнтральнае Бюро прафесійных саюзаў. Воп. 1. Спр. 61. арк. 35–37.

[28] Михалюк Д. Революция 1917 г. в России и белорусское национальное движение // Революционная Россия 1917 года и польский вопрос: новые взгляды. М., 2009, с. 114.

[29] Михалюк Д. Революция 1917 г. в России и белорусское национальное движение // Революционная Россия 1917 года и польский вопрос: новые взгляды. М., 2009, с. 115.

[30] Белоруская рада. 1917. № 7. — С.2.

[31] Гарэцкі, Р. Браты Гарэцкія. — Мн.: Медысонт, 2008. — С. 36.

[32] О.В. Козлов. Создание органов управления просвещением и культурой в Западном регионе России и Белоруссии в 1918 г. // Минск-Смоленск-Москва: этнография славянских народов / под ред. В.А. Шулякова. — Смоленск: СГПУ,2000, с. 117.

[33] Степанов П.С. Смоленщина после гражданской войны. 1921-1925. Смоленск, 1959, с. 154.

[34] Беларуская культурная праца на Усходзе // Вестник Народного Комиссариата просвещения ССРБ. Минск, 1921 — 1922, № 1 (3) — 3/4 (5/6), с. 19.

[35] Беларускі культурны рух на Смаленшчыне // Крывіч = Kryvic: месячнік літаратуры, культуры і грамадскага жыцця / Рэд. В. Ластоўскі. 1923, № 4, с. 51.

[36] Гарэцкі Р.Г. Браты Гарэцкія. Мн., 2008, с. 89.

[37] Корсак, А.В. Национальные меньшинства Смоленской губ. и Западной области в первое двадцатилетие советской власти: дис. на соиск. учен. степ. канд. ист. наук: 07.00.02; 07.00.03;22.09.2000;29.11.2000/ Ин-т истории нац. акад. наук Беларуси. — Мн., 2000. — С.70;84.

[38] Корсак А.В. Национальные меньшинства Смоленской губ. и Западной области в первое двадцатилетие советской власти. (Дис. … канд. ист. наук) / Ин-т истории НАН РБ. Мн., 2000, с. 85.

[39] Год працы Смаленскага таварыства краязнаўства // «Наш край», 1921, № 6-7 (21-22), с. 110.

[40] Смоленский государственный университет им. Октябрьской революции. К пятилетию со дня основания: 1920–1925. Медицинский факультет. Смоленск. 1925, с. 192.

[41] Улашчык М.М. Краязнаўства: Нататкі пра бадзянні ў 1924–1929 гг.: З рукапіснай спадчыны. Мінск, 1999, с. 9.

[42] Крыніцкі А. Задачы студэнцтва Беларусі // «Чырвоны сцяг», 1925, № 1, с. 8.

[43] Васілеўскі Ю. Агнявая моладзь над Дняпром шырокім... // «Чырвоная змена», 1994, 1 ліст., с. 11.

[44] Гарэцкі Гаўрыла. Выбранае. Мінск, 2002, с. 44.

[45] Корсак А. Беларусы на Смаленшчыне. // Беларусь паміж Усходам і Захадам: Праблемы міжнацыянальнага, міжрэлігійнага і міжкультурнага ўзаемадзеяння, дыялогу і сінтэзу. Ч. 1: Беларусіка = Albaruthenica. Кн. 6. Мінск, 1997, с. 308.

[46] НАРБ. Ф. 268. Цэнтральнае Бюро прафесійных саюзаў. Воп. 1. Спр. 61. арк. 7.

[47] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 61. арк. 25.

[48] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 61, арк. 26.

[49] Судьбы национальных меншинств на Смоленщине 1918–1938 гг. Документы и материалы / Государственный архив Смоленской области (ГАСО), Центр документации новейшей истории Смоленской области. ЦДНИСО, 1994 // Интернет.

[50] Успенский Г. Виленский университет «Стефана Батория» и Белорусский государственный университет // Голос пролетарского студенчества. 1924. № 1. С. 8.

[51] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 61, арк. 26-37.

[52] Высшая школа СССР за 50 лет (1917–1967 гг.) /под ред. В.П. Елютина. М., 1967, с. 24.

[53] Сафразьян, Н. Л. Становление марксистско-ленинского гуманитарного образования в Московском университете (октябрь 1917–1925). М., 1987, с. 96.

[54] Fainsod, Merle. Smolensk under Soviet rule / M. Fainsod. — N.Y.: Vintage books, 1958. — P.355.

[55] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 61. арк. 26-27.

[56] Судьбы национальных меншинств на Смоленщине 1918–1938 гг. Документы и материалы. Смоленск: ЦДНИСО, 1994.

[57] Корсак А. Праблемы беларусізацыі ў Смаленскай губерні і Заходняй вобласці РСФСР у 1918–1938 гг. // Культура беларускага пагранічча: тэматычны зборнік навуковых прац. Кн. 6. Горкі — Брэст, 1999, с. 45.

[58] Судьбы национальных меншинств на Смоленщине 1918–1938 гг. Документы и материалы.

[59] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 88. арк. 22.

[60] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 61. арк. 32.

[61] Васілеўскі Ю. Агнявая моладзь над Дняпром шырокім... // Чырвоная змена. 1994. 1 ліст. С. 11.

[62] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 88. арк. 3.

[63] Смоленск социалистический. Очерки / под ред. Г.Т. Рябкова/. Смоленск, 1958. С. 129.

[64] Башмачнікаў, В. Вынікі і задачы (Пасля V канферэнцыі пралетарскага студэнцтва Беларусі). // «Шлях студэнцтва», 1927/28, № 4–5, с. 3.

[65] Судьбы национальных меншинств на Смоленщине 1918–1938 гг. Документы и материалы.

[66] Біруля А. Хэмізацыя і хэмія ў праграмах прафтэхшкол. // «Асвета», 1929, № 11–12, с. 83–88.

[67] Агейчык. Педагагічны практыкум у вопытна-практыкавальнай і масавай сельскай школе // «Асвета», 1929, № 8, с. 67–69.

[68] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 61. арк. 32 адв.

[69] НАРБ. Ф.268. Воп. 1. Спр. 88. арк. 34.

[70] Иванов А.Е. Студенчество России конца XIX — нач. XX в.: Социально-историческая судьба. М., 1999, с. 292.

[71] Соколов М.Н. Студенчество высшей школы Беларуси 20-х гг. XX века (Аўтарэф. дыс. ... канд. гіст. Навук). Мінск, 2002, с. 15.

[72] Смоленский медицинский институт (1920-1967 гг.). Исторический очерк. Смоленск, 1967, с. 25.

[73] Рябченко О. Л. Очерки из жизни Харьковского студенчества (1920-е годы). // Эпоха. Культуры. Люди (история повседневности и культурная история Германии и Советского Союза.1920 — 1950-е годы). // Материалы (…) конференции/ Харьков, 2004, с. 279.

[74, 75] Смоленский государственный университет им. Октябрьской революции. К 5-летию со дня основания: 1920–1925. Медицинский факультет. Смоленск, 1925, с. 79-80.

[76] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 61. арк. 10.

[77] Гесь А. Цэнтральнае Бюро Пралетарскага Студэнцтва. // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. Том 6, кн. 2, с. 117.

[78] НАРБ. Ф. 6. Матэрыялы па ўзбуйненні і раяніраванні БССР. Воп 1. Спр. 346. арк. 24.

[79] Гарэцкі М. Кіпарысы // Полымя. 1993. № 2. С. 73.

[80] Чорнабаеў. Першы з'езд беларускіх асветнікаў у РСФСР // Працаўнік асветы. 1928. № 10, с. 5.

[81] НАРБ. Ф. 268. Воп. 1. Спр. 88. арк. 154.

[82] ВЦСПС: студенческие профсоюзные организации 1927-1929. Отчёт ЦБ Пролетстуда ВЦСПС III Всесоюзному съезду пролетарского студенчества. М., 1929. — С.5.

[83] Олесич Н. Я. Господин студент Императорского Санкт-Петербурского университета. СПБ., 1998, с. 68.

[84] Fainsod Merle. Smolensk under Soviet rule. N.Y.: Vintage books, 1958. — p.346.

[85] Дети и молодёжь Смоленщины: 1920–1930-е гг.: Сборник документов / Под ред. Е. В. Кодина/. Смоленск, 2006, с. 114.

[86] Кодин Е.В. «Смоленский архив» и американская советология. Смоленск, 1998, с. 142.

[87] История кафедры дерматовенерологии СГМА / Смоленская государственная медицинская академия. Смоленск, 1998–2008. // Интернет

[88] Культурна-бытавыя і матэрыяльныя ўмовы жыцця студэнцтва ў Савецкай Беларусі // «Беларуская крыніца», 1935, № 11, с. 4.

[89] Маракоў Л. Рэпрасаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі, 1794-1991: Энцыклапедычны даведнік. Том 3. Кн. 1. Абакановіч — Кучынская. Мінск, 2004, с. 494.

[90] Маракоў Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Том IV. Рэпрэсаваныя настаўнікі. Кн. 1. Абметка — Мяшальскі. Мінск, 2007, с. 21.

[91] Маракоў Л. Рэпрэсаваныя літаратары, навукоўцы, работнікі асветы, грамадскія і культурныя дзеячы Беларусі: Энцыклапедычны даведнік. Том IV. Рэпрэсаваныя настаўнікі. Кн. 1. Абметка — Мяшальскі. Мінск, 2007, с. 281.

БЕЛАРУСКІ КУЛЬТУРНА-АСВЕТНІЦКІ РУХ НА СМАЛЕНШЧЫНЕ (1920–30-я гг.)

Пётр Раманенка

У 1920-30-я гг. на тэрыторыі Смаленскай губерні, а потым і Заходняй вобласці РСФСР значная колькасць насельніцтва належала да беларускамоўнай меншасці. У беларуска-вялікарускай этнакантактнай зоне праходзілі нацыянальныя працэсы, якія адлюстроўваліся ў этнічнай самаідэнтыфікацыі мясцовага беларускага насельніцтва. Змена элементаў традыцыйна-бытавой культуры, а таксама моўная асіміляцыя, якая заключалася ў непрэстыжнасці беларускіх гаворак і паступовай страце сялянамі беларускіх моўных кампанентаў, закранулі шырокія колы вясковай грамады [1, с.186].

Аднак, нягледзячы на агульную тэндэнцыю, назіралася і выключэнні. Да прыкладу, калі ў 1924 годзе адбылося першае ўзбуйненне БССР, вяскоўцы, што былі прыпісаны да РСФСР, але лічылі сябе беларусамі, адсылалі прашэнні ў беларускі ЦВК аб далучэнні сваіх вёсак да Беларусі. Жыхары вёсак Вялікі Рай, Малы Рай і Свірыдаўка Бахоцкай воласці пісалі:

> «…Собравшись сего числа (1924 г., марта 30 дня) на общий сход и обсудив вопрос о присоединении нас к Великороссии, решили: ввиду того, что мы искони принадлежали к нации белорусов, каковыми были наши прадеды, отцы и деды…Узнав, что наши деревни отходят к Смоленскому уезду, следовательно к Великороссии, в нас пробудились национальные чувства — жажда присоединения к родному краю, в котором мы родились и желаем умереть, защищая наше национальное право» [2, арк. 398].

Наяўнасць на Смаленшчыне вялізных масіваў беларускамоўнай меншасці, хоць і ў масе сваёй з неакрэсленай самасвядомасцю, вымушала мясцовыя савецкія органы, якія адказвалі за асвету і культурную працу, неяк рэагаваць. Рабілася гэта, улічваючы ўсеагульную разруху і традыцыйны погляд на беларусаў як адгалінаванне «русского племени», вельмі неахвотна.

Так, у 1921 — 1922 г. нацыянальная праца на Смаленшчыне праводзілася слаба, «бо на ўсёй тэрыторыі дадзенага рэгіёна не былі арганізваны беларускія аддзелы». Па інфармацыі беларускага Наркамата асветы, ў рэгіёне функцыянавалі толькі хоры, гурткі і тэатральныя трупы аматараў [3, с.19].

Гледзячы на гэта, у 1921 годзе па ініцыятыве ўрада БССР пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай адукацыі была заснавана Беларуская секцыя ў складзе трох членаў і двух кандыдатаў. Яна працавала ў губерні з перапынкамі ў 1922–23 і 1925–27 гг., непасрэдна падначальвалася Беларускаму цэнтральнаму бюро пры народным камісарыяце асветы РСФСР і Саўнаркаму пры Смаленскім губернскім аддзеле народнай адукацыі, займаючыся арганізацыяй на тэрыторыі Смаленскай губерні нацыянальных школ, клубаў, іншых культурна-асветных устаноў для беларускага насельніцтва.

Так, у 1923 г. часопіс «Крывіч», рэдактарам якога быў В. Ластоўскі, сведчыў: у канцы жніўня і ў пачатку верасня ў Смаленскай губернскай цэнтральнай

бібліятэцы адбылася выстава беларускага руху — тых кніг і часопісаў, якія, з вялікімі цяжкасцямі былі сабраны Беларускай губернскай секцыяй. Выстава дала смалянам шмат цікавага, бо большая частка іх нават не ведала, што ў беларусаў ёсць свае кніжкі:

«Пасля выстаўкі аб'явілася шмат жадаючых пачытаць што-небудзь беларускае, асабліва гэта прыметна сярод моладзі» [4, с.51].

Але ключавым пытаннем для беларускай меншасці становіцца ў першую чаргу пытанне школьнай адукацыі на роднай мове. У ліпені 1923 г. у Смаленску была сабраная міжведамасная нарада, на якой абмяркоўвалася праблема беларусізацыі губерні ў цэлым і беларускага школьніцтва ў прыватнасці. Удзельнікамі мерапрыемства было выказана пажаданне аб стварэнні у губерні беларускага школьніцтва, але з улікам згоды на тое самога насельніцтва.

Беларусізацыя школы пачалася фактычна ў 1926/27 вучэбным годзе, а ўжо праз год беларускіх школ першай ступені ў губерні было 36, павышаных — 4. У 1929 г. было адкрыта беларускае аддзяленне пры Собалева-Вараб'ёўскім педтэхнікуме, а таксама было вырашана пытанне аб арганізацыі педухіла ў Руднянскай беларускай дзевяцігодцы. У 1932 г. у апошняй на школьным, дашкольным і падрыхтоўчым аддзяленнях навучалася 143 асобы. Беларускае аддзяленне працавала і пры Клінцоўскай Саўпартшколе, а таксама Смаленскім педрабфаку[5, с. 70, 84].

Рэальнае становішча беларускамоўнай адукцыі не было лёгкім. Вельмі часта настаўнікі беларускіх школ не мелі педагагічнай адукацыі і, больш за тое, не валодалі літаратурнай беларускай мовай. Слабая матэрыяльна-тэхнічная база, адсутнасць сродкаў і частыя пратэсты сялян супраць беларускай школы адмоўна ўплывалі на нацыянальнае асветніцтва ў краі.

Таму ў 1934 г. пачынаецца наступ на беларускую школу і перад самым пачаткам заняткаў

«…ввиду того, что ряд белорусских школ (…) фактически работает на русском языке, вследствие отсутствия базы для их коренизации, и, учитывая требования населения, на русский язык переводятся некоторые школы Невельского, Рудненского и Гордеевского районов» [5, с. 85].

Апошнія беларускія школы на Смаленшчыне былі ліквідаваны ў 1938 годзе, азначаючы тым самым канец беларускага школьніцтва гэтай тэрытарыяльнай адзінкі Расіі.

***

Краязнаўчы рух — яшчэ адна форма беларускай культурна-асветнай працы на Смаленшчыны. 19 сакавіка 1926 г. па ініцыятыве невялікай групы зацікаўленых асобаў у Смаленску быў зацверджаны Статут Смаленскага таварыства краязнаўства.

Маладое таварыства, якое спачатку не мела ані сродкаў, ані ўласнага памяшкання, распачала актыўную працу сярод студэнцтва, вучнёўскай моладзі, настаўніцтва і энтузіястаў. У 1927 г. аддзяленні таварыства дзейнічалі ў Вязьме, Сычоўцы і Дарагабужы, былі ўтвораны ініцыятыўныя групы па стварэнні філіяў арганізацыі ў Ельні і Рослаўле [6, с. 110]. Таварыства вяло пера-

піску з Цэнтральным бюро краязнаўства РСФСР, рэгулярна дасылала свае допісы ў газету «Наш край», актыўна супрацоўнічала з Інстытутатам Беларускай Культуры і Цэнтральным бюро краязнаўства пры ім, метадычным бюро ГубАНА і іншымі інстытуцыямі.

Навукова-даследчая дзейнасць арганізацыі выяўлялася ў наступных галінах: прыродазнаўчай, эканамічнай, гістарычнай, археалагічнай і этнаграфічнай. Так, вядомы беларускі археолаг А.Н. Ляўданскі разам з В. Тарасенкам і Г. Парфёнавым абследавалі гарадзішчы і курганы; у галіне этнаграфіі і фальклярыстыкі плённа працавалі В. Дзьмітраў і А. Палашэнкаў. У прыродазнаўчай галіне А.В. Цьвятковым, В. Даўгашовым, В.В. Дабравольскім і іншымі вялося збіранне матэрыялаў па флоры і фаўне.

Сябры Таварыства падтрымлівалі і так званае Беларускае студэнцкае зямляцтва, якое дзейнічала на Смаленшчыне прыкладна да 1929 г.

***

Наяўнасць шматлікага беларускага студэнцтва ў Смаленску прывяла да таго, што ўжо ў 1922 годзе тут былі заснаваны першыя нацыянальныя гурткі. Падставай гуртавання смаленскай моладзі служыла цікавасць да гісторыі і культуры Беларусі.

Палітыка «карэнізацыі», а таксама актыўная пазіцыя Беларускай секцыі мясцовага ГубАНА спрыялі рэгістрацыі Беларускага зямляцтва ў 1924 годзе [7, с. 11]. Маладзёжная арганізацыя адразу занялася навучальнай і навуковай дзейнасцю. Каб змякчыць навучальную адарванасць ад БССР, выбарнае праўленне зямляцтва разам з Беларускай секцыяй пачало забяспечваць студэнтаў беларускімі падручнікамі і дапаможнікамі.

Першапачаткова зямляцтва ставіла перад сабой наступныя мэты: падтрымліваць сувязі членаў арганізацыі з Беларуссю, абслугоўваць беларускае студэнцтва ў культурным плане, аказваць дапамогу беларусізацыі на тэрыторыі Смаленшчыны.

Культурная праца з'яўлялася галоўным відам дзейнасці арганізацыі, раскрываючы яе нацыянальны характар. Яна заключалася ў працы гурткоў беларусазнаўства, струнным, драматычным і харавым, якія аб'ядноўвалі як студэнтаў СДУ, так і навучэнцаў смаленскіх тэхнікумаў. Смаленскія студэнты займаліся распаўсюджваннем беларускага перыядычнага друку, аказвалі шэфскую дапамогу беларускім школам губерні, спрыялі паляпшэнню студэнцкага быта беларусаў, што ўказвае на нацыянальную арыентаванасць арганізацыі.

Аб'яднанне смаленскага студэнцтва адбывалася як на падставе месца нараджэння, так і па нацыянальным прызнаку, што статутам зямляцтва не было прадугледжана. Так, у 1926–27 навучальным годзе студэнты СДУ — члены Беларускага студэнцкага зямляцтва — былі ураджэнцамі наступных частак Беларусі: Калінінская акруга — 15, Аршанская акруга — 13, Віцебская акруга — 12, Гомельская акруга — 6, Смаленская губерня — 6 чалавек, Гродзенская губерня — 5, Магілёўская акруга — 4, Барысаўская акруга — 3. Віленская губерня, Слуцк, Дуброўна, Горкі, Мінск і Кубана-Чарнігаўская вобласць мелі па 1 прадстаўніку [8, арк. 26].

У смаленскае зямляцтва акрамя беларусаў прымаліся яўрэі, а таксама прадстаўнікі іншых нацыянальнасцяў, у выпадку, калі яны былі ўраджэнцамі Бе-

ларусі. Галоўным чынам членамі зямляцтва былі студэнты, прыехаўшыя з Усходняй Беларусі ў Смаленск на вучобу. Адносна распаўсюджаная сярод жыхароў Смаленшчыны беларуская самасвядомасць паўплывала на тое, што сярод членаў зямляцтва значную групу складалі ўраджэнцы Смаленскай губерні, якія таксама прымаліся ў арганізацыю. Асобную групу членаў зямляцтва складалі студэнты з Заходняй Беларусі, якія былі пераважна палітычнымі і сацыяльнымі эмігрантамі.

Спыненне дзейнасці зямляцтва адбылося не раней вясны 1929 года і насіла, хутчэй за ўсё, характар прымусовай ліквідацыі. Ліквідацыя ўяўляла сабой рэакцыю мясцовых органаў улады на змены ўнутрыпалітычнага курсу СССР у дачыненні да грамадскіх арганізацый і нацыянальнага пытання, і адбылася ў выніку «чысткі» Смаленскага дзяржаўнага універсітэта вясной 1929 года.

Тады ж прыкладна знікае і Смаленскае таварыства краязнаўства, члены якога будуць неўзабаве рэпрасаваныя.

Наўрад ці выпадае спадзявацца на тое, што беларускі культурна-асветны рух працягваў існаваць на Смаленшчыне хоць і ў пасіўным стане пасля 1931 года, бо ўзмацніўшыся ўціск і новая хваля арыштаў практычна не давала такіх шанцаў. У 1931 г. на старонках віленскай «Беларускай крыніцы» быў апублікаваны «пратэст Беларускага нацыянальнага камітэту ў Вільні ў справе пераследу камуністычнай уладай беларускага народу ў Усходняй Беларусі». Прадстаўнікі БНК сцвярджалі, што «… гэтакі пераслед працаўнікоў на ніве беларускай культуры мае месца не толькі ў Мінску, … але і ў…Смаленску».

Беларускі рух на тэрыторыі Смаленшчыны, распачаты ў пачатку 1920-х гг. і ўвасабляўшыся ў дзейнасці Беларускай секцыі, Смаленскага таварыства краязнаўства, Беларускага зямляцтва студэнтаў і сістэмы школьнай асветы, быў згорнуты напрацягу 1930-х гг. у выніку новай унутранай палітыкі Савецкай краіны.

Літаратура

1. Расторгуев П. А. Говоры на территории Смоленщины. М.: Изд-во АН СССР, 1960. — 207 с.

2. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 6. Матэрыялы па ўзбуйненні і раяніраванні БССР. Воп 1. Спр. 346.

3. Беларуская культурная праца на Усходзе // Вестник Народного Комиссариата просвещения ССРБ. Мн., 1921–1922, № 1 (3).

4. Беларускі культурны рух на Смаленшчыне // «Крывіч»: месячнік літаратуры, культуры і грамадскага жыцця. 1923, № 4.

5. Корсак А.В. Национальные меньшинства Смоленской губ. и Западной области в первое двадцатилетие советской власти: дис. (…) уч. степ. канд. ист. наук / Ин-т истории НАН Беларуси/ Мн., 2000.

6. Год працы Смаленскага таварыства краязнаўства // «Наш край», 1921, № 6-7 (21-22).

7. Васілеўскі, Ю. Агнявая моладзь над Дняпром шырокім… // «Чырвоная змена», 1994, 1 ліст.

8. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 268. Цэнтральнае Бюро прафесійных саюзаў. Воп. 1. Спр. 61.

АБ АСАБЛІВАСЦЯХ ЮРАЎСКІХ ЗВЫЧАЯЎ І АБРАДАЎ ЖЫХАРОЎ СМАЛЕНШЧЫНЫ (на матэрыялах канца XIX — пачатку XX ст.)

Анатоль Літвіновіч *(Менск)*

Прагортваючы польскі этнаграфічны часопіс «Люд» («Lud» — «Народ»), я асаблівую ўвагу звярнуў на працу Баляслава Брэжгі «Жывёлы ў вераваннях беларусаў Смаленскай губерні» [14]. Работа ўяўляе цікавасць для беларускай фальклярыстыкі і этнаграфіі ў асноўным дзякуючы свайму фактычнаму матэрыялу. Хто ж такі Баляслаў Брэжга, і чаму яго работы маюць у сваёй большасці навуковае значэнне для сучаснай беларускай навукі?

Баляслаў Брэжга нарадзіўся у 1887 г. пад Рэжыцай (Рэзекне) былой Віцебскай губерні (І). Ён з'яўляецца латышскім і беларускім археолагам, гісторыкам, археографам, філолагам. Доктар гісторыі (1933 г.). Скончыў Віцебскую гімназію (1910 г.), Маскоўскі археалагічны інстытут (1916 г.). З 1918 г. ён быў загадчыкам Віцебскага аддзялення гэтага інстытута, з 1922 г. працаваў у Віцебскім губернскім архіве, з 1925 г. — у Латвіі.

Даследаваў гістарычныя сувязі беларусаў і літоўцаў, гісторыю паўстання 1863–1864 гг. на тэрыторыі Віцебшчыны, вывучаўполацкія летапісы («Адносіны палачан і латышоў у VIII–XIII стст.» (1926 г.). «Замкі Віцебшчыны» (1933 г.), «Нарысы па гісторыі сялянскіх рухаў у Латгаліі 1577–1907» (1956 г.). Брэжга складаў бібліяграфію па гісторыі Беларусі, збіраў матэрыял для параўнальнага аналізу беларускай мовы і латгальскага дыялекту, у Латвійскім універсітэце чытаў курс старажытнага беларускага пісьменства [9]. Памёр Б.Р. Брэжга ў 1957 г.

Гэты латышскі вучоны мае некалькі прац па традыцыйнай культуры беларусаў. Так, адзін артыкул быў прысвечаны Смаленшчыне (ІІ). І гэта праца — адна з найбольш ці ка вых і каштоўных для нас. У ёй адлюстраваны ў асноўным юраўскія звычаі і абрады нашых продкаў. Матэрыялы для гэтага артыкула былі перададзены Р.Б. Брэжгу вядомым даследчыкам Смаленшчыны Уладзімірам Дабравольскім. Данная праца Брэжгам была прачытана ў студзені 1926 г. на пасяджэнні Інстытута антрапалагічных навук Варшаўскага навуковага таварыства ўжо пасля смерці Дабравольскага. Дарэчы, яна не была згадана ў даследаваннях беларускіх вучоных, прысвечаных Юр'ю, юраўскай абраднасці беларусаў [2, с. 487–489; 4, с. 174–187; 5, с. 211–217; 8, с. 419–420; 10, с. 89–96; 11, с. 101–108; 12, с. 124–128; 13, с. 126–134]. Таму важна яе ўвесці ў сучасны навуковы кантэкст.

Трэба падкрэсліць, што вучоны, дзякуючы старанням У. Дабравольскага, прыводзіць частковую пашпартызацыю, указваючы, напрыклад, з якой вёскі, павета паходзіць той ці іншы забабон, звычай, абрад. Неабходна, зазначыць, што, бадай, усе матэрыялы, якія засталіся яму ад У. Дабравольскага, Брэжга, па ўсёй верагоднасці, без зменаў змясціў у даным артыкуле. На карысць гэтага, з аднаго боку, сведчыць той факт, што некаторыя думкі і высновы Дабравольскага выглядзяць незавершанымі і фрагментарнымі. З другога, матэрыялы,

якія дасталіся Брэжгу ад Дабравольскага, вылучаюцца добрым веданнем звычаяў і абрадаў ды і наогул духоўнай культуры жыхароў Смаленшчыны. А іх дасканаламог ведаць толькі ўраджэнец Смаленскага краю.

Артыкул латышскага даследчыка такім чынам называецца «Жывёлы ў вераваннях беларусаў Смаленскай губерні», у якім для нас найбольш цікавай з'яўляецца тая частка, якая прысвечана юраўскім звычаям і абрадам беларусаў Смаленскага краю.

Звернем ўвагу на тыя звычаі і абрады, якія мне не давялося сустрэць у іншых публікацыях. З'яўленне цяляці на Смаленшчыне, адзначаецца ў публікацыі, — ёсць важная падзея ў сялянскай гаспадарцы. У залежнасці ад таго, у які дзень з'яўляецца на свет цяля, піша Брэжга, гаспадыня на Смаленшчыне давала яму адпаведнае імя: пятроўка, серадоўка і інш (III).

Далей Брэжга ўказвае на адзін звычай, распаўсюджаны ў некаторых мясцовасцях Смаленшчыны і пра які нам больш нідзе не давялося прачытаць. Магчыма, ён на беларускай этнічнай тэрыторыі або на ўсходняй славяншчыне больш нідзе не сустракаўся. Калі ацеліцца «первасцінка» (карова, якая першы раз ацялілася), то ёй аказваюць ўсякія знакі ўвагі, кладуць на рогі «мяшочак» («worek») — фату, што нагадвае ўбор маладой замужняй жанчыны [14, с. 54]. Яна носіць гэты «убор», пакуль не згубіць.

У публікацыі заўважаецца, што найбольш важныя культавыя дзеянні праводзяцца менавіта ў хаце ў адносінах да каровы, якая першы раз ацялілася. Тут, у хаце, гаспадыні гатовяць кашу, а таксама «малозіва», кладуць іх на сене. Гаспадыня бярэ вечка ад кадкі, на гэтым вечку, на сене, яна прыносіць «малозіва», якое ўрачыста ставіць на стол [14, с. 54]. Затым усё сямейства моліцца і спажывае «малозіва»з кашай. Гаршчок з-пад кашы, падобна як падчас радзін (хрэсьбін) урачыста разбіваецца.

Важна падкрэсліць, што вобраз кароўкі (ялаўкі) сустракаецца ў смалян і ў вясельным абрадзе. Напрыклад, «пра піццё ялаўкі», то бок разразанне і кіданне вясельнай булкі характэрна апошняму адданню нарачонай на вечары. У гэты момант сваты з боку жаніха кажуць: «Аддайце кароўку, аддайце ж і пастронак». Пасля таго, як яны забяруць нявесту, дамагаюцца булкі, званай «ялаўкай», «кароўкай» [14, с. 54]. Гэтая булка, падкрэсліваецца ў публікацыі, грае вя лікую ролю ў вясельных абрадах. Цікава, што невялікі піражок, спечаны з таго самага, што і «ялаўка» цеста, называецца «пастушком». У час правядзення абрадаў мужчыны стараюцца выкрасці для кабет менавіта гэты піражок.

На Смаленшчыне як і ў іншых месцах усходняй славяншчыны вельмі ўрачыста адбываўся выган кароў на пашу ў дзень св. Юрыя, хаця меліся і свае рэгіянальныя асаб лівасці. У гэты час у кожнай хаце перад выганам свойскай рагатай жывёлы гаспадар і гаспадыня запальваюць перад абразамі свечкі, пасвенчаныя ў перадвелікодны тыдзень. Затым накрывалі стол чыстым абрусам, клалі на яго белы, акруглы буханак хлеба, ставілі напоўненую соллю сальніцу і маліліся. Затым гаспадар браў ікону св. Юрыя і свечкі, а гаспадыня ж хлеб і соль і пачыналі рабіць абход свойскай жывёлы, кажучы: «Святой Ягорый, батюшка, здаём на рукі табе сваю скатінку і просім тябе, сахрані яё ад зверя лютыга, ад чаловека ліхова».

Як і ў іншых мясцінах усходняга славянства, потым клалі пад уязную браму на зямлі замок і ключ і гаварылі: «Штоб пасць ваўчыная так крепко запіралась, як замок на ключ запіраіцца». Над брамай ставілі ікону і выганялі жывёлу на вуліцу. Пастух зноў абходзіў увесь статак з іконай св. Мікалая — цудатворца, кажучы: «Святой Нікола, батюшка, здаю табе на парукі усё стадо і прашу тябе, сохрані яго ад зверя лютыга» [55, с. 55]. Па гэтай малітве ўсе выганялі скаціну на поле, трымаючы ў руках галінкі вярбы. Гаспадыні давалі пастуху і пастушкам саланіну і яйкі, з якіх яны павінны прыгатаваць у полі яешню.

Дабравольскі запісаў рытуал, які выкарыстоўваўся дзеля засцярогі статку ад памроку, сурокаў і дзікіх звяроў. Калі ж яешня ўжо гатовая, пастух вызначае, хто з пастушкоў будзе зайцам, а хто — сляпым, каторы — кульгавым, хто — замком, а каторы — калодай. Пастух расстаўляе ўсіх іх вакол статка, бярэ прыгатаваную яешню, ідзе з ёй, пытаючыся перш за ўсё ў зайца:

«Заяц, заяц, горька лі осіна?»
Ён адказвае: «горька».
— «Дай Бох, штоб і наша скатінка для зверя была горька».
Потым пастух пытае ў сляпца:
«Сляпэй, сляпэй, ці відіш ты?»
Сляпы адказвае: «Ня віжу».
— «Дай Бох, штоб і наша скатінка ні відала звярінка».

Потым чарга даходзіць да кульгавага, замка і калоды. Усе яны адказваюць на пытанні пастуха, адпаведна і пастух, ужываючы словазлучэнне «Дай Бох», выказвае па сутнасці замоўныя словы, формулы.

Такім чынам пастух, як і ў некаторых іншых месцах славянскага свету, абходзіць статак тры разы. Затым усе, хто браў у дзел у цырымоніі, сядаюць і спажываюць яешню.

У хуткім часе потым, самым вечарам, пастухі прыганяюць кароў у вёску дадому. Яшчэ адна асаблівасць Смаленшчыны: праз пэўны час па прыгоне кароў дамоў пачынаюцца танцы, як на радаўніцу.

Амаль кожны павет Смаленскай губерні, падкрэслівае аўтар, мае свае характарыстычныя рысы.

У Парэцкім павеце, напрыклад, як і ў шэрагу месцаў Усходняй Славіі пры першым выгане кароў у поле абходзяць жывёл з абразам у хлеве, у варотах хлева кладуць пояс, брытву, сякеру, калодку і касу, і абавязкова самы выганяюць жывёлу ў поле.

Увагу трэба звярнуць яшчэ на наступны звычай. Выгнаўшы жывёлу ў поле, кожная кабета кідае ў тое месца, адкуль яна выгнала свойскую рагатую жывёлу, вербныя галінкі, якімі яе (жывёлу) паганяла і пачынала праз іх скакаць (ад 3-х да 5-ці разоў), прытым старалася як мага вышэй падскочыць. Звычай скакання праз вербінкі сяляне тлумачылі па-рознаму. Адны казалі, піша Брэжга, што так рабілі, каб скаціна заўсёды скакала, то бок заўсёды была здаровая і вясёлая. Іншыя ж казалі, што скаканне адбывалася з мэтай выклікання лепшага ўраджаю на лён. Рацыю, аднак, мелі першыя. Гэты звычай асноўваўся на сімільнай, або ініцыяльнай, магіі: праз падобнае выклікаласяжаданае.

Трэба адзначыць, што юраўскія звычаі і абрады Смаленшчыны надзвычай багатыя. У некаторых іншых мясцовасцях Смаленскага краю ў дзень св. Юрыя прадстаўніцы жаночага полу рабілі так: кабеты ў полі пілі гарэлку, адна ў другой зрывалі з галавы хустку, цягалі адна другую за валасы, паўтараючы: «каб гаспадар меў жыта буйнае і густое, як валасы» [14, с. 57].

На Смаленшчыне, як і ў іншых месцах Беларусі і Расіі, верылі што калі рана выгнаць жывёлу ў поле, то яна трапляе пад апеку св. Юрыя, які, паводле народных вераванняў, ў гэты дзень з самай раніцы аб'язджае палі і якую жывёлу там ўбачыць, то тая будзе захавана цягам цэлага лета ад хвароб і дзікіх звяроў.

Можна ўказаць яшчэ пра адзін звычай, які, праўда, панаваў у час Юр'я на Ельніншчыне Смаленскага краю. Тут гаспадыні, сцвярджаецца ў публікацыі, у дзень св. Юрыя выганяюць буйную рагатую жывёлу ў поле. Адна з іх нясе хлеб, соль і абраз св. Юрыя. Жывёл зганяюць у кола і не дазваляюць ім разыходзіцца. Кожная жанчына трымае ў руках вербную галінку, пасвенчаную ў Вербніцу, а таксама крапіла, якім святар крапіў іх хату пры здзяйсненні набажэнства ў Страсны Тыдзень. Калі жывёла збярэцца ў кола, прысутныя пачынаюць маліцца, просячы св. Юрыя ўзяць яе пад сваю апеку. Потым пастух з некалькімі хлопцамі абходзіць статак тры разы з абразам і соллю [14, с. 58]. Памаліўшыся яшчэ раз, пастух выганяе свой статак, кожная з кабет ідзе на ўласнае поле, дзе ўтыркае ў зямлю вербіну і крапіла, каб жыта было, па народных уяўленнях, густое і высокае.

Усе гаспадары, гаспадыні і пастухі збіраюцца і моляцца перад абразам, узятым кім-небудзь з гаспадароў. Затым па стухі становяцца вакол статку, а ўсе астатнія, гаспадары і га спадыні, абходзяць з абразам увесь статак. Вакол гэтага цы ры маніялу яны затрымліваюцца чатыры разы, і пры кож ным затрымліванні стралец, які стаіць недалёка, страляе з ружжа [14, с. 58]. От апошняе акалічнасць наводзіць на пытанне: адкуль у шэрагу мясцінах паўночнай часткі Беларусі [11, с. 104], а таксама ў пэўных месцах Смаленшчыны (не зусім ясна сказана, дзе гэта зафіксавана) узяўся такі звычай: стральба з ружжа?

Па-першае, ён мог з'явіцца ў паўночнай частцы Беларусі, а таксама на Смаленшчыне самастойна (незалежна ад існавання яго ў іншых народаў), бо служыў для адпужвання дзікіх звяроў ад свойскіх жывёл.

Па-другое, такі звычай мог узнікнуць, напрыклад, у смалян і пад уплывам скандынаўскага (шведскага) субстрату (IV). Праўда, падобнае дапушчэнне малаверагодна.

Па-трэцяе, гэтая культурная з'ява на Юр'е магла распаўсюдзіцца на Беларусі (асабліва паўночнай яе частцы) і пад уплывам перасяленцаў з краін германскай моўнай сям'і (Германія, Скандынавія V), Усходняй і Паўднёва-Усходняй Балтыі (Лівонія, Прускае Каралеўства), якія ў 11–19 ст. пражывалі не толькі ў беларускіх гарадах і мястэчках, але і сельскай мясцовасці.

Такім чынам, Дабравольскі, бадай, як ніякі іншы даследчык канца XIX — пачатку XX ст. дасканала вывучыў традыцыйную духоўную культуру беларусаў Смаленшчыны. Добра ён вывучыў і аналагічную культуру рускіх гэтай адміністрацыйна-тэрытарыяльнай адзінкі. Яго працы не страцілі сваёй навуковай каштоўнасці да нашага часу. Уладзімір Дабравольскі добра ведаў мову жы-

хароў Смаленскага краю. Брэжга, змясціўшы ў сваёй працы матэрыялы У. Дабравольскага, значна узбагаціў наша ўяўленне пра юраўскія звычаі і абрады смалянаў, у тым ліку беларусаў увогуле.

Каментарыі

I. Баляслаў Брэжга, магчыма, меў пэўныя дачыненні да беларусаў, бо нарадзіўся ў той частцы Латвіі (Рэжыцкі павет), дзе з даўніх часоў жылі беларусы. Ён добра ведаў мову нашых продкаў.

II. Для У. Дабравольскага не было сакрэтам тое, што ў сярэдняй і заходняй частках Смаленшчыны ў другой палове XIX — пачатку XX ст. жылі беларусы. Насельніцтву гэтага краю ў XI–XX стст. давялося перажыць шмат войнаў, няшчасцяў, бедстваў. Жыхары Смаленскага і Полацкага княстваў, нягледзячы на іх аднолькавае этнічнае паходжанне (з'яўляліся патомкамі славян і балтаў, адносіліся да племяннога саюза крывічы), часам варагавалі паміж сабой. Адбілася на іх этнічнай самасвядомасці і тое, што Смаленшчына па сутнасці была памежнай зонай паміж ВКЛ, Рэччу Паспалітай, з аднаго боку, і Вялікім княствам Маскоўскім, Расійскай імперыяй, з другога. Адыграла сваю ролю і тое, што царква, адукацыйная сістэма, армія і іншыя дзяржаўныя структуры функцыянавалі ў апошнія некалькі стагоддзяў на рускай мове. Доўгае пражыванне ў складзе Расіі моцна паўплывала на этнічнае самаўсведамленне смалянаў.

Праўда, у XIX — пачатку XX ст. беларускія (Я. Карскі і інш.) і шэраг добрасумленных расійскіх даследчыкаў (М. Цэбрыкаў, С. Максімаў і інш.) Смаленшчыну, у асаблівасці яе сярэднюю і заходнюю часткі, адносілі да беларускай этнічнай тэрыторыі. Глядзі: [7, с. 428–472]. Карскі, напрыклад, сцвярджаў: «… большая часть губернии населена белорусским племенем и лишь четыре восточные уезда (Юхновский, Вяземский, Сычевский и Гжатский) принадлежат южновеликорусскому наречию [6, с. 43]. Заўважым, большасць патомкаў беларусаў, пра культуру якіх пісалі Брэжга і У. Дабравольскі, у цяперашні час адносіць сябе да рускіх.

III. На конт мянушак аўтар сказаў бегла. На Смаленшчыне давалі каровам мянушкі не толькі ў гонар дня свайго нараджэння, але і па іншых прыкметах, асабліва часта па масці жывёлы. На Беларусі, напрыклад, былі вядомыя такія мянушкі, як Белка, Зорка, Красуля, Лыса, Лыска, Лысуха, Маліна, Малінка, Рабава, Рабіна, Рабінка, Рабка, Рабушка, Пяструха, Пяструшка, Пасцілка, Рамашка, Чарнава, Чарнуха...

IV. Брэжга ўказвае на тое, што нешта падобнае распаўсюджана і ў народаў германскай моўнай сям'і (шведаў). У шведаў першы выган свойскай рагатай жывёлы ў поле лічыцца вялікім святам і прыпадае ён найчасцей на палову траўня. Свята пачынаецца напярэдадні запаленнем у розных месцах вогнішчаў (як вогнішчы, так і стрэлы з ружжа — з'явы ў нечым блізкія). У гэты час, піша Б. Брэжга, вясковыя хлопцы ўсю ноч ездзяць па лесе, страляюць з ружжа, трубяць у рог, вытвараюць неверагодныя гукі [14, с. 58–59]. На думку М. Галдзянкова, у Смаленску готы (шведы) былі адзінымі жыхарамі як мінімум першыя 50 гадоў існавання гэтага горада. У 12 кіламетрах ад сучаснага Смаленска, у вёсцы Гнездава выяўлены пахаванні нарманаў, пачынаючы з сярэдзіны IX ст. Гл.: [3, с. 11.]

V. Скандынаўскія воіны, дружыннікі, гандляры і інш. ў IX–XIII ст. адыгралі пэўную ролю ў гісторыі і культуры Полацкага і іншых княстваў на тэрыторыі Беларусі, аднак хутка аславяніліся.

Літаратура

1. Беларуская міфалогія. Энцыклапедычны слоўнік. Мн., 2004.

2. Беларусы. Т. 6. Грамадскія традыцыі (В. Ф. Бацяеў і інш/). Мн., 2002. — 606 с.

3. Голденков М. Кровь викингов еще течет // Секретные исследования», 2008, № 5, март, с. 11.

4. Земляробчы каляндар: Абрады і звычаі / Укладанне, класіфікацыя (…) каментарый А.І. Гурскага/ Мн., 1990. — 405 с.

5. Каляндарна-абрадавая паэзія // А.С. Ліс, А.І. Гурскі і іншыя/ Мн., 2001. — 515 с.

6. Карский Е.Ф. Белорусы: Том 1. Мн., 2006. — 656 с.

7. Максимов С.В. Белорусская Смоленщина с соседями // Живописная Россия: Отечество наше в его земельном, историческом, племенном, экономическом и бытовом значении: Литовское и Белорусское Полесье: Репринт издания 1882 г. (2-е изд.) Мн., 1994, с. 429–472.

8. Народная культура Беларусі: Энцыклапедычны даведнік /пад рэд. В.С. Цітова/ Мн., 2002. — 432 с.

9. Панізнік С. Ён уздымаў старонкі даўніны // «Голас Радзімы», 1978, № 18 (4 мая), с. 7.

10. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 1. Магілёўскае Падняпроўе. Мн., 2001. — 798 с.

11. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 2. Віцебскае Падзвінне. Мн., 2004. — 910 с.

12. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 3, кніга 1. Гродзенскае Панямонне. Мн., 2006. — 608 с.

13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. Том 4. Брэсцкае Палессе. Кніга 1. Мн., 2008. — 560 с.

14. Brežgo B. Zwierzęta w wierzeniach Białorusinów gub. Smoleńskiej // Lud. Ser. II. T. V. Rok 1926, s. 52–59.

ЭТНІЧНАСЦЬ ВЕРХНЯГА ЎСХОДНЯГА ПАДНЯПРОЎЯ

Зміцер Канаплянікаў *(г. Менск)*

Наконт нацыянальнай свядомасці

Нацыянальная свядомасць паводле апытанняў у нашай частцы Еўропы (апытаў палякаў, кашубаў, беларусаў, літоўцаў, рускіх) усведамляецца не як гістарычная ці моўная, а як сваяцкі-тэрытарыяльная з'ява (беларусы, бо бацькі беларусы, жывем у Беларусі).

Гістарычнасць уяўляецца як частка тэрытарыяльнага — напрыклад, людзі з Смаленшчыны, Пскоўшчыны кажуць што маюць агульнасць з беларусамі, бо былі у адной губерніі, ці нават могуць ведаць пра абвяшчэнне БССР у Смаленску. Мне і такое казаў старшыня сельгаспрадпрыемства з Хіславіцкага раёну. Ён вучыўся ў Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. Вучоба у горацкай акадэміі — масавая з'ява для прылеглых тэрыторый, і, відаць, гэта мае значны уплыў для Смаленшчыны, бо гэта кузніца беларускай уладнай эліты. Аналагічныя функцыі мае сельскагаспадарчая акадэмія ў Бранску.

Адпаведна людзьмі лёгка даводзіцца самім сабе новая нацыянальнасць, этнічнасць: напрыклад у Цвяры (tverzha.ru) вырашылі, што яны крывічы. што ніколі і не адмаўлялася гісторыкамі.

Сваяцкасць даводзіцца і праз этнагенез, адсюль і такі моцны ціск на даследчыкаў у галіне антрапалогіі, бо гэта тое, у што верыць просты чалавек і што вельмі моцна уплывае на ягонае разуменне нацыянальнасці.

Трэба чакаць што у бліжэйшы час з'явацца і радзімічы на Браншчыне. Гэта значыць, што калі заходняя Браншчына — радзімічы, і радзімічы — гэта насельніцтва Дняпра, на чым стаяў Грынблат. І праўда, ёсць вельмі выразныя рысы агульнага для басейна Сажа, канешне, у межах агульнабеларускай народный культуры і іншых арэалаў.

Для прыкладу, у першым падручніку геаграфіі Беларусі аўтар (А. Смоліч) пісаў пра Беларусь як пра край, дзе ёсць і Смаленск, а не пра дзяржаву ці рэспубліку.

Адпаведна папулярызацыя тэкстаў пра дакументальнае абвяшчэнне Беларусі ў Смаленску стварае для жыхароў магчымасць выбару, дзе не ўсё так адназначна з нацыянальнасцю, а гісторыя, што іх бацькі былі беларусамі этнічна, стварае дадатковую магчымасць выбару этнічнасці.

Напрыклад, у Беларусі па гэтай прыкмеце — наяўнасць архіўных успамінаў, што прамыя сваякі па зыходнай лініі былі «палякамі» — дае падставы людзям лічыць сябе палякамі, што для іх усё ж цяжэй, чым было бы для смаленцаў, бо мова вуліц і устаноў Менску і Гародні ад варшаўскай нашмат больш розніцца, чым мова Гародні і Смаленску. І калі у іх будзе эканамічны інтарэс, ці які іншы, людзі з Смаленшчыны лёгка могуць атрымаць гэтыя даброты праз тое, што будуць сабе называць не толькі рускімі. І гэтак жа наадварот, калі ёсць у Лукашэнкі эканамічны інтарэс, ён сябе і рускім можа называць.

Навука — гэта калі ёсць тэорыя. Паводле адной тэорыі аўтахтоны Смаленшчыны будуць беларусамі, паводле іншай — не будуць. Гэтае пытанне схаластычнае, накшталт таго, як давесці існаванне Бога ці што такое стол, як было ў Платона. Проста мэта навукі пра людзей практычная, а не абстрактная, то бок што людзі будуць рабіць, а таксама думаць у перспектыве. Для гэтага я канструірую сістэму ГРАМАДСТВА, СВЕТАПОГЛЯДУ, а потым раблю высновы, чаго можна чакаць.

Я даследаваў сістэмы сваяцтва, а як раз на усход ад Дняпра менее германізмаў (швагер), і более славізмаў. Там жа і ёсць паняцце «сваяк» як пэўны тэрмін у дачыненні паміж братамі людзей, якія узялі шлюб, а не як сінонім слова «радня» як ў цэнтральных беларускіх гаворках.

Я мяркую, што паўднёва-заходнія гаворкі і традыцыйныя грамады Расіі этнаграфічна і нацыянальна блізкія да беларусаў, але як раз таму, што беларуская культура і свядомасць грунтуецца на народнай культуры, а сучасная нацыянальнася расейская — на маскоўска-пецярбурскіх дзяржаўніцкіх узорах, то бок гэта з'явы рознага парадку. Бо якраз асіміляцыя беларусаў Беларусі вядзецца не традыцыйнымі грамадамі Разанскай і Курскай абласцей, а навязваюцца ім усім маскоўска-пецярбурскія дзяржаўніцкія узоры расейскай культуры і свядомасці. Гэта значыць тое, што, насамрэч, у гэтых людзей агульныя праблемы. Напрыклад для дзяўчыны-гісторыка з Пецярбургу, якая працавала раней у музеі (ёй дужа падабаўся Пуцін), мая мова выклікала уяўленне пра падабенства да «так гавораць у музеі у Валагоцкім раёне»).

Далей зробім параўнанне этнічнай свядомасці смаленцаў з іншымі краямі.

1. Я не збіраў спецыяльна факты на Смаленшчыне, бо усё ж гэта былі выпадковыя даследаванні. Але бачна, што людзі сябе называюць рускімі — то бок выкарыстоўваюць нейкае паняцце. Для сялян старога пакалення — ужо ўсход Смаленшыны гэта дужа далёка. Мяжа з Беларуссю стварае лакальны абсяг іншага краю, такія абсягі могуць рухацца, але на іх можна выявіць і гістарычныя назвы, бо яны сталі там уласна мясцовымі.

Але ёсць большае міфалагічнае пашырэнне — калі кажуць пра «чысціню рускіх» гэтага рэгіёна, «старажытны рускі край» і гэтак далей. Аб'ектыўна ж так не скажаш, не маючы перадузятасці.

Гэта лёгка параўноўваецца з Беларуссю, Палессем, Карпатамі, дзе выкарыстоўвалася тое ж слова — *рускі* для саманазвы. А ў Маскве для іх жылі маскалі, кацапы, нават назіралася міграцыя такога паняцця *паляшук*. Але гэтыя людзі на Палессі за два дзесяцігоддзя хутка сталі беларусамі і украінцамі, што паспеў зафіксаваць Józef Obrębski у сваёй кнізе «Problem etnizny Polesia».

Аналагічна ў Польскай Рэспубліцы вельмі хутка аказалася, што з 200.000 слянзакаў за 10 год аказалася 817.000 official declared Silesian nationality [2], і шмат немцаў (яны з'явіліся у 90-я і далей устойлівы), і што кашубы аказаліся народам зусім не малалікім. Проста, як я выявіў, пытанне пра нацыянальнасць яны там разумеюць як пра грамадзянства («беларусы якія ў Польшчы — то таксама палякі» — так кажа інфарматар). І вось калі польскі урад даў магчымасць пазначыць дзве нацыянальнасці, выявілася, што сілезцаў і кашубаў шмат. А у мінулыя дзсяцгоддзі сілезцаў не было зусім, і літаратуры мастацкай ў іх амаль няма.

Як называюць зараз на Смаленшчыне жыхароў Масквы ці за Масквой, не выяўлена. У Пскоўскай вобласці мяжа выразная, бо існавала даўжэй — «*скабарі*» для себежцаў, якія называюць сябе рускімі. Прычым тое, што ёсць скабары, агульнавядома рускім і ў Расіі. Пра тое што ёсць мяжа на Смаленшчыне, дзе называюць суседнія вёскі ліцьвінскімі, былі выпадковыя звесткі ў Інтарнэце.

Гэта вельмі істотна, як называюць іх іншыя. Вось Лукашэнка можа сябе для рускіх называць рускім, але ж рускія і далей будуць яго лічыць беларусам і, адпаведна, трохі горшым за сябе ужо з-за таго, што ён беларус (ёсць апытанні пецярбуржскіх этнолагаў себежцаў, яны казалі што беларусы трохі горшыя за іх).

Высновы:

1. Варта дакладней апытаць як сябе называюць жыхары Смаленшчыны, і чаму, і як яны называюць іншых славян Расіі, і чаму.

Меркаванне пра абсалютную суб'ектыўнасць этнічнасці памылковае, што лёгка выяўляецца праз выяўленне агульных уяўленняў пра прастору і сваяцтва. Я тут не пісаў, але прастора мае і такую з'яву як *гаспадар* і *гаспадарскія дачыненні*, што добра бачна па міфалогіі духаў-гаспадароў.

2. Мова разам з прасторавымі і сваяцкімі дачыненнямі стварае этнічную сістэму. Прычым калі імперская (імперскасць можа мець можа форму і рэлігійную) улада прыбліжаецца да максімалнай таталітарнасці, то яна спрабуе кантраляваць усё — і сваяцтва, і прастору, і мову.

З таго, што дакуманты пішуцца на мове, мова кантралюецца і пры лібералізацыі, а вось сваяцтва пры лібералізацыі цяжэй за ўсё дзяржаве пракантраляваць, можна толькі абмяжоўваць веды пра далёкае генетычнае сваяцтва, здабытае праз навуковыя сродкі.

Мова — гэта камунікацыйны сродак для грамад. У перспектыве і расейская мова будзе мець цяжкасці, бо лепшая камунікацыя для гаспадарання адбываецца на іншых мовах, і да таго ж змяняюцца сваяцкія дачыненні, бо ў цэнтры улады павялічваецца значна колькасць тых, хто этнічна належыць не да рускіх (гл. працэнт нерускіх у маскоўскіх класах) — што і назіраецца — новыя паняцці, датычныя новых зручных спосабаў камунікацыі не на рускай мове, словаформы запазычваюцца рускімі разам з паняццямі.

Нацыянальныя мовы могуць адрознівацца з пункту гледжання граматыкі зусім нязначна, як напрыклад харвацкая, сербская і баснійская.

3. Акрамя моўных камунікацыйных сістэм дзейнічаюць і вобразныя камунікацыйныя сістэмы, такія як, напрыклад, рытуалы, іншыя сістэмныя дзеянні. Відэа этнаграфічных фільмаў розных народаў напрыклад, сведчыць, што значнымі з'яўляюцца тэхналогіі вытворчасці і гатавання ежы, бо гэта можна і зараз рабіць (rusnations.ru). Звычайна, канешне, усё злучана і сістэмы моўна-вобразныя, як сваяцтва, абрад.

4. Калі меркаваць, якая будзе свядомасць карэннага насельніцтва у абласцях Смаленскай, Бранскай, Пскоўскай, то бяручы за прыклад грамады на захад ад іх, можна сказаць, што, хутчэй за ўсё, этнічны склад будзе змяняцца праз удакладненне самавызначэння, то бок актуалізацыю адасаблення ад насельніцтва на усход ад іх.

БЕЛАРУСКІ ЭЛЬЗАС І ЛЯТАРЫНГІЯ (СМАЛЕНШЧЫНА)

Гутарка з Алегам Трусавым

Аўтар і вядучы Сяргей Абламейка

(Радыё Свабода, Прага)

Нядаўна мне давялося прачытаць успаміны віленскага беларускага дзеяча часоў вайны, доктара мэдыцыны Язэпа Малецкага «Пад знакам Пагоні». Выдадзеныя яны ў 1976 годзе ў Таронце беларускім выдавецтвам «Пагоня».

Са старонак кнігі паўстаюць страшныя карціны віленскай беларускай трагедыі ў канцы 30-х — пачатку 40-х гадоў. Над беларусамі ў беларускай сталіцы зьдзекваліся і палякі, і летувісы, і расейцы, і немцы. І ня толькі зьдзекваліся, але і нішчылі нас, даносілі на нас, і, нават, ужо будучы самі ў падпольлі, адстрэльвалі нашых дзеячоў. Напрыклад, толькі на суседняй Лідчыне за час вайны польскае падпольле забіла 1200 беларусаў. Трагедыя адарванага ад краіны места…

Але там, на беларускім Захадзе, гістарычныя абставіны склаліся так, што як на Віленшчыне, гэтак і на Беласточчыне, існаваў уласна беларускі рух, які так ці іначай бараніў беларусаў і сьведчыў пра іхную прысутнасьць. Там акупанты так ці іначай заўсёды лічыліся і лічацца зь беларусамі.

А што на беларускім Усходзе, падумалася мне, што са Смаленшчынай і Смаленскам? Там ужо цэлыя стагодзьдзі ніхто не бароніць Беларушчыну. Чым гэтае места было для Беларусі і чым яно ёсьць для нас цяпер? Ці закрытае смаленскае пытаньне? І ўвогуле — ці дастаткова ўвагі мы надаем Смаленску, аглядаючыся на сваю гісторыю?

У беларускае Сярэднявечча там жылі Клімент Смаляціч і Аўраамі Смаленскі. Менавіта ў тэксьце гандлёвай дамовы смаленскіх купцоў з Рыгай ад 1229 году навукоўцы ўпершыню фіксуюць лексычныя асаблівасьці беларускай мовы. Менавіта там у канцы XIV стагодзьдзя жыў Лука Смаленец, аўтар вядомага беларускага літаратурнага помніку «Смаленскі псалтыр». Менавіта ў Смаленску была складзеная славутая «Пахвала Вітаўту» і так званы Беларуска-Літоўскі Летапіс 1446 году. Менавіта з-за гэтага места нашая дзяржава вяла бясконцыя войны з Масквой, менавіта за Смаленск і Смаленшчыну паклалі галовы тысячы і тысячы беларусаў, і менавіта смаленскае суперніцтва з Маскоўшчынай у значнай ступені перадвызначыла гістарычны лёс цэлай старой Беларусі.

Беларускі характар гэтай зямлі не выклікае сумненьняў. Гэта сёньня расейцы, у патрэбе часу, называюць тамтэйшыя гаворкі паўднёва-заходнімі рускімі. А вось калі пагрозы ў выглядзе беларускай дзяржавы не існавала, напрыклад у 1860 годзе, яны падавалі аб Смаленску іншую інфармацыю. Паводле дадзеных Смаленскага статыстычнага камітэту, тады 68 % насельніцтва Смаленскай губэрні былі беларусамі. А ў цэнтральных і заходніх паветах губэрні гэтыя лічбы набліжаліся да 100 %. У Красьненскім павеце беларусаў

было 95 %, у Рослаўскім — 94 %, у Смаленскім — каля 91 %, у Парэцкім — 90 %, у Ельнінскім — 90 %, у Духаўшчынскім — 87 % і ў Дарагабускім — каля 81 % насельніцтва. 30 % небеларускага насельніцтва ў губэрні даваў сам Смаленск, зрусыфікаваны за 300 год палону.

Трохсотгадовым палонам тлумачыцца і амаль поўная адсутнасьць там арганізаванага беларускага руху. Хоць, зрэшты, паасобныя гістарычныя факты сьведчаць, што і ў Смаленску нешта было. Напрыклад, вядома, што на Ўсебеларускім Кангрэсе ў Менску ў 1917 годзе смаленская дэлегацыя, ў адрозьненьне ад Віцебскай і Магілеўскай, якія выступалі за аўтаномію Беларусі ў складзе Расеі, разам зь Віленскай дэлегацыяй выступіла за поўную незалежнасьць нашай краіны. Вядома таксама, што ў часе апошняй вайны ў Вільні беларус са Смаленску Яфрэмаў актыўна супрацоўнічаў з рэдагаванай Францішкам Аляхновічам газэтай «Беларускі Голас».

Для гутаркі аб Смаленску я вырашыў запрасіць вядомага беларускага гісторыка і грамадзкага дзеяча Алега Трусава, які і сам паходзіць са Смаленшчыны. Тое, што вы далей пачуеце, дазваляе меркаваць, што спадар Трусаў фактычна прадстаўляе сёньня нейкую новую ўсходніцкую плынь у беларускай грамадзка-палітычнай думцы, якую можна назваць Смаленскай, ці, прынамсі, Смаленска-Магілёўскай.

С.А. — Алег Анатольевіч, як Вы ставіцеся да ўмоўнага ладу ў гісторыі? Карэктна гэта ці не для гісторыка?

А.Т. — Я лічу, што гэта карэктна, і ўмоўны лад у гісторыі існуе заўжды. Калі паглядзець па-філязофску — што такое гісторыя, дык гэта нейкі момант, якога нельга вымераць. Вы ж ведаеце гэты сафізм пра чарапаху і Ахіла, яшчэ з часоў Старажытнае Грэцыі. Таму сапраўдны гісторык павінен умоўны лад у гісторыі разглядаць бясконца. Бо ўсе варыянты, якія былі ў гісторыі і маглі адбыцца, але не адбыліся, — яны маюць права на існаваньне ў будучым часе. І такіх фактаў можна прывесьці даволі шмат. Калі, напрыклад, нешта не ўдавалася адразу, дык яно магло быць зьдзейсьнена народам зь пятай, восьмай, дзясятай спробы.

Возьмем, напрыклад, шматлікія паўстаньні баўгараў супраць туркаў. І баўгарскія гісторыкі-адраджэнцы заўжды разглядалі па-філязофску, літаратурна свае памылкі. Асабліва калі паўстаньне не атрымала належнага выніку. Таму мне здаецца, што тое, што робіць цяпер Радыё Свабода, разглядаючы напрыканцы XX стагодзьдзя магчымыя варыянты беларускага шляху, — вельмі важнае. І такі падыход мае права на існаваньне як любы футурызм.

С.А. — Дзякуй. А зараз — аб Смаленску. Я зьвяртаюся да Вас з гэтымі пытаньнямі і як да прафэсійнага гісторыка, і як да чалавека, які паходзіць са Смаленшчыны і нават меў у пашпарце запіс «расеец». Найперш, якія этапы смаленскай гісторыі Вы маглі б вылучыць?

А.Т. — Іх некалькі. Першы і надзвычай важны — утварэньне Смаленскае дзяржавы. Справа ў тым, што крывічы — той славянскі народ, які разам з балтамі лёг у аснову беларусаў — стварылі адначасова тры дзяржавы: Полацкую, Пскоўскую і самую вялікую і моцную — Смаленскую.

Смаленская дзяржава мае свае вытокі недзе ў IX–X стагодзьдзях, калі непадалёк ад Смаленску ўзьнікла гэтак званае Гнёздава, якое было адным зь першых гарадзкіх утварэньняў на тэрыторыі Цэнтральнай і Ўсходняй Эўропы, дзе разам са славянамі жылі і варагі, а таксама іншыя плямёны. Там археолягі адкапалі цікавыя знаходкі. Менавіта там знойдзеная вялікая колькасьць арабскіх дырхемаў, бо Гнёздава, а пасьля і Смаленск сталі вузлавым пунктам на шляху з «варагаў у грэкі» — шляху, празь які ішоў эўрапейскі гандаль з Балтыйскага мора ў Касьпійскае і Чорнае.

Смаленская дзяржава, у адрозьненьне ад іншых усходнеславянскіх дзяржаваў, была самаю доўгатрывалаю. Смаленскае княства, фактычна, існавала як незалежная дзяржава да канца XIV — пачатку XV стагодзьдзяў, у той час як Полаччына сваю незалежнасьць страціла дзесьці ў пачатку XIV-га. Смаленшчына існавала яшчэ 100 год як самастойны этнас, як дзяржава са сваім войскам, са сваімі летапісамі, архітэктурай… І гэта вельмі важна. На жаль, факт незалежнага існаваньня Смаленшчыны ў XIII–XIV стагодзьдзях мала хто разглядае. Расейцам гэта нявыгадна, а беларусы да гэтага пакуль што не дайшлі.

С.А. — Вы кажаце, што крывічы стварылі тры дзяржавы. Але ці былі смаленскія крывічы цалкам ідэнтычныя палачанам і пскавічам? Бо вось сёньня археолягі і антраполягі сьцьвярджаюць, што палачане былі практычна ідэнтычныя латгалам(!). Цяпер бо капаюць і бачаць амаль ідэнтычныя з латгаламі строі. Іншымі словамі, прыхаваныя балцкія ўплывы ці нават карані. Што Вы можаце сказаць у гэтым сэнсе пра смаленскіх крывічоў?

А.Т. — Смаленскія крывічы трошку адрозьніваліся тым, што яны прыйшлі на памежныя землі. Але на тэрыторыі Смаленшчыны да XII стагодзьдзя існавала ўсходнебалцкае племя Голядзь, і смаленцы яго асымілявалі даволі позна, балты існавалі яшчэ ў XII стагодзьдзі, ня кажучы ўжо пра VIII — IX — X стагодзьдзі. Іншая справа, што на Смаленшчыне крывічы сутыкнуліся і зь фінавугорскімі плямёнамі, бо гэта была мяжа паміж балтамі і фіна-вуграмі. І гэты элемэнт фіна-вугоршчыны ў смаленцаў мае месца. Дарэчы, пскоўскія крывічы ўжо напалову зьвязаныя зь фіна-вуграмі, г. зн. нашмат больш, чым смаленцы. Таму дасьледаваньні нашых археолягаў па Полаччыне ў карціну засяленьня балцкіх абшараў крывічамі нічога новага не даюць.

С.А. — Сапраўды, гэта вельмі цікава. Атрымліваецца, што ў XIII–XIV стагодзьдзях існавала яшчэ адна беларуская дзяржава.

А.Т. — Так. Цалкам незалежная, цалкам самастойная. Са сваімі князямі, летапісамі, архітэктурай. Усё гэта было. Проста мы пра яе яшчэ ня ведаем. Гэта — невядомая Беларусь.

Больш таго. Маскоўскія князі хадзілі на гэтую дзяржаву ваяваць разам з татарамі. Потым ад маскоўцаў яе баранілі вялікія князі літоўскія. У другой палове XIV стагодзьдзя Альгерд колькі разоў бараніў Смаленск ад маскоўска-татарскіх наездаў. Аб гэтым ёсьць шмат пісьмовых крыніцаў. Але потым ВКЛ далучыла спачатку Мсьціслаў, а пасьля, у пачатку XV стагодзьдзя, і Смаленск. Смаленшчына перайшла да ВКЛ на 100 гадоў, а ў 1514 годзе Смаленск захапілі войскі Васіля III. І яшчэ раз Смаленск вярнуўся ў склад Вялікага Княства Літоўскага ў 1609 годзе і знаходзіўся ў ім да лета 1654 году.

С.А. — Ну і як бы Вы ацанілі ролю, значэньне Смаленску для Беларусі на ўсіх гэтых этапах? Ён быў каменем раздору паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Княствам Маскоўскім, быў прычынаю спусташальнай і зьнішчальнай вайны паміж імі. Як Вы акрэсьліваеце ролю Смаленшчыны для Беларусі, напрыклад, геапалітычна?

А.Т. — Смаленшчына для Беларусі — гэта своеасаблівая адмета, своеасаблівы сымбаль як беларускага адраджэньня, гэтак і заняпаду. Як толькі пытаньне Смаленшчыны ўзьнікае — заўжды Беларусь становіцца на ногі і адраджаецца. Гэтаксама і як толькі яно зьнікае з гістарычнае карты, дык і Беларусь у заняпадзе. Вось канкрэтныя прыклады. Пасьля бітвы пад Воршай Смаленск застаўся ў складзе расейскай дзяржавы. І гэта прывяло да таго, што троху пазьней прыйшоў у Беларусь Іван Жахлівы, захапіў і вынішчыў Полацак і зьнішчыў, фактычна, Полаччыну як этнакультурны рэгіён. І мог ён гэта зрабіць толькі маючы ў руках Смаленск.

Аднак калі Расея сама трапіла ў цяжкае становішча — так званы Смутны час — і калі польскі кароль і вялікі князь літоўскі Жыгімонт у 1609 годзе штурмам узяў Смаленск, сытуацыя рэзка зьмянілася, і Вялікае Княства Літоўскае ў першай палове XVII стагодзьдзя дасягнула апошняга ўзьлёту. Гэта быў апошні ўсплёск ягонага росквіту, росквіту матэрыяльнае культуры і дойлідзтва.

Менавіта ў гэты час праз Смаленск у Маскву пайшлі ўплывы нашага барока: гэта і беларускае кафлярства, гэта і нашыя разьбяры і г.д. Смаленск стаўся фарпостам беларусаў для завалодваньня культурнымі абшарамі Масковіі. Потым, калі ў 1654 годзе Смаленск канчаткова трапіў у склад Расейскае Імпэрыі, адбылася вельмі цікавая зьява. Да 1924 году, а яшчэ дакладней да 1941-га, Смаленшчына заставалася фактычна беларускім краем, гэта значыць большасьць народу не была асыміляваная расейскімі заваёўнікамі.

Нашая Смаленшчына зноў падняла галаву ў канцы XIX — пачатку XX стагодзьдзя. Напрыклад, калі на Ўсебеларускім Кангрэсе ў сьнежні 1917 году (80-годзьдзе якога мы нядаўна адзначалі), дэлегаты Віцебшчыны і Магілеўшчыны выступалі за аўтаномію Беларусі, дык смаленцы разам зь віленчукамі выступалі за поўную незалежнасьць. Потым Смаленск адыграў велізарную ролю праз пару год, калі ў Смаленску была абвешчаная БССР. І вось гэтыя моманты паказваюць, што пытаньне Смаленшчыны — тое самае, што і пытаньне Страсбуру, Эльзасу і Лятарынгіі, ў француска-нямецкіх дачыненьнях.

Самае цікавае, што пытаньне беларускай Смаленшчыны было цалкам сфармуляванае ў трэцім томе «Живописной России», які ў Беларусі, дарэчы, пасьпелі перавыдаць у 1993 годзе. І вось калі адкрыць гэты том на старонцы 442, дык мы ўбачым, што паводле зьвестак 1860 году, беларусаў у Смаленскай губэрні налічвалася 1.122.000, а вялікаросаў (расейцаў) — 520.000, у адсотках — 68 % і 32 %. Атрымалася так, як ні дзіўна, што Смаленская губэрня была адной з самых беларускіх. Чаму? Таму, што колькасьць гэбраяў была тут мінімальная. Мяжа аселасьці адрэзала гарадзкое гэбрайскае насельніцтва ад Смаленшчыны. І невыпадкова, што яна была такой беларуска-сьведамай. У гарадах Смаленшчыны, за выключэньнем тых, што трапілі ў склад Магілеўскае губэрні, гэбраяў было значна меньш альбо зусім не было.

Тое самае і наконт палякаў. Дарэчы, польскае асыміляцыі не існавала на Смаленшчыне пасьля 1654 году, і Каталіцызм зьнік як зьява, і Ўніяцтва прапала. Смаленшчына стала такой дзякуючы гэтым, здаецца, неспрыяльным фактарам для астатняй Беларусі. Гэта як фэномэн Беласточчыны. Праваслаўная царква не ваявала з Уніяй і Каталіцызмам, бо яны падтрымліваліся на дзяржаўным узроўні, і сяляне па-ранейшаму карысталіся беларускай мовай і дажылі да XIX стагодзьдзя без усялякіх прыкметаў асыміляцыі. (На Беласточчыне на пачатак XIX стагодзьдзя заставаліся 3 праваслаўныя парафіі. — *С.А.*)

Апошнія зьвесткі па Смаленшчыне датычаць 1924 году. Тады, падчас узбуйненьняў БССР, падкрэсьлівалася, што большасьць насельніцтва Смаленскае губэрні — гэта беларусы.

Ёсьць афіцыйныя дакумэнты. Нават на смаленскім радыё выступалі прадстаўнікі тамтэйшых губэрнскіх уладаў і пра гэта сьведчылі. Гэта — 1924 год.

С.А. — Ці бачыце Вы нейкія паралелі ў лёсе Смаленшчыны і Віленшчыны?

А.Т. — Паралелі я бачу больш ня зь Віленшчынай, а з Беласточчынай. Бо Віленшчына і Вільня — гэта ўсё ж сэрца Вялікага Княства Літоўскага, сэрца і сталіца Беларусі. Смаленск ніколі, за выключэньнем аднаго дня — 1 студзеня 1919 году — не прэтэндаваў на сталіцу Беларусі ці БССР. Ён адзін толькі дзень быў сталіцай. Але ён для нас мае такое самае значэньне, як на захадзе Горадня.

Уявіце сабе, што зараз Горадня трапіла ў склад Польшчы. Мы б панесьлі такія самыя страты, і культурныя і этнічныя. Гэта горад, які я параўноўваю ня зь Вільняй, а з Горадняй. А потым, калі Смаленск трапіў у склад Расеі, ягоную функцыю выконваў Мсьціслаў. Але ён ня мог усё ж параўнацца са Смаленскам. Гэта як Слонім на Гарадзеншчыне. Пасьля Горадні ён другі горад, але першым ён ніколі быць ня можа.

С.А. — Ну а каб Смаленшчына засталася ў складзе Беларусі, якім мог бы быць лёс Беларусі і які быў бы лёс і сёньняшняе аблічча Смаленшчыны?

А.Т. — Па-першае, большая частка Смаленшчыны магла трапіць у склад Беларусі ў 30-х гадох, да гэтага ішло. Нават былі надрукаваныя ў «Зьвязьдзе» карты БССР, дзе некалькі паветаў Смаленшчыны павінны былі з дня на дзень увайсьці ў склад БССР. На Смаленшчыне існавалі беларускія школы, і пытаньне ўзьяднаньня заходняй часткі Смаленшчыны з БССР фактычна было вырашанае. Толькі рэпрэсіі 30-х гадоў спынілі гэты працэс. Таму, каб Смаленшчына тады трапіла ў склад БССР, дык сытуацыя зь беларускай мовай і культурай была б нашмат лепшая, чым цяпер. Таму што ў гэтых вёсках Смаленшчыны людзі і цяпер размаўляюць, фактычна, па-беларуску.

Далучэньне Смаленску да Беларусі дало б нам іншую мэнтальнасьць, дало б нам магчымасьць цяпер гаварыць з усходнім суседам на іншай мове — на мове роўнага з роўным. Бо аднясеньне мяжы Маскоўскае дзяржавы на 200–300 кілямэтраў на ўсход, гэта тое самае, як, напрыклад, Беласточчына ў складзе Беларусі. Знаходжаньне Смаленску ў складзе Беларусі дало б нам магчымасьць дасягнуць падчас апошняга адраджэньня значна большых вынікаў. Ня кажучы ўжо пра тое, што смаленскія землі цяпер — пустыя, незаселеныя, мы маглі б вырашыць пытаньне з чарнобыльскімі перасяленцамі. Невыпадкова чарнобыльцаў пасялілі ў Дрыбіне, гэта на самай мяжы Смаленшчыны. Можна

было б засяліць і Краснае, і Дарагабуж, і іншыя раёны, бо цяпер там жыве па 10–15 тысяч чалавек, фактычна гэта пустыя землі.

С.А. — Ну і сёньняшні дзень. Калі паглядзець назад, у мінуласьць, дык ніякі тэрмін ня ёсьць вялікім для гісторыі і няма нічога вечнага ў гісторыі. Ці назаўсёды страчаная Смаленшчына для Беларусі і, падкрэсьліваю, для беларушчыны? Я ведаю, што Вы падчас дэпутацтва мелі дачыненьне да такое інфармацыі, і мелі кантакты са смаленскаю элітай.

А.Т. — Справа ў тым, што ў 1990 годзе я ў складзе невялікай групы дэпутатаў апазыцыі Дэмклюбу, у якую апрача мяне ўваходзілі Пётра Садоўскі, Дзьмітры Булахаў і Зянон Пазьняк, ездзіў у Вярхоўны Савет РСФСР у Маскву. Па розных пытаньнях. У тым ліку сустракаліся і з прадстаўнікамі Смаленшчыны, дэпутатамі ВС РСФСР ад Смаленскае вобласьці. І там, падчас сяброўскай размовы ў гатэлі «Россия», мы некалькі гадзінаў гутарылі на тыя самыя тэмы, што і з Вамі цяпер: ці магчымае вяртаньне Смаленшчыны назад у Беларусь? У выніку, напрыклад, рэфэрэндуму. У той час быў прыняты Закон СССР «Аб рэфэрэндуме», і мы ставілі пытаньне тэарэтычна. Напрыклад, абвешчаны рэфэрэндум — дзе быць Смаленшчыне, у Беларусі, БССР тагачаснай, ці ў Расеі? Як на гэта глядзіць мясцовая эліта? Бо тыя дэпутаты і былі прадстаўнікамі мясцовае эліты — прадстаўнікі райкомаў, абкомаў Смаленскае вобласьці і г.д.

На дзіва, усе яны выказаліся «за». Яны сказалі, што каб толькі гэты рэфэрэндум адбыўся, каб нам не перашкаджалі, мы б усе перайшлі ў Беларусь. Таму што ў той час Беларусь жыла нашмат лепш, чым Смаленшчына, і яны заўсёды глядзелі на Беларусь, як, напрыклад, палякі глядзелі на Нямеччыну, ці ўсходнія немцы на заходніх. Што мяне зьдзівіла, дык гэта тое, што гэтыя людзі (а большасьць зь іх былі прыехаўшы на Смаленшчыну пасьля вайны, бо ў вайну гэты край быў цалкам зьнішчаны) былі патрыётамі Смаленшчыны па духу. Многія зь іх выпісвалі газэту «Зьвязда», адзін зь іх прачытаў нам напамяць верш Петруся Броўкі, усе яны слухалі Беларускае Радыё, нават, некаторыя «ЛіМ» чыталі… Ізноў жа кажу — гэта не інтэлігенцыя, гэта інтэлігенцыя партыйная, намэнклятурная. І яны выказалі сваё меркаваньне — каб такі рэфэрэндум адбыўся ў 1990 годзе, дык Смаленшчына безумоўна далучылася б да БССР. Але гэта ў тым выпадку, каб рэфэрэндум адбыўся.

Такія настроі тагачаснай наменклятуры гавораць аб тым, што ў XXI стагодзьдзі, калі Беларусь стане нармальнай эўрапейскай дзяржавай, а цэнтрабежныя тэндэнцыі ў Расеі перамогуць, такі рэфэрэндум мае права на існаваньне. Далучэньне гэтых земляў чыста добраахвотна, без усялякага прымусу, не выключанае. Як Вы, Сяргей, трапна адзначылі, у гісторыі не бывае вечных дзяржаўных межаў, яны ўвесь час мяняюцца ў залежнасьці ад палітычнае сытуацыі. Толькі ў гэтым, XX стагодзьдзі, адбылося восем падзелаў Беларусі, і восем разоў мяняліся нашыя дзяржаўныя межы.

Дарэчы, апошні кавалачак Смаленшчыны далучыўся да Беларусі ў 1964 годзе — гэта былі 8 вёсак калгасу «Путь Коммунизма», які ўвайшоў у склад Беларусі падчас хрушчоўскае адлігі.

***

Адным з найгалаўнейшых вынікаў нашай гутаркі я назваў бы прапанову Алега Трусава пачаць уважаць сярэднявечнае Смаленскае княства крывічоў яшчэ адной беларускай дзяржавай. Здаецца, ніхто дагэтуль ня ставіў пытаньня так: побач зь Вялікім Княствам Літоўскім да пачатку XV стагодзьдзя існавала яшчэ адна, усходнебеларуская дзяржава.

Цікава таксама, што свайго гістарычнага росквіту Смаленск дасягнуў у першай палове XVII стагодзьдзя ў складзе менавіта Вялікага Княства Літоўскага. Тады ён стаўся фарпостам беларускай культуры на ўсходзе і мостам для перадачы беларускага барока ў Маскву.

Маю ўвагу прыцягнулі таксама словы Алега Трусава пра іншую мэнтальнасьць, якую Беларусь магла б мець у выпадку наяўнасьці ў ейным складзе Смаленску. Ён таксама ўважае, што са Смаленскам мы б сёньня дасягнулі значна большых посьпехаў у справе нацыянальнага адраджэньня, у справе беларусізацыі. Хто ведае? Магчыма, што — так. Сапраўды, беларускі склад гарадзкога і местачковага насельніцтва Смаленскай губэрні, амаль поўная адсутнасьць там гэбраяў і палякаў, маглі зрабіць Смаленшчыну цэнтрам беларусізацыі 20-х гадоў, а магчыма б і не дазволілі ёй спыніцца гэтак рана…

Але, калі мы гаворым пра пажаданасьць уключэньня Смаленшчыны ў сёньняшнюю Беларусь, дык тут ёсьць аб чым падумаць. Цалкам магчыма, што сёньня зрусыфікаваная безумоўна больш чым любая зь іншых усходніх абласьцей Беларусі Смаленшчына, магла б не дазволіць Беларусі адрадзіцца. Уявім сабе, што да і без таго зрусыфікаваных Віцебшчыны і Магілеўшчыны далучыўся прамысловы Смаленск зь ягоным прывазным расейскім насельніцтвам… Гэта як Днепрапятроўск для Ўкраіны. Але мне вось нядаўна давялося прачытаць у расейскай газэце артыкул пра жыцьцё сельскай Смаленшчыны. Дык з 10 згаданых у тым артыкуле прозьвішчаў старшыняў калгасаў і сакратароў сельсаветаў, 9 былі чыста беларускія. А Алег Трусаў, увогуле, гаворыць пра наступнае стагодзьдзе, пра будучую паўнацэнную эўрапейскую Беларусь.

А з другога боку, мне часам думаецца вось што. Добра, абрасеены Смаленск. Добра, стварыў бы праблему для нас, каб мы дасталі яго зараз. Але ці не адэкватная любая ахвяра за такі абшар роднай зямлі ды з родным горадам? Напэўна, гэта як для каго. Простаму чалавеку патрэбнае спакойнае жыцьцё, проста дабрабыт. Інтэлігенту патрэбная проста родная зямля, ейнае шчасьце. Ці адэкватнаю была ахвяра летувісаў за няродную ім Вільню? 50 год савецкай няволі, расстрэлы, высылкі, калектывізацыя, і нялюбая расейская мова ў школах… 50-гадовы перапынак ў разьвіцьці…

У 30-х гадох у Заходняй Беларусі быў такі летувіскі дзяяч — Сташыс. Ён вельмі сябраваў зь беларускімі дзеячамі. Калі Сталін падараваў летувісам Вільню ў кастрычніку 1940 году, той Сташыс стаўся мэрам Вільні. Тады да яго прыйшла дэлегацыя беларусаў і папрасіла дапамагчы ў адкрыцьці беларускіх школаў у Вільні. Сташыс у вельмі рэзкай форме адмовіў, сказаўшы, што вось, маўляў, мы, летувісы, сваёй мэты дасягнулі — атрымалі Вільню, нашыя з вамі дарогі разыйшліся, і вы, беларусы, цяпер шукайце сабе рады самі… Праз 7 ме-

